№ 42 (448) 11 лістапада 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



**Яшчэ плюс тры.** «Народная воля», «Салідарнасьць» і «Згода» выключаныя з падпісных каталёгаў. Старонка 2.

**Дзень сьвятога Марціна.** 11 лістапада — вялікае сьвята беларускіх гусей. Старонка 10.

**Ня сілай, а розумам.** З гісторыі перамог малымі сіламі. Старонка 16.




## Алесь Разанаў:

# Найбольшыя нашы прэзыдэнты



— гэта тыя, якія былі калісьці: Янка Купала, Максім Багдановіч, Якуб Колас. Вось яны і ёсьць нашы найлепшыя прэзыдэнты, якія цяпер знаходзяцца ў «эміграцыі». Але яны вяртаюцца і будуць вяртацца. І калісь вернуцца назусім. А лукашэнкаўская палітыка... гэта яўнае парушэньне прынцыпаў нармальнага жыцьця.

Першае інтэрвію Алеся Разанава пасьля вяртаньня на бацькаўшчыну — старонка 12.

### «Наша Ніва» 100 гадоў з вамі

Многія чытачы скардзяцца, што стала цяжка купіць «НН» у шапіках. Рэч у тым, што дзяржаўным распаўсюдніцкім арганізацыям забаронена павялічваць колькасьць асобнікаў «НН» у продажы. Улады спрабуюць падперці кіем гару — стрымаць нацыянальнае станаўленьне Беларусі.

Што рабіць чытачам? Ласкава прасіце кіяскёрак замаўляць больш асобнікаў газэты.

А таксама — падпісвайцеся! Гэта можна зрабіць на любой пошце. Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц.

«Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень.

## Зянон Пазьняк прапануе плян

У выпадку, калі выбары будуць несвабодныя, народ на Цэнтральнай плошчы прывядзе да прысягі таго, «хто застанецца ў альтэрнатыве», мяркуе лідэр КХП–БНФ.

Лідэр Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Зянон Пазьняк выклаў свой плян дзеяньняў на выбары-2006. У вялікім артыкуле ў нью-ёрскай газэце «Беларус» «Як ставіцца да кандыдата ў прэзыдэнты ад дэмапазыцыі» ён рэагуе на выбраньне новым лідэрам апазыцыі Аляксандра Мілінкевіча і ставіць перад сваімі прыхільнікамі некалькі практычных задач.

З.Пазьняк заклікае да масавай мабілізацыі выбарцаў. «Мусіць быць масавы выхад на галасаваньне. Рэжым гэтага баіцца». На думку З.Пазьняка, толькі вулічныя акцыі могуць гарантаваць абвяшчэньне сумленных вынікаў выбараў: «Прагаласаваўшы, нельга разыходзіцца, а трэба кіравацца на Цэнтральную плошчу.

Працяг на старонцы 3.

## Арыштавана Ірына Лазоўская

Уладальніцы менскай крамы «Каміла» прад'яўлена абвінавачаньне ў махлярстве.

Ірыну затрымалі яшчэ 18 кастрычніка, і цяпер яна знаходзіцца ў сьледчым ізалятары на Валадарскага. Крымінальная справа складаецца з эканамічных эпізодаў, у якіх фігуруюць фірмы ЗША, Ірляндыі, Фінляндыі. І.Лазоўская сваёй віны яна не прызнае.

Пры канцы 1980-х Ірына Лазоўская спрычынілася да выданьня «Навінаў БНФ», была карэспандэнткай радыё «Свабода». У 1990-х пайшла ў бізнэс. Бутыкі «Каміла» і «Hugo Boss», якія часткова належалі ёй, былі аднымі з самых папулярных прыватных крамаў сталіцы. Ірына Лазоўская актыўна займалася мэцэнацтвам музыкі і дабрачыннай дзейнасьцю.

**Алег Раявец**

## Савушкін на волі, даў першае інтэрвію

Інтэрнэт-партал www.belaruspartizan.org зьмясьціў інтэрвію Сьвятланы Калінкінай зь Сяргеем Савушкіным. Ён першы з «чацьвёркі Ігнатовіча», якая была асуджаная па справе Зьмітра Завадзкага, выйшаў на волю.

Савушкіна асудзілі тры гады таму да 12 гадоў пазбаўленьня волі, але ён ужо год, як на волі. Што за цуд? Дзякуючы розным амністыям тэрмін зьменшыўся да трох гадоў і дзевяці месяцаў.

Працяг на старонцы 11.

### Гэты беларус будзе ратаваць 300 тысяч чалавек штогод

Вялікае вынаходзтва мікрабіёляга Ігара Лукашэвіча. **Старонка 11.**

## Мілінкевіч наступае Лукашэнку на пяты

Сайт «Naviny.by» правёў апытаньне «Каго б Вы назвалі сэкссымбалем беларускай палітыкі». У выніку сярод дзясятка прапанаваных кандыдатаў першае месца заняў «адзіны ў краіне палітык». Аднак Аляксандар Лукашэнка набраў толькі 18% галасоў. Зусім трохі адстаў ад яго Аляксандар Мілінкевіч, які падаецца сэксуальным 14% інтэрнаўтаў. Наступныя месцы занялі Зянон Пазьняк — 4,17%, Аляксандар Казулін — 3,19%. Аўтсайдэрамі ж выйшлі міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў і лібэрал-дэмакрат Сяргей Гайдукевіч. Гэтыя вусачы сабралі па 0,61% (за іх прагаласавалі па 5 з 816 удзельнікаў апытаньня). Трэба адзначыць, што самым папулярным адказам быў «Палітыкі мяне не ўзбуджаюць». Такі варыянт выбрала палова апытаных.

# Яшчэ плюс тры

Газэты «Народная воля», «Салідарнасць» і «Згода» ня ўключаны ў падпісны каталёг РУП «Белпошта» на першае паўгодзьдзе 2006 году. Піша **Зьміцер Дрыгайла**.

Улада робіць легальны выход апазыцыйнай прэсы немагчымым. Газэты рыхтуюцца да пераходу ў падпольле.

У аўторак 8 лістапада тры газэты атрымалі лісты, падпісаныя в.а. кіраўніка «Белпошты» Ірыны Самсонавай. А ўжо пасьля выходных, з 8 лістапада, яна не начальнік. Новай дырэктаркай РУП «Белпошта» прызначана Аляксандра Чарняк. Адказваючы на тэлефанаваньні рэдактараў незалежных газэт, яна падкрэсьлівае, што «не скасавала ніводнай дамовы». Ніхто не вінаваты.

Газэты «Народная воля», «Салідарнасць» і «Згода» з 1 студзеня ня будуць разносіць па падпісцы, яны зьнікнуць з шапікаў «Белпошты», што гандлююць ураздроб. «Белпошта» паведаміла пра спыненьне дамовы з выданьням, зыходзячы з розных прычынаў: зьмяненьне графікаў выхаду без паведамленьняў, у сувязі з малым падпісным накладам і эканамічнай немэтазгоднасьцю, у сувязі з заменай друкарні… Але відавочна, што адмова палітычная. Ад ГРУП «Белсаюздрук» на адрас «Салідарнасці» ніякіх папер пра спыненьне дамовы (пакуль?) не прыходзіла. На адрас «Згоды» — таксама (у сталіцы «Менгарсаюздрук» газэту не распаўсюджвае). З «Народнай воляй» «Белсаюздрук» разарваў адносіны ўжо з 1 кастрычніка.

Галоўны рэдактар «Салідарнасці» Аляксандар Старыкевіч сказаў «НН»: «Паведамленьне ад «Белпошты» прыйшло ўчора (8 лістапада. — **ЗД**). Я ўпэўнены, што рашэньне было прынятае не на ўзроўні «Белпошты». І ня думаю, што трэба напружана вырашаць асобнае пытаньне накшталт «Што рабіць?». Бо гэта не апошні захад уладаў па ліквідацыі незалежнай прэсы. Трэба рыхтавацца да наступу на Інтэрнэт і самвыдат (дарэчы, нядаўна ў газэты зьявіўся сайт — www.gazetaby.com). Ніякага незалежнага распаўсюду няма. Скажам, Пётар Марцаў (генэральны дырэктар прадпрыемства «Марат») можа цяпер распаўсюджваць толькі сваю газэту («БДГ». — **ЗД**), а на распаўсюд іншых ён не атрымаў ліцэнзіі. Да новага году нічога ў працы газэты й графіках яе выхаду не зьмяняецца. З 1 студзеня ўзьнікне новая сытуацыя. З заўтрашняга дня (размова адбылася 9 лістапада, у дзень здачы чарговага нумару «Салідарнасьці». — **ЗД**) пачну займацца гэтай праблемай».

Таксама ня зьменіцца графік выхаду «Народнай волі». Але што рабіць з 16 тысячамі падпісчыкаў газэты, пераважна ў правінцыі? Шэф-рэдактар газэты Сьвятлана Калінкіна паведаміла «НН»: «Застаецца толькі адно выйсьце — стварэньне ўласнай сыстэмы распаўсюду ў сталіцы й рэгіёнах, адмысловых цэнтраў».

Выдавец і галоўны рэдактар газэты «Згода» Аляксей Кароль расказаў «НН», што газэта ўжо стварыла сваю сыстэму распаўсюду праз дэмакратычных актывістаў. Ён кажа, што асноўная частка накладу ў 5 050 асобнікаў ужо цяпер распаўсюджваецца не праз дзяржаўныя манаполіі. «Перад выбарамі нас штурхаюць на паўлегальнае становішча, літаральна запіхваюць у самвыдат. Стварылі сабе міты, самі іх і баяцца», — кажа А.Кароль.

Адзіны прэтэндэнт на прэзыдэнцкую пасаду ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч у інтэрвію БелаПАН адзначыў, што фактычная забарона на распаўсюд па падпісцы — гэта прызнаньне ўладамі моцы друкаванага слова незалежных газэт. «У інфармацыйнай прасторы Беларусі амаль не засталося незалежных выданьняў. Улада ўсур'ёз баіцца выбараў і імкнецца да таго, каб людзі не прачыталі й не пачулі ніводнай альтэрнатыўнай думкі», — сказаў ён.

Існуе меркаваньне, што дэлегалізацыя прэсы спрашчае сытуацыю: апазыцыя цяпер можа цьвёрда разьлічваць толькі на баявыя лісткі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аляксандар Старыкевіч, рэдактар «Салідарнасці», гатовы працаваць да апошняга.**

**ПОШТА РЭДАКЦЫІ**

## «Можна доўга спрачацца аб гісторыі…»

Гледзячы канцэрт 7 лістапада, я падумаў: «Што б зрабіў з гэтай кампаніяй Паўка Карчагін, калі б хворы і паранены, бяз вока, проста з поля бою трапіў на гэты канцэрт АНТ...» Піша **Андрэй Павач** з Горадні.

Вось ужо каторы год 2 лістапада, на Дзяды, сотні тысяч беларусаў, замест таго каб памінаць сваіх продкаў, сядзяць на працы. Затое праз пяць дзён мы, апошнія ў Эўропе, мелі ўнікальную магчымасьць свабодна адсьвяткаваць дзень 7 лістапада, які замацаваўся ў памяці некалькіх пакаленьняў як «чырвоны дзень календара». Як тут не прыгадаць словы аднаго п'янага маладзёна ў тралейбусе: «Менавіта «Аўрора» зрабіла нас такімі, якія мы ёсьць».

**Працяг на старонцы 15.**

**Палітычная сфера. №5. Па-за межамі цэнтру**

У нумары зьмешчаны аналіз практыкі разгляду Канстытуцыйным судом актаў мясцовых органаў дзяржаўнага кіраваньня, дасьледаваньне сучанага ўнутрыарганізацыйнага разьвіцьця Партыі БНФ, нарыс пра структуру апарату кіраваньня сельскагаспадарчай галіной у Беларусі. Блёк матэрыялаў, прысьвечаных праблемам ідэнтычнасьці, уключае ў сябе тэкст пра праблемы рэлігійнай ідэнтычнасьці ў рэгіянальных дасьледаваньнях і матэрыялы пра ірляндзкую ідэнтычнасьць. Аналізуецца сацыяльна-палітычнае разьвіцьцё Берасьцейшчыны і ўдзел беларусаў у выбарах у Польшчы. Публікуецца агляд дысэртацыяў па сацыялёгіі 2004—2005 гадоў.

Сярод аўтараў нумару — Міхась Андрасюк, Натальля Васілевіч, Павал Вусаў, Андрэй Казакевіч, Мікола Кацук, Іна Кулей, Юры Чавусаў, Андрэй Ягораў. Прадстаўленыя пераклады тэкстаў Эдварда Саіда, Юджына О'Браена, Алястэра Рабагляці.




**IN MEMORIAM**

## Такога кантралёра больш ня будзе




Мноства маладых людзей у Менску — у душы заўжды студэнты, хаця хтосьці толькі зьбіраецца паступаць, а нехта даўно адвучыўся. Школьнікам, навучэнцам і студэнтам-«дзёньнікам» праезд, як вядома, за паўцаны. Работы калярытнаму менскаму кантралёру Юр'ю Тарасу, што зазвычай адсартоўваў сапраўдных ільготнікаў ад ільготнікаў «душэўных» на ўваходзе ў мэтро «Купалаўская—Кастрычніцкая», хапала. Аштрафаваў ён за дзесяць год працы тысячы й тысячы «халяўшчыкаў», непрыяцеляў нажыў армію, а ўжо што кпінаў і словаў ліхіх наслухаўся… Не было яму роўных у прафэсіі, таму й славу займеў адпаведную — мала хто зь безмашынных менчукоў «вусатага гнома» ня ведаў. Лавіў ён і мяне калісьці пару разоў, але што крыўдаваць, калі вінаваты! І вось навіна ў «Комсомольской правде» — памёр дзядзька ў 42 гады. Спаліў сэрца з гэткай сабачай доляй. Няхай зямля яму пухам. Хоць там адпачні, Тарасік.

Адразу ў публікі ідэя ўзьнікла — помнік рэвізору-герою паставіць, ужо й вядомы скульптар Уладзімер Жбанаў на грамадзкіх пачатках падпісаўся. А думаецца мне, што, калі б кожны дзяржслужбовец на сваім месцы рабіў справу гэтаксама дбайна, дык да Жбанава за 100 год запісвацца трэба было б.

А пакуль — гуляй, «зайцы»!

**Заякот**

«Побач з намі на Зямлі: жывёльны сьвет»




**Першы том беларускай вершаванкі-запамінанкі «Добрыя вершы»**

Усё найлепшае для дзяцей у вершаванай форме для завучваньня на памяць.

Цудоўны падарунак бацькам, выхавальнікам, хросьнікам і пляменьнікам.

Чытайце «Добрыя вершы» сваім дзеткам ад самае калыскі да школы!

Укладальнік Алег Мінкін

Т.: **227-19-40, 508-81-38**

**«ARCHE» з Новага году штомесяц**

У часопісе «ARCHE» вы знойдзеце аналіз палітычных і культурных тэндэнцый, агляды новых кніг, гістарычныя адкрыцьці, нонканфармісцкую літаратуру. Сярод аўтараў «ARCHE» — беларускія інтэлектуалы і знаўцы Беларусі зь іншых краінаў.

Падпісны індэкс часопісу «ARCHE» 00345.

Падпісацца можна на любой пошце. З Новага году часопіс будзе выходзіць штомесяц.

# Вялікае Княства Літоўскае Беларусь — пражэкцёрства ці візіянэрства?

Зянон Пазьняк выступіў з прапановай: афіцыйнай назвай нашай краіны павінна быць «Вялікае Княства Літоўскае Беларусь» (скарочана — «Беларусь»). Як ставіцца да прапановы Зянона Пазьняка сацыяльна актыўная частка насельніцтва — інтэлігенцыя і студэнцтва?

**Анатоль Грыцкевіч,** гісторык:
— Я стаўлюся станоўча. Беларусьсю мы сталі называцца толькі ў канцы XIX ст.: да таго Беларусьсю называліся Віцебская, Магілёўская і Смаленская губэрні, а ўсё астатняе — Літва. Нашы адраджэнцы пачатку XX ст. прынялі назву «Беларусь». А Вялікае Княства Літоўскае ж было больш беларускай дзяржавай, чым літоўскай.

**Вадзім Карцаў,** эканаміст:
— Я такога нацыянальнага натхненьня не перажываў ужо гадоў дванаццаць. Пурпурова-агнявы з залатой «Пагоняй» сьцяг Вялікага Княства накрые медным шчытом усе марныя спрэчкі гісторыкаў пра «наша» й «ня наша». Мы больш ня будзем спаборнічаць зь літоўцамі, прыпамінаць нешта палякам і паглядаць зь недаверам на ўкраінцаў. Вельмі пазытыўная ідэя.

**Уладзімер Арлоў,** пісьменьнік, гісторык:
— Каб краіна называлася «Княствам», яна павінна быць манархіяй. На сёньня я бачу адзіны шлях для рэалізацыі гэтай ідэі — правядзеньне рэфэрэндуму. І рэфэрэндум будзе адназначна выйграны (можна ўявіць сьветлыя сны прэзыдэнта Адамкуса!). Але, мабыць, гэта сфэра фантастыкі.

У далёкай пэрспэктыве я не выключаю зьмены назвы нашай краіны. І тады ёсьць імавернасьць палітычных калізій, якія ўзьніклі ў Грэцыі з Былой Югаслаўскай Рэспублікай Македоніяй. Аднак адбудзецца гэта не раней, чым кожны беларус будзе ўсьведамляць, што ў гістарычнай рэтраспэктыве Літва — гэта тое самае, што Беларусь. Пакуль жа наконт гэтага блытаніна існуе нават у галовах саміх гісторыкаў.

**Адам Глёбус,** літаратар, выдавец, мастак:
— Адмоўна. Я не люблю доўгіх назваў. Я не люблю, калі рэтраспэкцыяй падмяняюць пэрспэктыву. Чым прасьцейшая назва, тым яна лепшая. Тым больш што ў сьвеце ўжо ведаюць «Беларусь». Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі й Паўночнай Ірляндыі ўсе называюць Ангельшчынай, Злучаныя Штаты Амэрыкі — проста Амэрыкай. Абрэвіятуры самі па сабе нечытэльныя. Дый хопіць з нас таго, што ў нас была «БССР».

**Алег Стаўпінскі,** настаўнік гісторыі:
— Ёсьць такія краіны: Усходняя Рэспубліка Ўругвай, Баліварыянская Рэспубліка Вэнэсуэла, Мэксыканскія Злучаныя Штаты. Але для ўсяго сьвету — і ў палітыцы, і на спартовай арэне — ёсьць выключна Уругвай, Вэнэсуэла і Мэксыка. Так што ВКЛ Беларусь можа чакаць той жа лёс — Беларусь.

**Алесь Анціпенка,** філёзаф, літаратар:
— Нечаканая прапанова. Ня думаю, што гэта істотна зьменіць уяўленьні людзей, якія ўжо ведаюць нашу краіну. Але найперш трэба навучыць нашых перакладчыкаў правільна пісаць назву нашай краіны на замежных мовах. Памылак вельмі шмат. Па-ангельску пішуць «Byelarus» і нават «White Russia», прыметнік «Belarussian». Можа, якраз прыстаўка «ВКЛ» дапаможа нарэшце запомніць правільнае напісаньне нашай краіны.

**Сяргей Панькоўскі,** кіраўнік інтэрнэт-праекту «Наша думка» :
— На сёньня важней стварыць умовы для ўліку меркаваньняў усіх людзей, у тым ліку і сп.Пазьняка. Важна каб было *што* называць, а ўжо потым падбіраць імёны. Але перш чым даваць такія гучныя імёны, трэба стварыць сытуацыю, калі мы зможам самі пра сябе заяўляць, калі мы зможам прэтэндаваць на іх.

**Максім Ротвель,** студэнт БДУ: Каб дыскрэдытаваць ідэю, яе трэба давесьці да абсурду. Так і з ідэяю спадчыны ВКЛ.

**Ірына, студэнтка:** Ідэя не падаецца рэалістычнаю. Пазьняк працуе на будучыню, далёкую будучыню. Праз 100 гадоў усе ягоныя ідэі будуць узьнятыя.

**Алесь з Горадні, студэнт:** Пазьняк у чарговы раз даказаў, што ён таленавіты палітык і піяршчык.

**Сяргей Дубавец,** публіцыст, першы рэдактар аднойленай «НН»:
— Ня маю да гэтай ідэі акрэсьленага стаўленьня.

**Пётра Рудкоўскі ОП,** філёзаф:
— Па-першае, усталяваньне такой назвы азначала б кананізацыю пэўнае ідэалёгіі, а менавіта правакансэрватыўнай ідэалёгіі, галоўным выказьнікам якой зьяўляецца КХП-БНФ. Паўстала б новая вэрсія «палітычнага аднабожжа».

Па-другое, такая назва хавае ў сабе амбівалентную сэмантыку. «Беларусь» у гэтым выпадку прымае на сябе ўсе рысы міталягізаванага ВКЛ, г.зн. Беларусь — гэта культурна-палітычны гігант, амаль імпэрыя. А гігантаманія (асабістая ці калектыўная) ніколі яшчэ да дабра не даводзіла.

Па-трэцяе, усталяваньне гэтае назвы (а гэта для мяне раўназначна ўсталяваньню новай афіцыйнай стронг-ідэалёгіі) можа мець нэгатыўныя вынікі для *навуковай* гістарыяграфіі, паліталёгіі і наагул якой-кольвек свабоднай грамадзка-палітычнае думкі. Ну бо ці адважыцца хто-кольвечы выступіць з тэзай, што канцылярская мова ВКЛ не была… беларускай?

Цалкам магчыма, што працы гісторыкаў ВКЛ Хрыстыяна Станга ці Зігмаса Зінкявічуса будуць занесены ў «сьпіс шкодных кніжак», якія можна будзе чытаць, але зь якімі нельга будзе згаджацца. Думаю, ёсьць рэальная небясьпека, што паўстане новае мноства табу, якія будуць блякаваць *крытычную* рэфлексію над гісторыяй і актуаліямі Беларусі.

«Вялікае Княства Літоўскае Беларусь» — гэта не нэўтральная назва. Яна ня можа выконваць аб’яднальнае функцыі, а наадварот — падзеліць і без таго падзеленае грамадзтва Беларусі.

**Апытваў Аркадзь Шанскі**

# Зянон Пазьняк прапануе плян

Працяг са старонкі 1.

Хай кожны возьме з сабой нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. Лёзунг — «Адыдзі!».

З.Пазьняк лічыць, што «масай людзей не павінна кіраваць публіка з дэмапазыцыі. Яны ўсё праваляць і сапсуюць. Успомніце Шарэцкага. Гэта адна кампанія».

На галоўнае пытаньне «За каго?» З.Пазьняк адказвае прагматычна: «Канкрэтны адказ будзе тады, калі будзем ведаць рэальных зарэгістраваных кандыдатаў, а ня вынікі спэктакляў па маскоўскім сцэнары». Такім чынам, ён дапускае магчымасьць свайго няўдзелу ў выбарах.

На думку лідэра КХП-БНФ, рэальнай альтэрнатывай Лукашэнку можа стаць толькі беларускамоўны патрыёт Беларусі, здольны гарантаваць дэмакратыю ў краіне. «Істотна, каб сярод кандыдатаў быў спаборнік, здольны праводзіць беларускую палітыку ў інтарэсах нацыі і дзяржавы», — кажа З.Пазьняк. Што калі такога не пусьцяць да выбараў?

Тады, піша З.Пазьняк, «народ на плошчы (а гэта мусіць быць ня менш за сто тысяч, як па законе) павінен прывесьці да прысягі на вернасьць нацыі і Беларусі таго, хто застанецца ў альтэрнатыве (акрамя падстаўных гайдукевічаў, вядома)».

У часе выбарчай кампаніі, на думку З.Пазьняка, павінен быць створаны грамадзкі Канстытуцыйны камітэт, які будзе кантраляваць прэзыдэнта, прывядзенага народам да прысягі.

У сваім артыкуле З.Пазьняк жорстка крытыкуе А.Казуліна і В.Фралова за іхні палітычны апартунізм і прарасейскую рыторыку. З.Пазьняк крытыкуе і «дэмсілы». Лідэр КХП-БНФ бярэ гэтае словазлучэньне ў двукосьсі, пастаянна дадаючы «так званыя». «Іхняя дзейнасьць, паняцьці і ідэі, якія яны выказваюць, не прыводзяць да стварэньня і захаваньня нацыянальнай дзяржавы (а адпаведна — і дэмакратыі, бо дэмакратыя не існуе па-за дзяржавай і нацыяй)». Дэмсілам — і А.Мілінкевічу ў прыватнасьці — З.Пазьняк закідае кантакты з Масквой.

«Ёсьць эфэктыўны спосаб, як пазьбегнуць фальсыфікацыяў і вывесьці са строю фальсыфікацыйную машыну, — запэўнівае З.Пазьняк. — Народ (калі захоча) можа забясьпечыць сабе кантроль над галасаваньнем». Як гэта зрабіць, ён абяцае напісаць пазьней.

**Мікола Бугай**

## Беларускі назіральнік дэпартаваны з Казахстану

Актывісту БНФ Уладзімеру Лабковічу анулявалі правы знаходжаньня на тэрыторыі Казахстану, дзе ён знаходзіўся як міжнародны назіральнік за прэзыдэнцкімі выбарамі.

У.Лабковіч два тыдні назіраў за кампаніяй у Вусьць-Каменагорску. У.Лабковіч кажа, што тыдзень за ім езьдзіла «наружка» спэцслужбаў. З калегам-назіральнікам з Кыргыстану ён сустрэўся з прадстаўнічкай адной НДА. Пасьля сустрэчы Лабковіча «ўзялі», калі выходзіў з таксоўкі, калегу з Кыргыстану — у інтэрнэт-кавярні. Па пяцігадзінным допыце ў УУС яму загадалі цягам 24 гадзінаў пакінуць краіну, у справы якой ён «груба ўмяшаўся».

**ЗД**

## СЬЦІСЛА

### Мітынгі ў Баку

У нядзелю і мітынгу апазыцыі ў цэнтры сталіцы Азэрбайджану, узялі ўдзел 30 тыс. чалавек. Удзельнікі акцыі прыйшлі з аранжавымі сьцяжкамі, у многіх у вопратцы пераважае аранжавы колер — гальштукі, шалікі. Мітынгоўцы патрабавалі адмены вынікаў парлямэнцкіх выбараў, даводзячы пра сотні фальсыфікацый. На выбарах у парлямэнт, што прайшлі 6 лістапада, перамагла кіроўная партыя, а дэмакратычная кааліцыя правяла толькі лічаных чалавек у мэджліс. Апазыцыя лічыць вынікі сфальшаванымі.

### Севярынец на адпачынку

Палітвязьня Паўла Севярынца на тры дні адпусьцілі з «хіміі» ў адпачынак. Заканадаўства прапісвае, што, калі асуджаны ня меў спагнаньняў, яму належыць водпуск. Павал бавіць час у бацькоў у Віцебску.

### Зьдзяруць за кожны градус

З 1 лістапада сярэднямесячная сума плацяжоў за аднапакаёвую кватэру агульнай плошчай 31 м². пры двух жыхарах вылічаная ў памеры 67 397 рублёў, паведаміў журналістам у сераду намесьнік міністра жыльлёва-камунальнай гаспадаркі краіны Сяргей Сушко. Сума плацяжоў за двухпакаёвую кватэру плошчай 48 м². пры трох жыхарах складае 101 095 рублёў, за трохпакаёвую агульнай плошчай 69 м². пры чатырох жыхарах — 140 758 рублёў. С.Сушко паведаміў таксама, што стандарт ацяпленьня кватэры ўстаноўлены пастановай Савета міністраў на ўзроўні 18 градусаў. Калі будзе больш цёпла — розьніца будзе ўключацца ў разьліковыя квітанцыі.

**АР, ЗД**

### Дзень салідарнасьці

16 лістапада, у сераду, адбудзецца другая акцыя з нагоды Дня беларускай салідарнасьці. Першая прайшла 16 кастрычніка. Арганізатары прапануюць у гэты дзень а 20-й гадзіне патушыць на 15 хвілін сьвятло ў сваіх кватэрах і офісах, запаліўшы на вокнах сьвечкі.

## 11 лістапада

**ў Польшчы нацыянальнае сьвята — Дзень Незалежнасьці.** У 1918 г. у гэты дзень Юзэф Пілсудзкі пераняў у Варшаве ваенную і цывільную ўладу. Праз два гады, у 1920-м, ён выратаваў Польшчу ад бальшавіцкага нашэсьця. Як Пілсудзкі сумеў перамагчы малымі сіламі? Пра гэта — гістарычныя старонкі сёньняшняга нумару «НН».

# 35 мільёнаў за радыёжарт

11 лістапада, у судзе Першамайскага раёну Менску пачнецца разгляд беспрэцэдэнтнай для Беларусі справы. Два слухачы FM-станцыі «Альфа-радыё» падалі ў суд на радыёстанцыю і яе праграмнага дырэктара.

Праграмны дырэктар «Альфа-радыё» Зьміцер Шунін вядзе таксама забаўляльную праграму «Кукурузьнік-шоў», збудаваную на розыгрышах. У суд зьвярнуліся героі аднаго з розыгрышаў.

Упершыню ён прагучаў на «Альфе» два гады таму. Тады Шунін патэлефанаваў у этэры аднаму са слухачоў, прадставіўся начальнікам аддзелу па барацьбе з арганізаванай прастытуцыяй і сказаў, што сябар гэтага слухача затрыманы ў публічным доме «Сельскі працаўнік» — маўляў, пад заклад 700 тыс руб. ён просіцца дадому. Спачатку слухач павёўся, але калі зразумеў, што яго разыгралі, толькі пасьмяяўся і сказаў: «Пяць балаў!» Запіс розыгрышу, як аднаго з самых удалых, «Альфа» паўтарыла сёлета — пры канцы верасьня.

Памер маральнай шкоды, што спрычыніў розыгрыш Шуніна, ацанілі ў 35 млн рублёў. Радыёвядучы ў размове з карэспандэнтам «НН» толькі зьдзіўляецца: «Як я магу з кагосьці-небудзь зьдзекавацца? Мы, наадварот, праграмай намагаемся пацешыць слухачоў». Шунін сьцьвярджае, што перад тым, як разыграць гэтага чалавека, ён цікавіўся ў ягоных знаёмых пра наяўнасьць у таго пачуцьця гумару.

Пасьля гэтага Шуніна і выклікалі ў суд. «Сюжэт застаўся ў базе, і мы яго паставілі ў наш «The Best». Лёгіка наша была такая: калі ўдзельнік розыгрышу даў яму станоўчую ацэнку і слухачы прызналі яго за ўдалы, дык чаму б не паўтарыць?»

Тацяна Падаляк, выкладчыца курсу «Прафэсійная этыка журналіста» ў БДУ і журналістка газэты «Звязда», трымаецца іншага меркаваньня: «Гэта відавочнае парушэньне прафэсійнай этыкі. Няўжо нехта хацеў бы апынуцца на месцы гэтых людзей? Галоўны прынцып этыкі журналіста — не нашкодзь!» Спн.Падаляк некалькі разоў чула падобныя праграмы. «У іх часам парушаецца ня толькі журналісцкая, але й агульначалавечая этыка!» — кажа яна. Дадатковай прыкрасьцю яна лічыць тое, што радыёвядучы пасьмяяўся з гэтых слухачоў другі раз: «Праз два гады той слухач сапраўды можа абурыцца, бо яго маглі напаткаць розныя зьмены ў жыцьці». Тым ня менш Т.Падаляк ня супраць існаваньня падобных праграм, але сюжэты, на яе думку, мусяць давацца толькі са згоды тых, каго разыгралі.

На ідэю «розных зьменаў у жыцьці» таксама зьвярнуў увагу ў інтэрвію радыё «Свабода» намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец, падкрэсьліўшы неадпаведна высокі памер кампэнсацыі, якую патрабуе пазоўнік: «Гэта не пазоў аб абароне гонару і годнасьці. Найчасьцей гэта літаральны спосаб зарабіць нейкія грошы. Шкада, што нашыя судовыя інстанцыі ніяк не адрэагавалі на тыя памеры штрафу, якія ніякім чынам не суадносяцца, напрыклад, з тымі выплатамі, якія спаганяюцца нават пры сьмерці чалавека ці пры сур'ёзных траўмах».

Экс-удзельнік каманды КВК БДУ Андрэй Дзяркоў кажа, што пакуль беларускія слухачы не падрыхтаваныя да падобных розыгрышаў: «У ЗША такія праграмы маюць даўнюю гісторыю, у нас яны зьявіліся нядаўна і зусім раптоўна». Сам бы Дзяркоў не наважыўся такім чынам разыграць незнаёмага чалавека: «Немагчыма ўявіць, што ў яго за душой, таму рызыкоўна жартаваць на прыватныя тэмы».

Радыё-дыджэй Адам Старповіч сьцьвярджае, што да «справы Шуніна» мае дачыненьне толькі пытаньне вастрыні пачуцьця гумару. Зь ім пагаджаецца і сам Шунін: «Не зразумець, што гэта быў розыгрыш, немагчыма: увесь тэкст прасякнуты ironіяй, а калі праслухаць аўдыёзапіс, усе пытаньні наагул адпадаюць».


«БЕЛГАЗЕТА»
**Зьміцер Шунін, праграмны дырэктар «Альфа-радыё».**

«Альфа-радыё» віны не прызнае. Прэс-служба радыё зрабіла заяву, дзе гаворыцца, што раней была вядома толькі расейская і замежная практыка, калі на папулярныя праграмы падавалі ў суд у надзеі атрымаць пэўную грашовую суму. З.Шунін на перадсудовых слуханьнях прапаноўваў ахвярам розыгрышу кампэнсацыю ў памеры 500 тыс. руб., але тыя не пагадзіліся. Незалежна ад рашэньня суду, радыёвядучы мае намер працягваць весьці «Кукурузьнік-шоў», каб «прыносіць людзям задавальненьне».

**Сяргей Будкін**

**Аўдыёзапіс** розыгрышу можна праслухаць тут: http://radio.tut.by/mp3/logger.mp3.

# Амбасадар з дыплёмам МГІМО падаў у адстаўку

Пасол Польшчы ў Беларусі **Тадэвуш Паўляк (на фота)** падаў заяву пра адстаўку. Гэта рэдкі выпадак у дыпляматычнай практыцы. Адстаўку пасла камэнтуюць **Ігар Лялькоў** і **Марак Буцько**.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ігар Лялькоў,** старшыня міжнароднай камісіі Партыі БНФ:

**— Як Вы можаце ацаніць працу сп.Паўляка як пасла?**

— Тадэвуш Паўляк — прадстаўнік старой дыпляматычнай школы, які пачаў кар'еру яшчэ за часамі ПНР. Таму яго працу ў Беларусі я разглядаю як ганаровую й перадпэнсійную.

**— Чаму Т.Паўляк падаў у адстаўку адразу пасьля таго, як вярнуўся ў Беларусь?**

— Паўляк заўсёды быў прыхільнікам левых. А калі на выбарах перамаглі правыя, Паўляк зразумеў, што яго ўсё роўна хутка адклічуць. Так што прычыны зьвязаны з фармаваньнем новага правага ўраду, таму ён зугляў на апярэджаньне.

**— Перамога правых і стала каталізатарам адстаўкі?**

— Таксама каталізатарам быў артыкул у газэце «Жэчпасполіта» пра напружаныя стасункі й супрацьстаяньне сп.Паўляка зь іншымі прадстаўнікамі беларускаў амбасады, у тым ліку Андрэем Чухрытам, які, дарэчы, у маладосьці ўдзельнічаў у беларускім руху на Беласточчыне.

**— Ці магчыма, што амбасадарам ці часовым павераным стане нехта з тых дыпляматаў, што цяпер працуюць у Беларусі?**

— Думаю, гэта будзе новы чалавек. І, хутчэй, тэхнічная асоба, што зьвязана з прэзыдэнцкімі выбарамі, якія хутка пройдуць у нашай краіне. Польскі бок не захоча ісьці на канфлікт.

**Марак Буцько,** да лета 2005 году — дарадца амбасады Польшчы ў Беларусі, цяпер — галоўны спэцыяліст Варшаўскай мэрыі:

**— Якая Ваша рэакцыя на адстаўку спадара Паўляка?**

— Самая пазытыўная. Не наліваецца маладое віно ў старыя мяхі. Калі Польшча думае пра зьмену сваёй палітыкі ў Беларусі, бо старая пацярпела фіяска, дык гэтым мае займацца новы чалавек. Той факт, што ён падаў у адстаўку, ня значыць, што ён адразу выедзе зь Беларусі, ён можа застацца яшчэ некалькі месяцаў. І гэта ня надта добра, бо пераход да палітыкі крытычнага дыялёгу вымагае дакладнай канцэпцыі й сталай узаемасувязі паміж амбасадай і МЗС Польшчы. Я моцна сумняваюся, што сп.Паўляк будзе здольны наладзіць гэтую ўзаемасувязь. Да таго ж існуе праблема консулаў у Горадні й Берасьці. Гэта чыноўнікі старой фармацыі, і яны таксама мусяць быць замененыя.

**— Згодна з нашымі зьвесткамі, у амбасадзе існаваў асабісты канфлікт паміж Вамі й сп.Паўляком?**

— Не, але існаваў паміж ім і ўсімі астатнімі супрацоўнікамі амбасады. Паўляк — тыповы работнік старой сыстэмы (яго дыпляматычны стаж — 43 гады) з «дыплёмам» расейскага МГІМО, дзе навучаўся. У іншых супрацоўнікаў амбасады іншыя погляды на супрацоўніцтва дзьвюх краін. Па-другое, сп.Паўляк дазваляў сабе публічнае шальмаваньне супрацоўнікаў амбасады, што ў выніку вылілася на старонкі польскіх газэт. Будучы адкліканым у Варшаву, Паўляк разумеў, што адзіны для яго шанец вярнуцца — за ўрадам Марка Бэлькі. Яму гэта ўдалося, але ўсё ж праз некаторы час ён сам падаў у адстаўку. Хіба ён хацеў, каб усё выглядала менавіта так. Спадзяюся, што новы амбасадар будзе чалавекам новай генэрацыі, які зробіць як мага больш для наладжваньня сяброўскіх узаемаадносінаў між дзьвюма нашымі краінамі.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Апошняе эўрапейскае папярэджаньне

Эўразьвяз гатовы ўвесьці санкцыі супраць Беларусі, уключна з замарожваньнем банкаўскіх рахункаў беларускіх чыноўнікаў, у тым выпадку, калі ў краіне будуць парушацца нормы дэмакратыі і правоў чалавека. Пра гэта заявіла ў Маскве эўракамісар па замежных сувязях і палітыцы суседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр. Аднак Эўразьвяз ізноў разьлічвае на дапамогу Расеі ў дыялёгу з афіцыйным Менскам. Таму ў рэальнасьці зьменаў эўрапейскай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі ня будзе. Апошняе эўрапейскае папярэджаньне — зусім не апошняе кітайскае папярэджаньне.

**Алег Раявец**

# Марына Багдановіч ведае лепш за АБСЭ

Актывістка АГП Марына Багдановіч заявіла, што парлямэнцкія выбары ў Азэрбайджане прайшлі спакойна і без парушэньняў. Яе словы цытуе Міжнароднае маніторынгавае бюро: «Былі сытуацыі, калі заходзілі па двое ў кабінку, былі сытуацыі, калі няправільна выдаваўся бюлетэнь, але казаць, што выбары нелегітымныя, няма ніякіх падстаў», — кажа М.Багдановіч і дадае: «Усе місіі пацьвердзілі, што перамогу ў сумленнай барацьбе атрымала кіроўная партыя Азэрбайджану». Між тым у панядзелак АБСЭ заявіла, што выбары ў Азэрбайджане не былі дэмакратычныя, а ў аўторак парушэньні на выбарах у Азэрбайджане асудзіў Эўразьвяз.

М.Багдановіч уваходзіць у групу назіральнікаў СНД CIS-EMO, якая ў свой час прызнала свабоднымі і выбары ва Ўзбэкістане, і другі тур галасаваньня ва Ўкраіне, пасьля якога фальшаваньні на карысьць Януковіча выклікалі народнае паўстаньне. Акрамя сяброўства ў АГП, яна пэўны час была блізкая да генэрала В.Фралова, а на Кангрэсе дэмакратычных сілаў выступала разам з Ю.Варонежцавым за стварэньне Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы.

**Мікола Бугай**

# Памаранчавыя Леніны



У Бабруйску 7 лістапада зранку нехта размаляваў усе гарадзкія помнікі Леніну ў парамаранчавы колер. Таму супрацоўнікам ЖКГ хуценька прыйшлося замываць галоўнага «апостала» на цэнтральнай плошчы, бо на 10 гадзін быў прызначаны мітынг. Няглядзячы на тое, што па горадзе ўзмацнілі патрулі міліцыянтаў сабакамі, Леніны адзін за адным перафарбоўваліся на ўскраінах. Нікога не затрымалі.

**Данута Чыгір, Бабруйск**

# Чатыры тыдні галадоўкі

Таксісты сыгналяць, праяжджаючы каля глухога белага муру гарадзенскай турмы, — такім чынам яны падтрымліваюць свайго калегу Мікалая Аўтуховіча, які чатыры тыдні галадае на нарах СІЗА. Піша **Ірына Чарняўка** з Горадні.



14 кастрычніка на ваўкавыскага прадпрымальніка, уладальніка найбуйнейшага ў рэгіёне прыватнага прадпрыемства ў сфэры таксі і грузаперавозак завялі крымінальную справу па ўхіленьні ад выплаты падаткаў. У той самы дзень М.Аўтуховіч быў арыштаваны і за кратамі абвясьціў галадоўку пратэсту.

На мінулым тыдні суд адмовіўся замяніць меру стрыманьня на падпіску аб нявыезьдзе. Хоць, паводле адвакатаў, стан здароўя прадпрымальніка вельмі цяжкі. Ягоная адвакатка Надзея Станкевіч кажа, што за тры з паловай тыдні адміністрацыя СІЗА ня выказала ніякай цікавасьці да пратэсту вязьня — Аўтуховіча ніводнага разу не наведалі лекары.

Ужо два гады прадпрымальнік спрабуе адбіцца ад прэтэнзій Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) на суму ў мільён даляраў. За гэты час было шмат сытуацый, калі іншы б ужо перастаў змагацца, згарнуў бізнэс, зьехаў за мяжу. Аўтуховіч пайшоў па ўсіх інстанцыях, трымаў галадоўкі, пісаў звароты і адкрытыя лісты да прэзыдэнта.

Пунктам, у якім разыходзяцца прадпрымальнік і падаткавікі, зьяўляецца трактоўка сумнавядомага прэзыдэнцкага дэкрэту №4, якім колькасьць работнікаў у прыватных прадпрымальнікаў была абмежаваная да 3 чалавек. У траўні 2003 г., калі дэкрэт пачаў дзейнічаць, Мікалай Аўтуховіч звольніў з працы каля 60 чалавек, кіроўцаў, дыспэтчараў таксі — і ўладкаваў іх на фірму «Ніка-Транс», уладальніцай якой зьяўляецца ягоная жонка. А пасьля заключыў зь фірмай аўтсортынгавую дамову — за пэўную плату фірма прапаноўвала прадпрымальніку працу ўжо сваіх кіроўцаў. Такія дамовы шырока выкарыстоўваюцца ў сьвеце і нават у Беларусі, асабліва ў розьнічным гандлі: калі ўладальнік гандлёвай кропкі мае праблему з прадаўцамі, ён можа такім чынам «узяць напракат» прадаўца, напрыклад, з суседняй крамы.

Міністэрства палічыла, што М.Аўтуховіч і фірма «Ніка-Транс» прыдумалі схему ўхіленьня ад падаткаў, і налічылі санкцый на суму больш як 700 млн рублёў. За два гады суды станавіліся то на бок прадпрымальніка, то на бок МПЗ — аж пакуль урэшце за месяц да арышту М.Аўтуховіча Вышэйшы гаспадарчы суд не прыняў рашэньне аб адмене ўсіх санкцый і пераглядзе справы.

Адначасова ўпраўленьне дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў (УДФР) па тых самых абставінах распачала крымінальную справу ў дачыненьні да фірмы «Ніка-Транс» — тут ужо фігуравала сума ў 1,3 мільёна рублёў. Падазронымі праходзілі жонка Аўтуховіча і дырэктар фірмы Юры Лявонаў.

У дзень арышту 14 кастрычніка Мікалай Аўтуховіч разам з Ю.Лявонавым прыехаў ва УДФР азнаёміцца з вынікамі эканамічнай экспэртызы па крымінальнай справе. Яго не выклікалі, ён прыехаў, хутчэй, «за кампанію».

Экспэртыза аказалася на карысьць фірмы і прадпрымальніка. Самі спэцыялісты МПЗ засьведчылі сьледзтву, што схема, па якой «Ніка-Транс» супрацоўнічала з Аўтуховічам, законная. Сьледчы Аліхвер абвясьціў, што зь «Ніка-Транс» здымаюцца ўсе прэтэнзіі — і праз хвіліну завёў справу супраць Мікалая Аўтуховіча.

Сам арышт і тое, як правялі яго сьледчыя УДФР, адвакат Надзея Станкевіч называе «бязьмежжам». Каля 15-й гадзіны Аўтуховічу абвяшчаюць пра завядзеньне справы. Праз 20 хвілін прадпрымальніку даюць падпісаць пастанову аб прыцягненьні яго да адказнасьці ў якасьці падазраванага. Аўтуховіч патрабуе адваката. Праз гадзіну сьледчы праводзіць зь ім першы допыт як з падазраваным. Паводле слоў Н.Станкевіч, сьледчы сам быў непадрыхтаваны да допыту: ён задаў толькі два нязначныя пытаньні. У 18.25 Аўтуховічу даюць падпісаць пастанову аб прыцягненьні яго да адказнасьці ў якасьці абвінавачванага. Яго зноў хочуць дапытаць, але ён ужо адмаўляецца даваць паказаньні. Каля 18.45 сьледчы дае яму падпісаную пракурорам пастанову аб арышце. Калі нават ня ўлічваць, што 14 кастрычніка — гэта пятніца, скарочаны дзень, дык усё роўна выходзіць, што пракурор вывучаў справу і даваў санкцыю на арышт ужо ў непрацоўны час. Падобнае, падкрэсьлівае Станкевіч, бывае толькі ў выключных выпадках.

Сьледчыя не цікавяцца Аўтуховічам. Толькі адзін раз, 19 кастрычніка, сьледчы УДФР Аліхвер прыйшоў у СІЗА, каб дапытаць прадпрымальніка. Але стан здароўя Аўтуховіча ўжо тады, праз пяць дзён пасля арышту, быў цяжкі, і сьледчы напісаў у пратаколе: «Правесьці допыт немагчыма».

На думку Надзеі Станкевіч гэта дадатковы доказ таго, што адзінай мэтай завядзеньня крымінальнай справы было жаданьне менавіта «закрыць» яго, ізаляваць.

## Эўра спалохаўшыся

Нацбанк раіць захоўваць грошы ў беларускіх рублях.



У Эўропе нарастаюць палітычныя рызыкі. Беспарадкі ў Францыі прынялі сур'ёзны абарот. Яны сталі найбольш працяглымі з часоў студэнцкага паўстаньня 1968 г. Для фінансавага рынку Эўразьвязу й для пазыцый эўра гэтыя падзеі зьявіліся ці не фатальнымі. Курс даляра ў дачыненьні да эўра падрос так, як ня рос апошнія два гады.

На гэтым фоне расьце попыт на амэрыканскія активы. Працэнтныя стаўкі Фэдэральнай рэзэрвовай сыстэмы ЗША на амэрыканскія каштоўныя паперы вышэйшыя за эўрапейскія ўдвая. Натуральна, яны больш даходныя. Эўрапейскі Цэнтрабанк гэтага дазволіць сабе ня можа ўжо даўно, бо трэба падтрымліваць новых сяброў Эўразьвязу, якія, дарэчы, у зону эўра ўступяць у найлепшым выпадку з 2007-га. А тут яшчэ беспарадкі ў Францыі.

У нас жа эўра стаіць трывала. Прэс-сакратар Нацбанку Міхаіл Журавовіч растлумачыў гэта тым, што ў нас і ў Заходняй Эўропе розныя механізмы фармаваньня курсу. «У нас курс вызначаецца на аснове попыту й прапановы, якія штодня фармуюцца на таргах валютна-фондавай біржы. Таму ніякіх абвалаў чакаць не даводзіцца». І тым ня менш, сп.Журавовіч раіць захоўваць грошы ў той валюце, даход па якой большы і на стан якой не паўплываюць макраэканамічныя й палітычныя падзеі, — у беларускіх рублях. Калі, канечне, тыя даходы ў вас ёсьць.

**ЗД**

# Тры, чатыры, а лепш... пяць зорачак

У хуткім часе гатэль «Сьвіслач» стане «Менск-прынцэс-гатэлем» і першай пяцізоркавай гасьцініцай у Беларусі.

Рэканструкцыя будынку, што ідзе з 2001 г., праводзіць АТ «Ірада» (турэцкі капітал) — чалец міжнароднай сеткі гатэляў з назвай «Прынцэс». У праект укладзена 20 млн даляраў. Вонкавы выгляд будынку на рагу Валадарскага і Кірава амаль не зьмяніўся, але ў рэальнасьці ён быў пабудаваны наноў — ад старой «Сьвіслачы» захаваўся толькі фасад (будынак унесены ў сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў).

На першым паверсе будуць адміністрацыйная частка, кавярня, крамы й казіно з рэстаранам. Ад другога да пятага паверху — нумары і канфэрэнц-заля. Шосты паверх (ён новы і цалкам шкляны) адведзены пад вялікі рэстаран, банкетную залю й начны клюб. Усяго ў гатэлі будзе 100 звычайных нумароў і два прэзыдэнцкія (двухпавярховыя). А ва ўнутраным дворыку — басэйн, фітнэс-заля, боўлінг, салёны прыгажосьці й саўна. Таксама ва ўнутраным дворыку пабудавана шматузроўневая аўтастаянка, машыны на якую будуць дастаўляцца на адмысловым ліфце.

Амаль год ідуць работы па аднаўленьні гатэлю «Эўропа», які таксама мае стаць пяцізоркавым. Іх мяркуюць скончыць да пачатку 2007 г. Фасад гатэлю (праект зроблены ТАА «Трайпл») будзе амаль дакладнай копіяй разбуранага. Унутры будзе 68 нумароў і ўсё, што мусіць мець пяцізоркавая гасьцініца, апроч хіба пляцоўкі для гелікоптэра.

Нагадаем, згодна з інструкцыяй Міністэрства спорту й турызму, цягам наступнага году ў Беларусі будзе праводзіцца сэртыфікацыя й клясыфікацыя гасьцініц. На сёньня ў краіне сэртыфікавана толькі 10 гатэляў (усяго ў Беларусі 283 гатэлі). Адзін зь іх чатырохзоркавы (гатэль «Менск») і дзевяць — трохзоркавыя. Цікава, што на фасадзе віцебскага гатэлю «Лучоса» вісяць чатыры зоркі, у той час як гасьцініца трохзоркавая. Дамалявалі.

**Зьміцер Дрыгайла**



## Цэны на жытло працягваюць расьці

Сёлета ў Менску будзе пабудавана 840 тыс. квадратных мэтраў жыльля. На дэклараваныя Менгарвыканкамам чатыры гады таму мільён квадратных мэтраў у год выйсьці не ўдаецца. Тым часам колькасьць ахвотнікаў толькі ўзрастае: за гэты год у Менску зьнята з чаргі пад 10 тысячаў тых, хто хоча палепшыць жыльлёвыя умовы, а стала ў чаргу 17 тысячаў. У сталіцу ўехала 15 тысячаў чалавек, і кожны зь іх мае права пастаноўкі на ўлік. Значыць, попыт паранейшаму будзе перавышаць прапанову, а цэны будуць расьці. Старшыня савету РГА «Беларуская асацыяцыя нерухомасьці» Мікола Прасталупаў прагназуе «паўзучы» рост на 1—2% у месяц. Да канца 2006 г. квадратны мэтар у сярэднім будзе каштаваць $1 200. Грошы на гэтым рынку круцяцца велічэзныя. Калі 1 м$^2$ у Менску на гэтым тыдні каштуе $1 040, то, памножыўшы на 840 тысяч, атрымаем 873 млрд 600 млн даляраў у 2005 г.

**Яўген Васілеўскі**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Лукашэнка ўсё падгроб пад сябе

Аляксандар Лукашэнка працягвае перабіраць паўнамоцтвы парлямэнту і ўраду. Указам №520 надае яму паўнамоцтвы распараджацца ў сфэры распараджэньня дзяржаўнай маёмасьцю, прыроднымі рэсурсамі, дзяржаўным бюджэтам. Прэзыдэнт будзе сам вырашаць, якім прадпрыемствам і якім індывідуальным прадпрымальнікам даць адтэрміноўку, крэдыт, выдзеліць субсыдыю ці сродкі. «А.Лукашэнка папросту нарматыўна змацаваў паўнамоцтвы, якія і так у яго былі», — камэнтуе «Белорусы и рынок». Указ набудзе моц з 14 лістапада і будзе рэалізаваны ў поўным аб'ёме з 1 чэрвеня 2006 году. Калі ў ліпені яго пераабяруць, пакарыстаецца ён указам нядоўга.

### Слабы пратэст дэпутатаў

У законапраекце па ўнясеньні зьменаў у Інвэстыцыйны кодэкс, які ўключаны ў парадак дня сэсіі палаты прадстаўнікоў, утрымліваецца пункт пра скасаваньне гарантыі нязьменнасьці заканадаўства для замежных інвэстараў цягам пяці год з моманту рэгістрацыі прадпрыемства. Камісія па жыльлёвай палітыцы адзначыла, што гэта створыць бар'еры для прыцягненьня ў краіну замежных інвэстыцый, і прыняла рашэньне рэкамэндаваць дэпутатам адхіліць законапраект.

### Стварэньне холдынгу «Белнафтахім»

Урад мае аб'яднаць усе нафтахімічныя прадпрыемствы ў адзін холдынг на базе канцэрну «Белнафтахім». Канцэрн аб'ядноўвае 40 прадпрыемстваў, на якіх працуюць 116 тыс. чалавек.

**ЗД**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 10 лістапада:**
1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 531,73 рубля
1 брытанскі фунт — 3 746,38
1 швайцарскі франк — 1641,10
1 латвійскі лат — 3 634,83
1 літоўскі літ — 733,31
1 польскі злоты — 634,57
1 расейскі рубель — 74,58
1 украінская грыўна — 427,69

**Паводле Нацбанку**

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

# Выміраньне «вымяральнікаў»



ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Калі я пабачыў тое, што ў Малым Сітне засталося ад колішняй гаспадаркі наваполацкага заводу «Вымяральнік», падалося, што гэта — руіны разбомбленага Грознага. Піша **Павал Севярынец**.

Фэрма, дзе трымалі больш за сто кароваў, цяпер стаіць з прабітым дахам, бяз шыбаў і абсталяваньня. Пра кацельню, што ацяпляла палову навакольля, нагадвае толькі высозны комін, на які мясцовыя жыхары лазяць, каб злавіць мабільную сувязь. Ад трохпавярховага інтэрнату для супрацоўнікаў гаспадаркі засталася цагляная скрыня. Усё ўсярэдзіне — ад дашчанай падлогі да дзьвярных клямак — разрабавана. Дзіцячы летнік «Зорны» на маляўнічых берагах возера Ізмок — калісьці адзін з найлепшых у Беларусі — ужо як два гады знаходзіцца ў аварыйным стане. А калі глядзіш на цэх па вырабе бэтону — перад вачыма ажывае Берасьцейская крэпасьць. Такое ўражаньне, што будынак расстрэльвалі прамой наводкай, а абаронцы паміралі, але не здаваліся... Цяпер з гэтай цэглы ў Сітне муруюць печкі.

За часамі застою наваполацкі «Вымяральнік» быў звышсакрэтным прадпрыемствам савецкай «абаронкі» й вырабляў абсталяваньне для касьмічных караблёў. Працаваць сюды бралі толькі надзейных грамадзянаў зь бездакорнай біяграфіяй. У Сітне расказваюць, як вартаўнік, якому заманулася вынесьці з заводу мэталёвы ліст на ўваход у хату, выцірыць боты (аказалася — плаціна), загрымеў у турму на тры гады.

Лясную СССР — ляснула вытворчасьць. Цяпер «Вымяральнік» робіць машынкі для закатак у слоікі. Колішняя гаспадарка ў вёсках кінута на разрабаваньне згаладаламу насельніцтву.

Выміраньне «Вымяральніка» — індыкатар камуняцкае псыхалёгіі. З аднаго боку — жахлівае марнатраўства: не сваё — не шкада. Зь іншага — прага чужое маёмасьці, імкненьне да разбурэньня і жывёльны рэфлекс — цягнуць, што кепска ляжыць, у сваю нару.

А корпус інтэрнату так просіцца стаць шматканфэсійным хрысьціянскім цэнтрам, дзе знойдзецца месца і праваслаўнаму брацтву, і каталіцкаму хосьпісу, і пратэстанцкай місіі...

А былы цэх па вытворчасьці бэтону чакае прадпрымальніка, добрага гаспадара, які забясьпечыць будаўнічымі матэрыяламі навакольле.

А кацельня так патрэбная мясцовым уладам, каб абаграваць установы, турбазы, інтэрнаты...

А летнік — беларускай турфірме...

Колькі такіх вымерлых *вымяральнікаў*, закінутых вайсковых гарадкоў, турбазаў, гаспадарак, усяе інфраструктуры разбуранай імпэрыі па ўсёй Беларусі? А колькі грошай дзяржава траціць сёньня на будаўніцтва? Колькі атрымлівае ад прыватызацыі? Колькі прадпрымальнікаў гатовыя ўжо цяпер плаціць за практычна гатовыя офіс, цэхі, склады? Колькі хрысьціянскіх цэркваў і дабрачынных арганізацыяў нудзяцца без уласнага памяшканьня? Колькі яшчэ руплівыя, ашчадныя беларусы будуць трываць гэткае марнатраўства, разбурэньне й спусташэньне?

Каб на руінах вымерлых «вымяральнікаў» паўстала Новая Беларусь — у 2006-м абавязкова трэба перамагаць!

*Малое Сітна*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Менск, 7 лістапада. Міліцыянты прымусілі маладзёнаў з расейскай лявацкай арганізацыі АКМ («Авангард чырвонай моладзі») зьняць павязкі з сымболікай арганізацыі. Прыхільнікі левых ідэяў у гэты дзень ускладалі кветкі да помніка Леніну.**

## Дзяды на Вялейшчыне

**30 кастрычніка вяляйчане ўшанавалі памяць ахвяраў палітычных рэпрэсій. У лесе ля вёскі Касута, на месцы, дзе ўлетку 1941 г. НКВД расстраляла вязьняў вялейскай турмы, трыццаць вяляйчан усклалі вянок.**

У 1990-х на гэтым месцы былі ўсталяваны два злучаныя паміж сабой крыжы — праваслаўны й каталіцкі. Сёлета яны паваліліся. Адзін з ініцыятараў мерапрыемства, Аляксей Сюдак, намагаўся ўласнымі рукамі аднавіць крыжы. З раённага бюджэту сельсавету нават выдзелілі 1,8 млн рублёў. У сельсавеце, праўда, спачатку заявілі, што грошай не атрымлівалі, але пасьля таго, як іх прыстрашылі, што распачнецца справа аб нямэтавым выкарыстаньні бюджэтных сродкаў, чыноўніцтва, паводле словаў А.Сюдака, прыслухалася да грамадзкасьці і паставіла новыя крыжы. Праўда, менш велічныя за ранейшыя…

З Касуты вялейчукі рушылі на гарадзкія могілкі, дзе ўскладзены вянок на месцы пахаваньня вязьняў турмы. Дакладна невядома, ад чыіх рук — савецкага НКВД ці нямецкага СД, што шчыравала ў Вялейцы падчас вайны, загінулі вязьні. Тут жа пад бел-чырвона-белымі сьцягамі бацюшка адслужыў імшу за забітых. На мерапрыемства завіталі і міліцыянты, якіх выклікаў вартаўнік могілак. Але ніякіх затрыманьняў не было.

Удзел ва ўшанаваньні памяці палітычных рэпрэсій брала і госьця зь Японіі. Яна піша кнігу пра Беларусь, і таму ёй было цікава апынуцца, што называецца, на другім баку барыкады.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

## СЬЦІСЛА

**Аўтуховіч працягвае галадаваць**

Ленінскі раённы суд Горадні 4 лістапада адмовіўся зьмяніць меру стрыманьня для ваўкавыскага прадпрымальніка **Мікалая Аўтуховіча**. Затрыманы працягвае галадоўку.

**Калючы дрот Леніну**

У Салігорску 7 лістапада маладыя людзі ўсклалі вянкі з калючага дроту да помніка Леніну. На адным быў надпіс «Ахвярам таталітарызму 1917—1991», на другім — «Ахвярам таталітарызму 1994—2005». Затрымалі 5 удзельнікаў акцыі. Аднаго зь іх, **Паўла Батуева**, неўзабаве выпусьцілі.

**Бел-чырвона-белы сьцяг на шляху Лукашэнкі**

7 лістапада міліцыянты паспрабавалі ўварвацца ў кватэру **Зьмітра Голубева** ў Менску: ён вывесіў ангельскі сьцяг, які міліцыянты прынялі за беларускі нацыянальны, падчас праезду Лукашэнкавага картэжу на адкрыцьцё станцыі мэтро. Зьміцер Голубеў — сын Валянціна Голубева, дэпутата Вярхоўнага савету (1990—1995).

**Каб не стварылі партыю**

3 лістапада стала вядома, што **Валер Леванеўскі** пераведзены са шпіталю ў Івацэвіцкую калёнію. Сваякі зьвязваюць гэта з тым, што ў менскі шпіталь перавялі другога палітвязьня — **Міхаіла Марыніча**.

**Тэрмін скарацілі**

Намесьніцы кіраўніка незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства» **Эніры Браніцкай**, асуджанай на 15 сутак арышту, Менскі гарадзкі суд 4 лістапада скараціў тэрмін да 10 сутак.

**Завадзкую выклікалі ў суд**

**Сьвятлану Завадзкую** выклікалі ў суд Цэнтральнага раёну Менску на 11 лістапада як заяўніцу «па скарзе аб адмове ў завядзеньні крымінальнай справы». Яна скардзілася на сьледчага, які адмовіўся пачынаць крымінальную справу па факце зьбіцьця яе амонаўцам падчас вулічнай акцыі.

**Тоўсьцік выпусьцілі**

Актывістцы незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Ірыне Тоўсьцік** 2 лістапада выдалі пашпарт з дазвольным штампам на выезд за мяжу. Раней яе пашпарт «тармазнулі» супрацоўнікі КДБ.

**Сасім шукае праўды**

«Зубровец» **Мікіта Сасім** 2 лістапада атрымаў адказ з суду Маскоўскага раёну на скаргу на дзеяньні міліцыі 16 верасьня: калі ён трапіў у больніцу з страсеньнем мозгу. Суд адмовіўся прымаць заяву да разгляду, бо ня быў выкананы парадак дасудовай вытворчасьці, хаця насамрэч у такіх выпадках дапускаецца непасрэдны зварот у суд. Сасім мае падаць скаргу ў Менскі гарадзкі суд.

**Пісальніка зноў папярэдзілі**

Пракуратура Ленінскага раёну Горадні 2 лістапада афіцыйна папярэдзіла журналіста **Анджэя Пісальніка** за «абразу беларускага народу». Падставай стаў артыкул у газэце «Глос з-над Немна», якая цяпер выдаецца ў Польшчы.

**Прыгоды з «Народнай воляй»**

3 лістапада гарадзенскія міліцыянты аддалі затрыманыя 1 лістапада 3400 асобнікаў газэты **«Народная воля»**.

Распаўсюднік газэты **Павал Батуеў** 3 лістапада падаў скаргу ў менскую пракуратуру на дзеяньні міліцыі: 25 кастрычніка яго разам з **Алесем Мазанікам** затрымалі падчас распаўсюду газэты.

**Разборкі з газэтамі**

Міністэрства інфармацыі 24 кастрычніка выдала загад пра скасаваньне рэгістрацыі недзяржаўнай газэты **«Курьер из Борисова»**. Падстава — рашэньне гаспадарчага суду Менскай вобласьці ад 22 жніўня.

**Польскія справы**

**Рада Саюзу палякаў** на чале з Анжалікай Борыс 1 лістапада вымушана была сабрацца ў Беластоку, бо ў Беларусі зрабіць гэтага ня здолелі: прыехалі 18 з 35 чальцоў.

Актывістку СПБ **Анжаліку Арэхву**, якая ехала ў Беласток, 3 лістапада ня выпусьцілі ў Польшчу: на чыгуначным вакзале ў Горадні ў яе забралі пашпарт, бо памежнікі «засумняваліся» ў праўдзівасьці дазвольнага штампу.

**Мечыслава Яскевіча**, актывіста СПБ, 3 лістапада дапыталі ў якасьці сьведкі па «шчучынскай справе».

**Прафсаюзы ў Магілеве**

2 лістапада намесьнік кіраўніка па ідэалягічнай рабоце Магілёўскага аўтамабільнага заводу запатрабаваў у старшыні філіі прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці **Аляксандра Карыткіна** сьпісы сяброў базавай суполкі. Карыткін даваць сьпісы адмовіўся.

Суд Ленінскага раёну Магілёва 3 лістапада адмовіў актывісту прафсаюзу РЭП **Юрасю Дарашэнку**: ён апратэстоўваў загад адміністрацыі Магілеўскага мэталюргічнага заводу пра звальненьне з працы. Фармальна яго звольнілі за прагулы, хаця сам ён сьцьвярджае — за крытыку: у абазначаны час ён хварэў, на што мае мэдыцынскую даведку.

**Прафсаюзы высяляюць**

Філіял **Свабоднага прафсаюзу Беларускага** на ААТ «Полацак-Шкловалакно» пазбавілі памяшканьня з 1 лістапада: адміністрацыя прадпрыемства адмовілася працягваць дамову на арэнду.

**Затрымалі за «Народную волю»**

Пры раздачы газэты «Народная воля» 27 кастрычніка ў Менску былі затрыманы актывісты моладзевых суполак **В.Куўшынаў** і **А.Кіслы,** якіх зьбіраліся судзіць за «незаконную рэалізацыю газэты». 28 кастрычніка яны зьявіліся ў аддзяленьне з А.Лябедзькам, які пераканаў міліцыянтаў у абсурднасьці абвінавачаньня.

Пад Горадняй 31 кастрычніка затрымалі актывістаў АГП **Юр'я Істоміна** і **Ўладзімера Чырвоненку**, якія везьлі «Народную волю».

**Карэспандэнтцы пагражаюць**

Прэс-служба Гомельскага аблвыканкаму 28 кастрычніка адмовілася прадаставіць інфармацыю карэспандэнтцы БелаПАН **Алене Пасканнай**, заявіўшы, што яна пазбаўленая акрэдытацыі. На просьбу даць афіцыйны дакумэнт з адмовай прэс-сакратар сказаў, што на нейкія мерапрыемствы журналістку будуць пускаць, а на нейкія — не.

**АШ**

# Як за мяжою

Страўсы шалёна баяцца фотаўспышак. Затое яны стойка пераносяць холад, таму нават пры тэмпэратуры 0 градусаў гуляюць на адкрытым паветры.

Страўсы пераўзышлі мае ўяўленьні пра вялікіх птушак. Памерамі яны нагадваюць каня. Страўсінае яйка каштуе 43 тыс. рублёў, але, кажуць, ячня зь яго эквівалентная 16 ячням з курыных яек! Са шкарлупіны робяць самыя разнастайныя сувэніры, напрыклад лятарні. Самае ж дзіўнае на фэрме — гэта турысты, якія лезуць да птушак цераз агароджу, дражняць іх і выдзіраюць пёры.

Страўсіная фэрма Навасёлкі-Лучай на Пастаўшчыне — самае знакамітае месца ў Беларусі, дзе разводзяць страўсаў. Тут таксама гадуюць сьвіней і трусоў, а яшчэ вырабляюць экалягічна чысты сыр, каўбаскі, хлеб ды піва.

«Як за граніцай!» — вохкаюць турысты, уражаныя прыгажосьцю Пастаўскага ды Камайскага касьцёлаў. Ксяндзы абедзьвюх бажніц робяць усё, каб паглыбіць уражаньні. У Камайскім касьцёле ксёндз Яцак з задавальненьнем паказвае скарбы.



Касьцёл у Камаях — пэрліна беларускай архітэктуры.

Айцец Яцак марыць у наступным годзе зрабіць выстаўку, прысьвечаную паэту Казімеру Сваяку, і выдаць хоць колькі асобнікаў ягонай «Маёй ліры». Канстанцін Стаповіч (Казімер Сваяк) быў пробашчам у Камайскім касьцёле. У наступным годзе будуць 80-я ўгодкі ягонае сьмерці. Праўда, грошай на выданьне кнігі няма.



Ксёндз Яцак з задавальненьнем паказвае скарбы.

Праваслаўнай царквы ў Камаях ніколі не было, таму разам з каталіцкім крыжам на могілках ксёндз усталяваў і праваслаўны.

У Камаях будуць ствараць аграгарадок, у цэнтры вёскі актыўна добраўпарадкуецца плошча, высякаюцца дрэвы, вядзецца будаўніцтва.

У галоўнай пастаўскай знакамітасьці — палацы Антонія Тызэнгаўза — знаходзіцца цэнтральная раённая бальніца. Нядаўна была зроблена рэстаўрацыя будынку, грошы на якую выдаткавала UNESCO. Цяпер у бальніцы дзьве залі адведзены пад музэй, але абавязковай умовай яго наведаньня зьяўляецца прагляд фільму пра здаровы лад жыцьця. Аднак і тут нядаўна вызначыліся турысты — нафарбавалі вусны памадай скульптурнай дзяўчынцы, якая стаіць у двары бальніцы. Бо прыгажосьць рэжа вока — «як за граніцай».

**Вераніка Дзядок**
**фота аўтара**

Аўтар дзякуе за арганізацыю вандроўкі турыстычнай фірме «Альтус-плюс» і экскурсаводу Надзеі Цодавай.



Страўс беларускі.

## ТЭНДЭНЦЫІ

# Да непрыстойнасьці цьвярозы Магілёў



Савецкая рэчаіснасьць вярнулася ў Магілёў ва ўзмоцненым рэжыме — з пачатку гэтага месяца начныя крамы тут ня маюць права прадаваць сьпіртное. Піша Аляксей Бацюкоў.

«О, гэты самы бядотны час у жыцьці нашага народу — ад сьвітаньня да адкрыцьця першых магазынаў!» — лямантаваў у сваёй паэме пахмельны Венечка Ерафееў. Савецкая рэчаіснасьць вярнулася ў Магілёў ва ўзмоцненым рэжыме — з пачатку гэтага месяца начныя крамы тут ня маюць права прадаваць сьпіртное з 23.00 да 9.00. Нават піва. Нават у форме міласэрнасьці. Рашэньне прынятае і зацьверджанае на ўсіх узроўнях. Афіцыйнае тлумачэньне адно: ужываньне сьпіртнога ноччу — гэта простая дарога да злачынных замахаў на правапарадак.

Сытуацыя з начным гандлем у Магілёве гойдаецца як на арэлях ужо ня першы год. Спачатку, у 2003-м, проста забаранілі гандаль гарэлкай і ўсімі напоямі, мацнейшымі за дэсэртныя віны, пасьля 23.00. Начная злачыннасьць вытрымала гэты ўдар. Рэч у тым, што сьпіртным забаранілі гандляваць ня ўсюды, а толькі ў палове крамаў. Нярэдкая была сытуацыя, калі адна крама не гандлявала гарэлкай, а суседняя, цераз дарогу, гандлявала. Ясна, дзе ўтвараліся натоўпы, ясна, як забунтавалі ўладальнікі «сухіх» крамаў. Праз некалькі месяцаў, на пачатку 2004 году, забаранілі начны гандаль наагул. Пакінулі працаваць уначы толькі тры начныя крамы, прычым дзяржаўныя. Можаце сабе ўявіць зьдзіўленьне госьця гораду, які прыехаў цягніком у раёне першай гадзіны ночы і захацеў купіць пакецік кефіру. Калі ласка, казаў яму таксіст, зараз крутанёмся кіляметры на чатыры, і хвілін за сорак вы адстаіце чаргу. На працягу ўсяго году начныя крамы працавалі ў новым рэжыме. Сьпіртное прадавалі толькі ў чатырох дзяржаўных крамах у розных раёнах гораду. У астатніх можна было выклянчыць бутэлечку пад шчырае абяцаньне нікому не расказваць.

Але й пасьля гэтага начная злачыннасьць зьяўлялася ў зводках праваахоўных органаў. Затое цяпер, пасьля начнога варыянту сухога закону, Магілёў няйначайператворыцца ў самы чысты і бясьпечны горад на зямлі. І расквітнеюць таемныя «кропкі», заграбуць грашыну таксісты ды гандляры з-пад прылаўка, і пойдзе народ з вуліцы ў начны шынок, а пайшоўшы з шынка, абабраны да ніткі трайнымі цэнамі, злы і п'яны, унясе ў начное жыцьцё Магілёва сваю багатую лепту — узаемаразуменьне і ўзаемапавагу ў адносінах з грамадзтвам і ўсім сьветам.

## СЬЦІСЛА

### Моладзь БНФ — сіротам

4 лістапада прайшла дабрачынная акцыя дзеля выхаванцаў дзіцячага дому №4. Арганізатарам мерапрыемства быў сустаршыня культурніцкай суполкі «Моладзь ПБНФ» Алесь Мазанік. Арганізатары падрыхтавалі найлепшым, па выніках першай чвэрці, вучням падарункі. З найлепшымі вучнем і вучаніцай была зробленая адмысловая фатасэсія ў прыгожых месцах сталіцы. Альбомы з гэтымі картачкамі і былі ім уручаныя. Прасьпяваць для дзяцей прыйшлі Кася Камоцкая, Аляксандар Памідораў ды гурт «Палац». Дзеці з палацаўцамі нават развучылі калядную песьню. Алесь Мазанік сказаў, што акцыя не адзінкавая і будзе мець працяг.

**Сямён Печанко**

### Падарвалі люстру

Пасьля выбухаў у Віцебску праваахоўныя органы перастрахоўваюцца пры любой небясьпецы. На мінулым тыдні пільны грамадзянін заўважыў на газоне перад чыгуначным вакзалам у Воршы кардонную скрыню, абкручаную скотчам. Міліцыя хутка эвакуявала пасажыраў ды выклікала групу сапёраў зь Віцебску. Навучаны шукаць выбуховыя рэчывы сабака на скрыню не рэагаваў. Тым ня менш, кіраўніцтва апэрацыі па абясшкоджваньні невядомага прадмета вырашыла яго ўзарваць. Як высьветлілася, у скрыні была звычайная люстра. Гаспадар яе так і не знайшоўся. У гэтай сытуацыі ўсе адпаведныя службы працавалі зладжана, таму апэрацыю палічылі за вучэбную.

### 20 тонаў брыдоты

Яшчэ ў красавіку адміністрацыя РУП «Лёс» (Барань) загадала выліць 20 тон адходаў хіміка-гальванічнай вытворчасьці ў прапарачную камэру, што знаходзіцца за сто мэтраў ад рэчкі Адроўкі. З гэтых камэр адходы трапляюць у грунтовыя воды, а адтуль у пітную ваду, якая й так кепская. Праваабаронцы зьвярнуліся ў раённую інспэкцыю па экалёгіі. Тая дала прадпісаньне перазахаваць адходы у поліэтыленавыя мяхі. Прайшло некалькі месяцаў, але нічога ня зроблена. Да таго ж там жа паспальвалі люмінісцэнтныя лямпы, якія забаронена разьбіваць, бо яны ўтрымліваюць небясьпечную для здароўя ртуць. Не паскорыў вырашэньня праблемы і пікет, праведзены баранскімі актывістамі дэмакратычнага руху (пікеты тут зь нядаўняга часу ладзяць у сасьняку, убаку ад жыльля, таму іх ніхто ня бачыць).

**Яўген Жарнасек,**
**Ворша**

### Дзяды ў Полацку

Полацкія грэка-каталікі на Дзяды ў памяць ахвяраў сталінізму зладзілі набажэнства ля мэмарыяльнага Крыжа ў Бельчыцах. Праведу службу настаяцель парафіі Сьв.Язафата а.Лявонці. У акцыі бралі ўдзел й вэтэраны нацыянальнага руху — былыя сябры Саюза беларускіх патрыётаў і вязьні ГУЛАГу, палачане Леў і Марыя Бялевічы.

**Васіль Кроква,**
**Полацак**

### Адміністрацыя хуткага рэагаваньня

На Круглянішчыне па скарзе настаўнікаў Ваўканосаўскай школы камісія Адміністрацыі прэзыдэнта зладзіла праверку. Настаўнікі паскардзіліся, што ім сыстэматычна затрымліваецца выплата заробку ды дзіцячых дапамог. Вынікі праверкі яшчэ не вядомыя, але зарплата настаўнікам выплачана.

**Зінаіда Мілешчанка,**
**Круглае**

### Набудзь вогнетушыльнік — і гандлюй спакойна

Месяц у Бабруйску не працуе галоўны гарадзкі ўнівэрмаг, які зачыніла служба пажарнага нагляду. Колькі часу супэрмаркет ужо намагаліся зачыніць праз адсутнасьць сыстэмы пажаратушэньня і пажарнага апавяшчэньня. Але тады кіраўніцтва ГУМу перакапала пажарнікаў, што выправіць недахопы. Аднак чарговая праверка высьветліла, што нічога ня зроблена, і пажарнікі пайшлі на рашучыя захады. Між тым прыватныя прадпрымальнікі, якія арандуюць немалыя гандлёвыя плошчы ў ГУМе, церпяць страты не са сваёй віны.

**Надзея Лісоўская,**
**Бабруйск**

### Вайна сьметніцам

Напярэдадні I Усебеларускага экалягічнага форуму ў Воршы шмат сродкаў выдаткавалі на ўстаноўку сьметніц. Але сьметніцы, зробленыя з плястмасы, ужо амаль паўсюдна згарэлі ад недакуркаў. Кошт сьметніцы — 195 тыс. руб. (не на кожным аршанскім прадпрыемстве людзі столькі зарабляюць у месяц).

# Цыганок парваў Беласток

Гомельскі гурт «Al Narrator Orchestra» памінаў блюзавых Дзядоў на радзіме «Басовішча». Піша **Сяргей Мікулевіч**.

На Дзяды ў беластоцкім клюбе «Fama» прайшлі «Блюзавыя задушкі». Гэта традыцыйны канцэрт, прысьвечаны памяці памерлых блюзмэнаў. Запачаткавалася традыцыя 23 гады таму, ад памінаньня Рышарда Скібінскага. Гэты беластоцкі блюзмэн, заснавальнік культавага гурту «Kasa chorych», памёр у 1983-м ад передазоўкі наркотыкаў.

У клюбе сабралася клясычная пятнічная публіка. Салідныя спадары пры гальштуках і прыбраных панях з рыдыкюлямі. Альтэрнатыўная моладзь зь пірсінгам. Гімназісткі крамяныя. Адзін гэві-мэталіст. Пара добра п'яных. Паўнюткая заля. Шчасьліўцы сядзяць за столікамі, менш шчасьлівыя — на парэнчах, на падлозе перад сцэнай. Пад нізкаватай стольлю ўецца цыгарэтны дым. Увесь левы флянг займае пастаянна дзейная чарга за півам. Яна ўвесь вечар жыла сваім жыцьцём, незалежным ад таго, што адбывалася на сцэне.

Тры гурты паказалі публіцы тры розныя блюзы. Малады беластоцкі «Devil blues» імправізаваў роўна, клясычна. Але якраз devil'а-д'ябла музыцы не ставала. Не пазнаў бы іх кампазыцыі ў шэрагу іншых на блюзавым радыё. Чаму хлопцы ўзяліся за блюз? Такія маглі б і альтэрнатыўны рок граць, і нават харошы поп. Люблінскі «Terraplain», які выйшаў сьледам, наадварот, уразіў сілай унутранай матывацыі. Без аніякіх бубнаў і басоў — піяніна, гітара, вуснавы гармонік і вакал беластачанкі Іды Залеўскай. Нягучны міжваенны блюз з адгалоскамі Вялікай Дэпрэсіі, трывожны і прыхавана-жарсны. Перад кожнай кампазыцыяй — тэарэтычная частка. Музыкі распавядалі, што яны будуць зараз граць, якія ўплывы зазнала іх музыка ў гэтым канкрэтным выпадку. Інтэлектуалы блюзу. Шквал патрыятычных авацыяў выклікала кампазыцыя на польскай мове.

Трэці ўдзельнік «Задушак» — гомельскі «Al Narrator Orchestra». Як прымуць? Беларусы выйшлі ў вясёлкавых індзейскіх апранахах. Пакуль настройваліся, публіка сядзела прыгаломшаная. Пасьля быў новы цуд. Фронтмэн «Наратара» Аляксандар Цыганок не сказаў слухачам ні слова па-польску. І па-беларуску таксама. Гаварыў выключна па-ангельску. Прычым яго лекцыі з тэорыі блюзу былі мала карацейшыя за маналёгі папярэднікаў. «Вы гэта заўсёды так жорстка з польскай публікай?» — спытаў я яго пасьля. «Ды не, — сьмяяўся Аляксандар. — Проста так легла. У Раве-Мазавецкай, дзе мы ўзялі першы прыз на фэстывалі «Noc Bluesowa», я толькі па-польску гаварыў». Гэты шчуплы невысокі чалавек на месцы забіў Беласток харызмай. Так, Залеўская сьпявала стылёва, з пачуцьцем, але такой жывой нэрвы, інтанаваньня, такой шчырасьці ня мела. Хоць у блюзе, хоць у соўле, хоць у рэгі Цыганок заставаўся жывым і пазнавальным.

Пад гомельскі аркестар у залі пачаліся актыўныя танцы. Гэта было яшчэ зьвязана з тым, што чарга за півам сябе вычарпала. Моладзь круцілася ў парах, рабіла «цягнічок» цераз усю залю, сталейшыя падпявалі там, дзе Аляксандар патрабавальна казаў: «You!» А хтосьці сядзеў і гаманіў, піва піў, не зважаючы на сцэну, хтосьці падымаўся і ішоў дадому. Блюз ні да чога не абавязвае. Але пляскалі «Наратару» ўсе, не сьціхаючы. Скандавалі «Яш-чэ!». Крычалі «Жыве Беларусь!».

Грымэрка. Стомленыя двухгадзінным граньнем блюзмэны сьцягваюць свае пончa. Аляксандар Цыганок крыва паглядае на інструмэнт, які ён падстройваў пасьля кожнай песьні, і гаворыць на чыстай беларускай мове: «Гітара — гаўно». Дык чаму новую ня купіце? «Няма грошай, — Цыганок адломвае кавалак шакалядкі. — У Гомелі з канцэртамі — нулевіч. Добра во сюды запрасілі». «Ты ня ведаеш, — умешваецца акардэаніст Аляксандар Гулай, — мо тут дзе падзарабіць можна?» На стале апроч шакалядкі — негазаваная вада. Уся дзядоўская вячэра.




**Беластоцкая моладзь танцавала і скандавала «Жыве Беларусь!»**

**«Al Narrator Orchestra»** — вынік творчых высілкаў Аляксандра «Наратара» Цыганка. Ён пачаў у 60-я з слуханьня «Creedance» і «Animals», пасьля захапіўся магіяй афраамэрыканскай музыкі, у прыватнасьці блюзам і соўлам. Сваімі ведамі пра блюз і блюзмэнаў Аляксандар быў гатовы дзяліцца з кожным. Адсюль мянушка «Наратар». Папярэднікам «Al Narrator Orchestra» быў гурт «Narrator», які выступаў на фэстах у Францыі й Швэцыі, а таксама ў родным Гомелі. «ANO» зьявілася ў 2000. У траўні гурт узяў першы прыз на фэстывалі «Noc Bluesowa» ў Раве Мазавецкай.

# Кулікова капліца




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Дождж, які апанаваў туманны Менск у нядзелю, апоўдні сьціх. Адкрыцьцё мэмарыялу на магіле Яўгена Куліка і ягонай маці было асьветленае сонцам. «Калі Караткевіча хавалі, таксама сьпярша быў дождж, а потым сонца выйшла», — напаўголасу зазначыў нехта з прысутных.

Стылізаваную гранітную каплічку з манаграмай ЯК (праца Віктара Маркаўца) упрыгожыла вялікае бел-чырвона-белае палотнішча — сьцяг, эскіз якога намаляваў Я.Кулік і які ў 1991 г. стаў дзяржаўным.

На Кальварыйскія могілкі сабраліся тры дзясяткі чалавек, пераважна прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Выдавец Зьміцер Санько зазначыў, што ў асобе Я.Куліка мы мелі найперш маральнага аўтарытэта. У прамовах выступоўцы згадвалі Кулікову майстэрню «На паддашку», якая была кузьняй нацыянальнай думкі. Згадвалі дзейнасьць мастака пры ўтварэньні Беларускага народнага фронту.

Ушанаваньне памяці Куліка працягнулася ў кавярні «Фальварак Добрыя Мысьлі»: тут адкрылася выстава ягоных твораў — пэйзажы, партрэты, натурморты. Тут гучала менш патэтычных прамоваў і больш сяброўскіх успамінаў. Алесь Марачкін згадаў, што менавіта Кулік прапанаваў назву «Пагоня» для мастакоўскай суполкі, задуманай Міколам Купавам. Куліка называлі «геніяльным экспазыцыяністам»: над разьмяшчэньнем твораў на выставе ён мог працаваць бяз стомы — аднаго разу працаваў над разьмяшчэньнем 5 карцінаў з раніцы да вечара.

Неаднаразова згадвалі энцыкляпэдычныя веды мастака што да беларускага мастацтва й этнаграфіі. Так, Алесю Шатэрніку падчас працы над скульптурай «Колас-настаўнік» Кулік маляваў поршні — характэрны сялянскі абутак. З.Санько прыгадаў паштоўку з нацыянальнай сымболікай, якую мастак намаляваў у 1980 г. да 1000-годзьдзя Беларусі. Разасланая па беларускіх дзеячах, яна невядомым чынам патрапіла на Захад і была растыражаваная як «Падпольнае выдавецтва ў Беларусі». Пад ціскам КГБ Кулік мусіў выступіць супраць «бебурнацаў», аднак знайшоў геніяльнае выйсьце: у інтэрвію газэце «Голас Радзімы» ён абурыўся парушэньнем ягоных аўтарскіх правоў, не адмаўляючыся ад самой паштоўкі.

**AB**

**P.S.** Грошай, сабраных сваякамі й сябрамі Яўгена Куліка, не хапіла цалкам расплаціцца за ўзьвядзеньне мэмарыялу. Ахвотныя дапамагчы ў гэтай сьвятой справе могуць зьвяртацца з ахвяраваньнямі на тэл. 286-00-75, 400-89-86. Тутсама прымаюцца ахвяраваньні на выданьне альбому твораў мастака.

# Энцыкляпэдыя для чыноўнікаў па-расейску

Выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя» рыхтуе кароткі варыянт унівэрсальнай энцыкляпэдыі, выдадзенай нядаўна ў 18 тамах. Новае 6-тамовае выданьне мае тэмай толькі Беларусь. Аднак артыкулы пра пісьменьнікаў, нацыянальных дзеячоў, асабліва эмігрантаў, выкінутыя ці моцна «папраўленыя». Супрацоўнікам выдавецтва патлумачылі: робіцца гэта дзеля таго, што асноўны наклад кнігі пойдзе ў Расею, а там такія падрабязнасьці ня трэба. Між тым на вушка кажуць, што энцыкляпэдыя прызначаецца для распаўсюду ў «вэртыкалі».

**AB**

# Вынікі 38-га туру «Тузіну гітоў»

**www.music.fromby.net**

1. «Сьцяна». «Можна быць» ................. 301 голас.
2. «Айша». «Зь вераю» ........................ 272
3. Вайцюшкевіч і «WZ-Orkiestra». «Сьвята ў вёсцы » ........................ 238
4. «Тарпач». Радыяцыя ........................ 227
5. «Tav.Mauzer». «Брудная вада.» ........................ 224
6. «Палац». «Праваджала маці сына» ........................ 222
7. «Divina Enema». «Празь цемру...» ........................ 213
8. «Zygimont VAZA». «ContraБанда» ........................ 201
9. «Яр» і «Logika Metro». «Салдацкая (remix)» ........................ 186
10. «Dali». «Грай, гармон» ........................ 173
11. Макс Івашын. «Мая рэлігія» ........................ 135
12. «ZigZag». «Кастрычнік» ........................ 117

Праслухаць песьні можна ў Інтэрнэце на сайце «Тузіну гітоў», штопятніцы ў радыёэтэры на 92,4 FM у 23.00 у праграме «Тузін гітоў з Алегам Хаменкам».

# Арэх, які няпроста разгрызьці

Пісьменьнік атрымлівае славу, чытач — асалоду, рэдактар — катаржную працу, нядобразычлівасьцьцаў і ворагаў. Рэдактар — гэта палітык, хітрун, стратэг, артыст, хамэлеон, бясконца гнуткая сталёвая канструкцыя... **Кастусь Травень** піша пра **Барыса Пятровіча**.



**Барыс Пятровіч — рэдактар «Дзеяслова».**

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Усё выйшла выпадкова: я пасварыўся з рэдактарам. Ішоў злы і думаў пра Рэдактара як зьяву. «Рэдактар — галоўная фігура літаратурнага працэсу. Пісьменьнік атрымлівае славу, чытач — асалоду, рэдактар — катаржную працу, нядобразычліўцаў і ворагаў. Рэдактар — гэта палітык, хітрун, стратэг, артыст, хамэлеон, бясконца гнуткая сталёвая канструкцыя... Рэдактар — гэта бандыт!..» — злосна думаў я.

Рэдактар мае рэдкую магчымасьць — весьці свой рэй. Ён можа адшукаць, выкапаць, пасеяць і ўзгадаваць Асобу, патрэбную нацыі. Але ён ня мае магчымасьці сам пісаць свае раманы і апавяданьні, паэмы і вершы. Ягоную энэргетыку зьядаюць чужыя творы, у большасьці графаманскія, якія ён бясконца чытае штодня і якія атручваюць яго душэўную экалёгію. Але рэдактар — таксама літаратар, ён хоча, марыць, імкнецца сказаць нешта сваё аб сучасным жыцьці.

І вось я трымаю ў сваіх руках рэдактарскую кніжку «Шчасьце быць...». Спроба праглынуць кніжку зразу не ўдалася. Пачытаўшы кніжку з апошніх старонак, разгарнуў у сярэдзіне і таксама не атрымаў асалоды. Засталося адчуваньне неразгрызенага арэха. Стаў чытаць з пачатку. Чытаў, чытаў і нарэшце пачаў унутраны дыялёг з аўтарам.

Вось я ў думках вучу рэдактара, як пісаць празаічныя творы: «Апавяданьне «Віна». Тэма актуальная: усе мы, беларусы-мужчыны, адчуваем несьвядомую віну. Мы страцілі сваё мужчынскае «Я» і таму мы не выконваем свайго жыцьцёвага доўгу. Мы ня робім тое, што павінны рабіць. А мужчына павінен валадарыць на сваёй жыцьцёвай прасторы, дзеля чаго яму і дадзена жыцьцё. Нашаму мужчыну не належыць ні наша неба, ні нашы прасторы, ні нашы жанчыны... Ён ня плённы — нават цяпер, калі некаторыя зь іх зарабляюць грошы, ім падсунуты стэрэатыпы спажываньня замест плённага валадарства.

Апавяданьне мае мноства нескарыстаных магчымасьцяў. Можна было яшчэ больш завастрыць завязку дыялёгам з дырэктарам і пачаткам трагічных успамінаў былога партызана. І цяпер перад героем (пасьля таго як ён успомніў трагедыю зьнішчэньня вёскі) паўстае дылема: ісьці ў школу і казаць праўду ці не казаць праўды. Можна было б нават паказаць, што ён раіцца з адукаваным і чулым дырэктарам, і той вырашае, ці трэба моладзі праўда. Магчыма, дырэктар мусіў стаць галоўным героем апавяданьня. Ён гісторык і дамагаецца гістарычнай ісьціны: як было, дзе было, ці не наклалі вы ў порткі, калі ўсутыч сустрэліся з захопнікамі? А тэма захопнікаў — хто яны і якія іх мэтады? Я прапаную аўтару іншае заканчэньне твору: «Яны ўзьняліся зь бервяна на прызьбе, і дырэктар, яшчэ малады чалавек у сьветлым пільчаку, папраўіўшы чырвоны карват рукой, прамовіў, з павагай і спачуваньнем пазіраючы на дзеда:

— Як жа яны, нашы дзеткі, пойдуць у жыцьцё, калі ня будуць ведаць праўды?

І дзед пакрочыў разам з дырэктарам да школы, несучы на сваіх плячах цяжар нявыказанай праўды...»

Яшчэ лепш, каб герой расказаў сваю праўду пра вайну вучням, і тыя адчулі страшны подых бязьлітаснай, чужой, не патрэбнай людзям вайны. Бо цяпер моладзь актыўна рыхтуюць да «гераічных подзьвігаў».

Апавяданьне задумана выдатна, але трэба было над ім папрацаваць — перапісаць разы тры. Гогаль перапісваў свае творы па восем разоў.

«І ваша праблема ў тым, што вам бракуе часу. Вы альбо Пісьменьнік — альбо Рэдактар!»

Я пачынаю чытаць аповесьць «Пуціна», адчуваю — гэта паэтычная, узьнёслая жыцьцесьцьвярджальная паэма ў прозе аб незасьмечанай, чыстай, як крынічная вада, маладосьці! Паэзія гучыць зь першых радкоў тэксту: «На Шыкатане, на беразе Ціхага акіяну, на краі сьвету, ня думаецца пра прыгажосьць і бясконцасьць прасторы, якая называецца плянэтаю Зямля, ня робіцца зразумелай твая нікчэмнасьць (...) ды дробнасьць перад магутнымі сіламі прыроды і самой прыродай увогуле...»

Найлепш, не спяшаючыся, з асалодай каштаваць паэму-смакату восеньскім дажджлівым вечарам, захутаўшыся ў плед ды выпіўшы кубачак кавы.

І раптам я разумею задуму пісьменьніка і чырванею ад сораму. Прачытаўшы мільёны старонак чужых твораў, аўтар у сваіх тэкстах шчодрай рукой ставіць тычкі, вехі, паказвае напрамак на літаратурным шляху. Ён ня вучыць — ён паказвае. Ня маючы магчымасьцяў скарыстаць увесь свой назапашаны творчы патэнцыял, ён прапануе ўдумлівым і таленавітым велізарную колькасьць задумак, ідэй, сюжэтаў. Некаторыя ягоныя вэрсіі — гэта цалкам гатовыя ідэі, стрыжань для закончаных твораў, дасканалых раманаў ці апавяданьняў.

У замалёўцы «Пас аддаць» аўтар прызнаецца: «...на зломе гадоў, ва ўзросьце Хрыстовым, яму стала цікавей ня гол забіць, а пас аддаць». І далей: «Яму быў дадзены шанец, а ён яго не заўважаў. Ён пражыў міма. ...Але — мячык у яго. Хто там набягае на вароты?» У гэтым невялічкім апавяданьні аўтар фіксуе трагедыю свайго і папярэдніх пакаленьняў, што ня зьдзейсьніліся, не скарысталі шанц, пражылі ценявы, другасны варыянт свайго жыцьця...

Агульная ідэя кніжкі: якое шчасьце — быць! Проста быць на гэтым сьвеце! І ня трэба лезьці ў нэкрафілію, містыцызм, нават крытыку, укідвацца з галавой у палітыку, бо ўсё гэта адмаўляе наша ўласнае жыцьцё. Паглынае час, энэргію, наша ўнікальнае шчасьце быць.

Кніжка ня кожнаму па зубах. Яна для сучаснай маладой літаратурнай эліты, для тых, хто шукае свой шлях. Для тых, хто можа збочыць на замежныя постмадэрнісцкія фокусы. Заблытацца ў бясплённым авангардзе, не знайсьці свайго шляху. Пісьменьнік сьцьвярджае, што шчасьце не залежыць ад месца пражываньня, ад памеру катлеты і крыклівай чужой папсы...

З крыху садысцкім задавальненьнем я ўсьміхаюся пры думцы пра тых, хто не разгрыз арэшак, выказаў уголас сваё адмоўнае меркаваньне пра кніжку «Шчасьце быць...» і рана ці позна, як сумленны чалавек, будзе вымушаны (як я) чырванець ад сораму...

Я ўсё яшчэ чытаю гэту кніжку, бо яе нельга праглынуць зразу, яна патрабуе ўважлівага нетаропкага пранікненьня, і новыя адкрыцьці ў мяне наперадзе.

## Трэці выезд «Дзікага паляваньня»

Выйшла перавыданьне караткевіцкага «Дзікага паляваньня караля Стаха» ў малюнках Адама Глёбуса. Комікс надрукаваў Выдавецкі цэнтар БДУ. Першы наклад — 5 000 асобнікаў. Комікс «Дзікае паляваньне» быў упершыню надрукаваны ў часопісе «Бярозка», потым выдаваўся асобнай кнігай накладам 250 тыс. асобнікаў. Новае выданьне паўнаколернае, некаторыя малюнкі зьменены.

**АВ**

Polonia
POLSKIE RADIO

**з 1 лістапада** пашырылася рэтрансьляцыя перадач беларускай службы радыё **«Палёнія»** — праграмы для замежжа Польскага радыё. «Baltic Waves» рэтрансьлюе аднагадзінную перадачу апоўначы на сярэдніх хвалях (частата 612 кГц), а «Radio znad Wilii» — дзьве паўгадзінныя перадачы: у 4.30 і 22.00 на ультракароткіх хвалях (103,8 МГц).
Перадачы беларускай службы радыё «Палёнія» можна слухаць на кароткіх хвалях у 16.30 і 19.30 (частоты 6035 і 7180; 6050 кГц), па спадарожніку «Eutelsat II F-6 Hot Bird» (13° усходняе даўжыні, частата 11.474 ГГц, гарызантальная палярызацыя, нясучая гуку 7,38 МГц, у 7.30, 16.30, 19.30 і 23.30) ды ў Інтэрнэце ў жывым этэры і ў запісе — у некалькіх лічбавых фарматах: «Real Audio» і «Windows Media».

Дастаткова зайсьці на старонку беларускае службы сайту радыё «Палёнія»
www.polskieradio.pl/polonia
і слухаць у любы час.



# Марцін сьвяты — губіцель гагаты

Дзень сьвятога Марціна 11 лістапада быў некалі адным з самых улюбёных сьвятаў. Калі Беларусь была неад'емнай часткай заходняга сьвету, культ быў пашыраны і ў нас. Піша **Алесь Белы**.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

### Сьвяты Рэчы Паспалітай

На дзень сьв.Марціна прынята рэзаць гусей ды адзначаць сьвята рознымі стравамі, асабліва печанай (ці смажанай) гусьсю — «птушкай Марціна». У славянаўкаталікоў патрон гусей — сьвяты Марцін. Беларусам-каталікам гэтая традыцыя не чужая. Захавалася некалькі беларускіх прыказак наконт гэтага. Самая вядомая зь іх — «Марцін сьвяты — губіцель гагаты».

У Рэчы Паспалітай Марцін быў адным з самых шанаваных сьвятых, імем якога было названа больш за 200 касьцёлаў. Шмат стагодзьдзяў ягоны дзень быў абавязковым касьцельным сьвятам. Найшчырэйшыя каталікі распачыналі Адвэнт не ў пачатку сьнежня, а адразу па сьвятым Марціне.

### Біскуп Турскі

У 371 г. памёр біскуп гальскага гораду Тур. Сьвятары й вернікі пажадалі бачыць ягоным пераемнікам пустэльніка Марціна, аднак той не пагаджаўся. Тады месьцічы пайшлі на падман. Адзін з паважаных грамадзян Туру папрасіў, каб Марцін — а той славіўся цудоўнымі вылячэньнямі — наведаў яго хворую жонку. Заманіўшы пустэльніка да сябе, месьцічы гвалтам зацягнулі яго ў катэдру і пакорна-настойліва ўпрасілі прыняць годнасьць біскупа. Але легенда сцьвярджае, што Марцін уцёк ад надакучлівых прыхільнікаў ды схаваўся ў гусятніку. Аднак колішнія выратавальнікі Рыму выдалі яго сваім гергетаньнем. Таму нібыта першым учынкам разгневанага пустэльніка на новай пасадзе быў загад засмажыць адну са «здрадніц». Паводле іншай легенды, гусі аднойчы перапынілі казаньне Марціна, чым і выклікалі ягоны гнеў.

Але ж сьвята мае свае эканамічныя ды кліматычныя падставы. Гусі робяцца найтлусьцейшыя менавіта на пачатку лістапада — далей зіма не дае ім назапашваць тлушч, таму праз брак корму лішніх птушак забіваюць.

### Гусь па вадзе — Каляды на лядзе

Сьвята таксама падводзіла вынікі гаспадарчага году. На Марціна па ўсёй Эўропе разьлічваліся са старымі даўгамі, плацілі падаткі, наймалі на новы тэрмін работнікаў. Надаючы ў 1586 г. Магдэбурскае права Нясьвіжу, кароль Сьцяпан Батура вызначыў, што справаздачу перад гаспадаром і гараджанамі пра даходы і выдаткі магістрат мусіць трымаць на сьвятога Марціна. А ў Вялікім Княстве гусі былі абавязковай часткай «дзякла» — штогадовай натуральнай даніны. «Устава на валокі» вызначыла яе традыцыйную норму ў дзяржаўных маёнтках — адна гусь з аднае валокі (21,36 га).

Па грудной костцы печанай Марцінавай гусі варажылі пра будучую зіму. Пляма ў сярэдзіне азначала, што зіма будзе позьняй, белая костка прадказвала сьнежную ды марозную зіму, плямістая — няўстойлівую, цёмная — вільготную, слотную, рабая — завейную.

Варажылі пра надвор'е па палёце дзікіх гусей (біскуп турскі лічыцца патронам усіх пералётных птушак) і па надвор'і ўласна Марцінавага дня. У Менскай губэрні ў 1860-я зафіксавана прымета: «Марцінава гусь па вадзе — Божае Нараджэньне на лядзе» (калі на Марціна рэкі не замерзлі, на Каляды трэба чакаць моцных маразоў). І наадварот: калі на Марціна гусь выйдзе на лёд, то будзе плаваць па вадзе на Божае Нараджэньне. На Марціна дождж — мокрае лета.

Біскуп Турскі лічыўся таксама патронам млынароў. У гэты дзень заканчвалася праца на вадзяных млынах, тым больш што замярзалі рэкі. Тым, хто наважваўся працаваць на сьвята, Марцін нібыта мог адпомсьціць — пераламаць пальцы або прынамсі млынавыя колы.

### Прыгатуй ты мне гусь па-чорнаму

Старадаўняя беларуская кулінарыя ведала шмат страў з гусяціны. Любілі найбольш засмажаную ці запечаную цалкам гусь. Аўтар «Прамовы Мялешкі» (канец XVI ст.), узгадваючы пра незваротна страчаныя часы, прыгадвае: «Добрая была гуска з грыбкамі, качка зь перчыкам». Енджэй Кітовіч, сьведка звычаяў і густаў эпохі Сасаў, згадвае тагачасны далікатэс: «Гусяціна, вараная са сьметанай і з дробна парэзанымі сушанымі грыбамі, ячнай кашай засыпаная». Што гуска з грыбкамі яшчэ доўга ўспрымалася як нацыянальная страва, сьведчыць і Альгерд Абуховіч, прыгадваючы парыскае здарэньне каля 1860 г.: «Было гэта ў Францыі, спаміж маладзёжы я адзін быў зь Беларусі, дык злажыўся праект, што я павінен уладзіць трызну Дзядоў… Я й выступіў з пачастункам. Былі пячоныя гусі з грыбкамі, а замест крупніку — добра запраўленае le vin chaud (глінтвэйн)».

Страва саскіх часоў, гусь «пачорнаму», вымагала б ад сучаснага спажыўца мужнасьці: «Кухар паліў на попел вехаць саломы, выцягнутай, калі не было чыстай, у посьпеху з ботаў, дадаваў да гэтага лыжку або больш сьвежага мёду, даліваў да ўсяго паводле патрэбы якога моцнага воцату, мяшаў з той спаленай саломай, засыпаў перцам і імбірам — і тады ўся гусь рабілася чорнай; гэтую страву вельмі любілі і падавалі ў час самых пышных банкетаў».

### Мэню топ-рэстаранаў

З адных гусак вытоплівалі шмалец, зь іншых рабілі паўгусак — аддзялялі мяса ад грудкі, завівалі ў рулён, шнуравалі і вэндзілі. Гэтая «кансэрва» захоўвалася доўга і лічылася найлепшай закускай да гарэлкі. Зьбіралі гусіную кроў, такую неабходную для швэдзкага чорнага супу «svartsoppa», а калісьці і для нашай поліўкі. Каб не згарнулася, яе зьмешвалі з сольлю, а перад тым як уліць у булён, дабаўлялі муку ды сухары. Рабілі «кішкі» з гусіных пячонак — вельмі смачную каўбасу. На Віцебшчыне вельмі папулярным калісьці быў студзень, прыгатаваны з гусіных галоў, ног і крылаў. А яшчэ паштэты з гусінай пячонкі, пух на падушкі, гусіныя пёры, што захавалі для нас столькі думак і ўражаньняў даўно мінулых часоў… Таму мела рацыю «літоўская гаспадыня» Ганна Цюндзявіцкая: «Гусь — адна з самых вартых свойскіх птушак. Усё ад яе прыдатна для выкарыстаньня чалавекам — пух, пер'е, мяса, тлушч, вантробы, усё прыносіць нам выгаду».

Старадаўняя Літва — і, вядома, Беларусь — славілася вэнджанымі паўгускамі. «Смажаная паўгускі, язык халодны, скрылікі агузка» — абавязковы набор вэнджаніны на сьнеданьне, увекавечаны ў «Пане Тадэвушу». Эмігрантам, якія мусілі пакінуць край, літоўскія паўгускі здаваліся адным з сымбаляў страчанай Радзімы, прадметам нацыянальнага гонару, якім з годнасьцю частавалі іншаземцаў. У 1809 г. у сталіцы створанага Напалеонам Варшаўскага герцагства, куды зьбіраліся з усіх бакоў «недабітыя» патрыёты Рэчы Паспалітай, княжна Гелена Радзівілаўна частавала гасьцей традыцыйным «вясковым» сьнеданьнем, якое на яе замову падавалі на чарзе пяць славутых варшаўскіх рэстаранаў. Славутыя літоўскія паўгускі былі «гваздом» праграмы ў адным зь іх — «Добрых лікёрах».

### Незанятая ніша

Аднак у сярэдзіне XIX ст. пашырылася меркаваньне, што стравы з гусяціны — ежа прасьцяцкая, непрыдатная для раскошных арыстакратычных прыёмаў. Таму на першую палову XIX ст. прыпадае заняпад попыту на гэтую птушку. Але аграрны крызіс канца XIX ст. узмацніў развіцьцё птушкагадоўлі. Эканамічна выгаднай была гадоўля гусей, якія вывозіліся ў Нямеччыну (часам іх гналі ўвосень ва Ўсходнюю Прусію сваім ходам). Яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX ст. сфармаваліся дзьве пароды літоўскіх гусей: «чародныя» і «курыныя». Апошнія былі больш пашыраны дзеля большай вагі ды хутчэйшай гадоўлі. «Курыныя» паходзяць ад «чародных», скрыжаваных з усходняпрускімі, часткова — з эмдэнскімі ды памэранскімі. Відаць, тыя самыя пароды разводзілі на мяжы XIX—XX ст. і ў нас, бо тады яшчэ наша зь літоўцамі гаспадарка ўяўляла сабою адзіны арганізм. Нават беларускае слова «гергетаньне» — літоўская гаспадыня… 

Аматары старадаўняй кухні, якія хочуць уваскрасіць былыя стравы, могуць пачаць з рэцэптаў, сабраных у «Старадаўняй беларускай кухні» Г.Тычкі й Э.Зайкоўскага. Шмат якія са згаданых там страў уваходзілі ў мэню на дзень сьвятога Марціна, у тым ліку і гусіныя вантробы з чорным соўсам.

Аднак у сёньняшнім амаль двухмільённым Менску гусь купіць цяжка. Дзяржаўныя птушкафабрыкі не разводзяць Марцінавых птушак, не цікавячыя імі імпартэры «ножак Буша». Так што ніша гэтая вольная для выяўленьня прыватнай ініцыятывы. Зь іншага боку, сьвяты, што надаюць структуру хаатычнай плыні часу, патрабуюць пэўных высілкаў, а ў арганізацыйных клопатах выяўляюць сваю індывідуальнасьць і сцьвярджаюць годнасьць нацыянальнай культуры. І сьвяткуючы Марціна, мы ўбачым, што *наша* (супольная з палякамі, чэхамі, харватамі, швэдамі, немцамі, літоўцамі) Марцінава гусь ня горшая за амэрыканскую індычку на Дзень удзячнасьці.

### Паўгуска

На паўгускі гусей трэба добра адкарміць. Дзеля гэтага ўжываюць гарох, грэцкія крупы, авёс, кукурузу ці боб, а найхутчэй гусь тлусьцее ад клёцак з розных гатункаў мукі, разьведзенай вадой ці малаком. Жадаючы, каб гусі мелі вялікую пячонку, трэба ім добра саліць корм, а таксама змочваць гарох папярэдне ў салёнай вадзе. Чыстай вады не павінна бракаваць, таксама добра даваць ім калі-некалі вугаль, сьцёрты ў парашок, што прадухіляе гніеньне корму ў страўніку. Калі гусі пачынаюць задыхацца, трэба пакінуць іх карміць, бо тлушч можа іх задушыць. Забіўшы і абскубаўшы гусь, адняць вантробы, хрыбет і сьцёгны, выразаць грудзі, як мага больш зьбіраючы мяса, нацерці моцна сольлю з салетрай, беручы на 10 паўгусак фунт солі і лют салетры. Пасьля належнага націраньня соллю з абодвух бакоў скласьці паўгускі ў драўляную пасудзіну, перасыпаючы сольлю і карэньнем — ядлоўцам, перцам простым і ангельскім ды размарынам, прыкрыць вечкам і прыціснуць каменем. Так паўгускі мусяць ляжаць не даўжэй за тыдзень, а пасьля іх трэба абгарнуць паперай і вэндзіць два дні. Замест паперы можна паўгускі проста з солі абваляць у пшанічным вотруб'і, а затым увэндзіць на лёгкім агні. Такім чынам апрацаваныя паўгускі ядуць без далейшай апрацоўкі.

### Гусь, запечаная зь яблыкамі

На 1 гусь: соль, 1/2 лыжачкі кмену, трохі маярану (або мацярдушкі), некалькі дзясяткаў яблыкаў, 2—3 лыжкі булёну.

Зьняць з адкормленай гусі залішні шмалец (тлушч), абцерці яе зьверху і знутры сольлю ды кменам з маяранам, нафаршыраваць дробнымі неразрэзанымі яблыкамі і пячы на брытване са жменькай крышанай цыбулі, паліваючы напачатку булёнам, а потым увесь час уласным сокам. Перад падаваньнем на стол абкласьці асобна сьпечанымі яблыкамі, пакласьці і тыя, што запякаліся ўнутры. Сок, які выпусьціла гусь, запраўляць лыжкай мукі, моцна закіпяціць, абліць ім гусака, а рэшту падаць асобна.

### Шыйка гусіная з начынкай

1 шыйка гусі, 1/2 шклянкі грэцкіх ці ячных круп, гусіная печань, 50—80 г тлушчу, 1 цыбуліна, 1 корань пятрушкі, лаўровы ліст, перац, соль.

Шыйку гусі абпаліць, абскрэбці, прамыць і нацерці молатым перцам і сольлю. Згатаваць рассыпістую грэцкую ці ячную кашу, перамяшаць яе з дробна нарэзанымі і абсмажанымі на сале рэпчатай цыбуляй і кавалачкамі гусінай печані, напхаць шыйку, зашыць з абодвух бакоў. Палажыць у гаршчок, змазаны тлушчам, дабавіць трохі вады, дробна нарэзаны корань пятрушкі, рэпчатую цыбулю, лаўровы ліст, накрыць накрыўкай і паставіць у печ ці духоўку.

Беларускі мікрабіёляг **Ігар Лукашэвіч** (на фота), гадаванец Інстытуту мікрабіялёгіі і эпідэміялёгіі ў Менску, узначальвае групу навукоўцаў ва ўнівэрсытэце Мэрылэнду (ЗША), якая стварыла вакцыну супраць трасцы Ласа. Якога-небудзь эфэктыўнага сродку супраць сьмяротна небясьпечнай хваробы дагэтуль не існавала.



# Гэты беларус будзе ратаваць 300 тысяч чалавек штогод

Ад трасцы Ласа штогод памірала трыста тысяч чалавек, найбольш у Афрыцы. Як і ўзбуджальнікі вугліка, воспы, трасцы Эбала штам Ласа можа выкарыстоўвацца як біялягічная зброя. Гэтым тлумачыцца асаблівая ўвага навукоўцаў да яго.

Гэтая хвароба праяўляецца як гарачка, цягнецца некалькі тыдняў і руйнуе ўсе ўнутраныя органы цела. Як і вірусы Эбала ці SARS, Ласа распаўсюджваецца праз паветра. Дагэтуль эфэктыўнай вакцыны супраць Ласа не існавала.

Мікрабіёляг Ігар Лукашэвіч пачаў вывучаць захворваньне больш за 10 год таму, яшчэ ў Менску, падчас працы ў адной зь лябараторыяў навукова-дасьледчага інстытуту мікрабіялёгіі і эпідэміялёгіі. Выезд Лукашэвіча за мяжу меў выключна навуковую матывацыю. Праца зь вірусамі, стварэньне складанай якаснай вакцыны, у тым ліку і супраць грыпу, патрабуе адпаведных умоваў і велізарных фінансавых укладаньняў. Такой базы ў Беларусі сёньня няма.

У Інстытуце вірусалёгіі Мэрылэндзкага ўнівэрсытэту Ігару Лукашэвічу ўдалося стварыць гэтак званы клон вірусу Ласа. Перавага гэтай вірусной мадыфікацыі ў тым, што яна капіюе хваробу, але не выклікае яе ў арганізьме таго, каму зробленая прышчэпка. У выніку вакцынацыі адна прышчэпка на ўсё жыцьцё выпрацоўвае імунітэт супраць хваробы.

Вакцына, зробленая на аснове клону вірусу, дае навукоўцам магчымасьць распачаць клінічныя выпрабаваньні над чалавекам без усялякай рызыкі ягонага інфікаваньня. Папярэднія выпрабаваньні на прыматах ды іншых жывёлах прынесьлі пазытыўны вынік.

Падрабязныя вынікі дасьледаваньняў зьмешчаныя гэтымі днямі ў амэрыканскім навуковым часопісе Yournal of Virology.

**АЛ, паводле радыё «Свабода»**

# Галадоўка беларускіх палітэмігрантаў у Брусэлі

У сталіцы Бэльгіі, на пляцы Шумана, пачалася акцыя трох беларускіх палітычных уцекачоў. Яны абвесьцілі галадоўку, патрабуючы вызваленьня палітзьняволеных у Беларусі ды стварэньня міжнароднай камісіі ў справе зьнікненьня ў Беларусі палітыкаў і журналістаў. Галадоўшчыкі трымаюць плякаты з партрэтамі палітвязьняў і надпісамі-па ангельску «Свабоду палітзьняволеным», «Яны сядзяць у турмах таму, што хацелі будаваць у Беларусі дэмакратыю», «Патрабуем стварыць міжнародную камісію, каб дасьледаваць палітычныя справы зьнікненьняў у Беларусі». Хлопцы заяўляюць, што будуць працягваць акцыю, пакуль ім ня стане дрэнна, — за іх станам здароўя будзе сачыць доктар-беларус з Антвэрпэну.

У ноч на 9 лістапада брусэльская паліцыя не дазволіла хлопцам застацца на пляцы, вытлумачыўшы гэта складанай абстаноўкай у Брусэлі начамі.

**Алег Раявец**

# Савушкін на волі, даў першае інтэрвію



**Працяг са старонкі 1.**

Ягоны сябар Аляксей Гуз, якому далі 25 гадоў, сядзіць у Воршы. Валер Ігнатовіч і Максім Малік — у Жодзіне на пажыцьцёвым зьняволеньні. Паводле Савушкіна, Ігнатовіч пачуваецца вельмі блага.

Па выхадзе з турмы Сяргей зьехаў у Нямеччыну, дзе прасіў палітычнага прытулку, выдаючы сябе за пацярпелага ад чачэнскай вайны. Потым зьехаў у Швэцыю, дзе распавёў праўду. Яго адправілі назад у Нямеччыну, немцы — дэпартавалі ў Беларусь.

Па вяртаньні яго выклікаў да сябе сьледчы Чумачэнка. Савушкін кажа, што Чумачэнка патрабуе інфармацыі пра Завадзкага, узамен абяцае паспрыяць ад'езду.

Савушкін настойвае, што ня ведаў Завадзкага да свайго арышту, і ніколі пра яго ня чуў, і ўвогуле справа Ігнатовіча «прыцягнутая за вушы». «Вы думаеце, Ігнатовіч ідыёт — сесьці ў сваю машыну й сачыць за домам Завадзкага? — пытаецца суразмоўца і сам адказвае. — Ён не ідыёт, ён разумны».

Савушкін наконт будучыні настроены пэсымістычна. Ён упэўнены, што яго цяпер альбо заб'юць, альбо зноў пасадзяць.

**Яўген Васілеўскі**

# Самая цёплая восень

Шматгадовыя сярэднія значэньні кастрычніка былі перавышаны на 1,3 градуса. Значна цяплейшы за звычайны будзе і лістапад. Толькі ў 1955 і 1967 гадах паказчыкі былі падобныя. Ападкаў у параўнаньні зь мінулым годам выпала на 40% меней — за два першыя восеньскія месяцы ўсяго 47 мм. Кіраўнік аддзелу клімату Гідрамэтэацэнтру Алена Камароўская зазначае, што такое адбываецца раз на чатыры гады.

Засушлівае надвор'е прывяло да таго, што сельская гаспадарка аказалася на парозе крызісу. Кіраўнічка аддзелу аграмэтэаралягічных прагнозаў Надзея Мельчакова зазначае, што восеньню адбылася доўгатэрміновая глебавая засуха. У некаторых раёнах не распусьцілася палова азіміны, а на Гомельшчыне ёсьць раёны, дзе руні няма зусім. Агульныя страты ад засушлівага надвор'я, паводле папярэдніх падлікаў супрацоўнікаў аддзелу, складаюць трацІну ад агульных пасеваў. Рунь, што не распусьцілася, мае мала шанцаў перажыць зіму.

**Міхась Панкоў**




**Эўропа больш не здаецца раем. Беспарадкі эмігрантаў у французскіх гарадах доўжацца другі тыдзень. Улады пакуль ня могуць даць рады.**

# Адам быў каталёнцам

Гішпанскія палеантолягі знайшлі ля Барсэлёны чэрап, які можа належаць невядомаму раней агульнаму продку чалавека і малпы.

Жыў ён 14 млн гадоў таму. Чэрап захаваўся амаль некрануты. Летась у Каталёніі ўжо былі знойдзеныя акамянелыя парэшткі прымата, які, нібыта, быў пераходнай формай між малпай і чалавекам. Траваядную паўмалпу-паўчалавека, што жыла 13 мільёнаў гадоў таму, назвалі Паў, альбо Піралапітэк Каталёнскі (Pierolapithecus catalunicus). Мяркуюць, што ён быў падобны на сучасных шымпанзэ, умеў свабодна лазіць па дрэвах і хадзіць на абедзьвюх нагах. Рост Паў меў 1,20 м, вага — 35 кг.



Да нядаўняга часу навуцы былі вядомыя вымерлыя малпы, якія сталі продкамі людзей, і старажытныя людзі, якія ў выніку эвалюцыі ператварыліся ў homo sapiens. Але якая істота зьвязвала гэтыя два этапы, сумяшчаючы ў сабе малпу і чалавека, заставалася невядома, што не дазваляла лічыць тэорыю сэра Чарлза Дарвіна канчаткова пацьверджанай.

### Міхай не атрымае кампэнсацыі

Канстытуцыйны суд Румыніі адхіліў у сераду праект пастановы, якая прадугледжвала б кампэнсацыю 30 млн эўра былому каралю Міхаю за канфіскаваную ў яго камуністамі ў 1948 г. маёмасьць. Праект пастановы, падрыхтаваны папярэднім сацыял-дэмакратычным урадам Адрыяна Настасе, даваў бы былому каралю і ягонай жонцы таксама пажыцьцёвае права атрыманьня даходаў ад эксплюатацыі некалькіх замкаў і іншай нерухомасьці, якая выкарыстоўваюцца цяпер як турыстычныя аб'екты. 84-гадовы кароль Міхай Гагенцолерн, скінуты камуністамі ў 1947 г., вярнуўся ў Румынію ў 1992 г. і жыве ў Бухарэсьце як прыватная асоба.



**7 лістапада — сьвята індусаў**
**На 7 лістапада прыпадае індускае сьвята Чхат — час малітваў да Бога пра ўдачу і добры ўраджай.**

# Леаніды вяртаюцца

У ноч на 9 лістапада Леаніды дасягнулі Зямлі. Цягам 13 дзён плянэта будзе знаходзіцца ў мэтэорнай плыні.

Леаніды — самая знакамітая мэтэорная плынь у гісторыі чалавецтва, назіраньні за ёй вяліся яшчэ 4 тыс. гадоў таму. Раман Уладзімера Караткевіча «Нельга забыць» спачатку называўся «Леаніды ня вернуцца да Зямлі». Назву зьмяніла цэнзура — яшчэ жывы быў Леанід Брэжнеў. Мэтэоры лятуць у хвасьце камэты Тэмпэля-Тутля. Тая рухаецца па складанай арбіце вакол Сонца з пэрыядам звароту ў 33 гады, але раз на год чапляе сваім хвастом Зямлю ў сярэдзіне лістапада. Свайго піку зорны дождж дасягне 13 і 19 лістапада. Можна будзе назіраць да 100 мэтэораў у гадзіну. Ладуйма біноклі й спадзяемся на яснае неба.

**Сяргей Мікулевіч**

# Алесь Разанаў: Лукашэнкаўская палітыка — не нармальная

Але Лукашэнку ёсьць за што пахваліць. Паэт Алесь Разанаў даў першае пасьля вяртаньня зь Нямеччыны інтэрвію — месячніку беларусаў у Польшчы «Czasopis».

**— Некалькі апошніх гадоў Вы жылі за мяжой. Чаму Вы эмігравалі зь Беларусі?**

— Тое, што апошнія чатыры гады я пастаянна жыў у Нямеччыне і Аўстрыі, не было эміграцыяй. Я ня быў уцекачом і не прасіў прытулку, бо знаходзіўся ў Заходняй Эўропе на творчыя запрашэньні.

**— У Менску ўвесь час гаварылася і пісалася, што Вы падаліся ў эміграцыю.**

— У наш час усё, што беларускае, многія хочуць завастрыць ды ідэалягізаваць. Я ж хачу заставацца творцам, і я быў творцам у Гановэры і ў Боне, як стыпэндыят гэтых гарадоў, а пасьля — у аўстрыйскім Грацы. За гэты час выйшлі тры кнігі вершаў, празь месяц выйдзе яшчэ адна, пятая ўжо на нямецкай мове. Больш таго — я ўвайшоў на поле нямецкамоўнай паэзіі і пачаў пісаць па-нямецку. Хаця не зусім дакладна па-нямецку. Я пачаў маляваць нямецкімі словамі. Дзеля гэтага прыдумаў новы жанр, які назваў «worddychte». Гэта новае слова нават для нямецкай мовы і літаратуры.

**— Як успрынялі Вашы спробы нямецкія творцы?**

— Яны згодна сказалі, што такога ў іх яшчэ не было. Хоць я ні ў якім разе не спаборнічаю зь нямецкімі паэтамі. Гэта было б бессэнсоўна. Яны сваю мову ведаюць дасканала, як мы сваю, у нюансах. Таму я прапанаваў сваю гульню. А зь Беларусі я прыехаў не адзін, бо ўзяў з сабою кавалак беларускага поля. Яго прызямліў у Нямеччыне і на ім пачаў вырошчваць новыя рэчы, якія сталі новыя і для нямецкай паэзіі.

**— Значыць, Ваш выезд за мяжу быў таксама прамоцыяй беларускай паэзіі ў Эўропе?**

— Безумоўна. Асабліва дзьве кніжкі, якія выйшлі ў Гановэры. Яны на дзьвюх мовах — беларускай і нямецкай. Дзякуючы гэтаму беларуская мова жыўцом увайшла ў кантэкст нямецкамоўнай паэзіі. Я гэта зрабіў, каб падняць статус нашай мовы, літаратуры і паэзіі. Літаратурны цэнтар, які даўней быў у Расеі, цяпер перамясьціўся ў Заходнюю Эўропу. Такую ролю, прынамсі, бярэ на сябе Нямеччына. Раней там сустракаліся эўрапейскія літаратуры, а цяпер усё больш сустракаюцца і постсавецкія. Мае «worddychte» прымусілі нямецкіх творцаў задумацца, як гэта можа быць, што нейкі беларускі паэт прыходзіць у іхняе поле, ублытваецца ў іхнія правілы гульні, парушае іх, робіць нешта, чаго самі яны не змаглі зрабіць.

**— У падобнай сытуацыі доўгія гады былі, здаецца, і беларускія літаратары ў Польшчы, Сакрат Яновіч. Палякі доўгі час не маглі зразумець, што нехта непаляк можа літаратурна пісаць па-польску.**

— Палова францускай літаратуры створана нефранцузамі. Таму нічога дзіўнага, што і нямецкую літаратуру могуць узбагачаць ня толькі немцы. У вас у Польшчы беларусы ўваходзяць у гэта проста натуральна.

### Менск зьмяніўся ў лепшы бок

**— Як гэта сталася, што Вы нядаўна вярнуліся ў Беларусь?**

— Я вярнуўся б раней, але выйшла, што, калі канчаўся тэрмін стыпэндыі ў адным творчым доме, запрашаў іншы. Пасьля «Віла Лядбэрту» каля Мюнхэну мяне запрасіў дом творчасьці пад Бэрлінам. У Менску бываў толькі кароткімі наездамі, а ў мяне ж сям’я — жонка, дзеці…

**— Як Ваша вяртаньне было ўспрынята афіцыйна — хтосьці гэта заўважыў?**

— Найперш адрэагавала літаратурнае асяродзьдзе. У Менску я доўга не друкаваўся, цяпер трэба кампэнсаваць творчую адсутнасьць у Беларусі. Я ўжо пачаў паказвацца трохі ў пэрыёдыцы і рыхтую ў друк новы том вершаў. Супрацоўнічаю з выдавецтвамі і рэдакцыямі, якія больш-менш не залежаць ад афіцыйнага апарату.

**— Што ў Менску памянялася за той час, як Вы былі ў Нямеччыне і Аўстрыі?**

— Відавочна, Менск зьмяніўся ў лепшы бок. Стаў больш упарадкаваны. Цяпер я не адрозьніваю яго ад эўрапейскіх гарадоў. Менск нават у нечым больш дасканалы ад нямецкіх гарадоў. У нас большая чысьціня і парадак. Сталіца актыўна разбудоўваецца. Людзі, калі іх параўнаць з рэкамі і ручаямі, раней ня мелі выразнага кірунку, куды плысьці. Сплываліся на плошчы, на мітынгі, каб дэманстрацыі далі ім кірунак, куды ўсім цячы далей. На жаль, нічога такога не накрэсьліў. Але цяпер гэтыя «рэчкі і ручаіны» шукуць сваімі прыватнымі шляхамі. Куды і як цякуць — іншая гаворка. Жыцьцё людзей стала таксама больш упарадкаванае, спакойнае.

> Найбольшы мінус рэжыму — гэта статус Беларусі.



**Алесь Разанаў** (нар. 1947) — паэт, перакладчык. Нарадзіўся ў вёсцы Сялец (Бярозаўскі р-н Берасьцейскай вобл.). У 1966—1968 вучыўся ў БДУ, адкуль быў выключаны за патрабаваньне беларусізацыі ўнівэрсытэту. Скончыў Берасьцейскі пэдынстытут (1970). Першы зборнік паэта мусіў называцца «Адрачэньне», але быў перайменаваны крытыкамі на «Адраджэньне». Працаваў у «ЛіМе», «Роднай прыродзе», выдавецтве «Мастацкая літаратура», у 1994—1999 — часопісе «Крыніца». Увёў у беларускую літаратуру жанры вэрсэтаў, вершаказаў, пунктіраў, квантэмаў. Апошнія гады жыў у Нямеччыне і Аўстрыі. Ягоны вольны ці міжвольны ад’езд супаў зь перабываньнем Быкава і Алексіевіч за межамі Беларусі.

PHOTO.BYMEDIA.NET

### Нашы найбольшыя прэзыдэнты

**— Чуючы гэта, хтосьці можа сказаць, што Вы хваліце лукашэнкаўскія ўлады.**

— Хачу быць аб’ектыўны. Ёсьць за што пахваліць. За тое, што для простага чалавека. Не для мяне, які ў іншых сфэрах лётае і мае іншыя крытэры ды патрабаваньні. Аднак для звычайнага чалавека рэчаіснасьць стала больш упарадкаваная.

**— А для культуры і беларускасьці?**

— На жаль, тут няма за што хваліць. Найбольшы мінус рэжыму, які пераважвае ўсё станоўчае, — гэта статус Беларусі. Што рэжым прынізіў Беларусь у параўнаньні зь іншымі краінамі рэгіёну, гэта ўсюды відаць. Калі ў Вене мне ўручалі літаратурную прэмію, сабраліся паслы ўсіх краін, адкуль былі ляўрэаты. А зь беларускага пасольства прыбыў толькі нейкі маргінальны чыноўнік. Іншыя зьдзіўляліся, не разумелі, чаму. Былі таксама надта зьдзіўлены, чаму ўсе паслы гавораць на сваіх мовах, а беларускі чыноўнік — не. Гэта ня робіць гонару лукашэнкаўскай палітыцы ў дачыненьні да моўнага пытаньня, якое самае відавочнае і самае балючае. На ім трымаецца ўсё, ліпіць. Я ўжо даўно сказаў і цяпер паўтараю, што найбольшыя нашы прэзыдэнты — гэта тыя, якія былі калісьці: Янка Купала, Максім Багдановіч, Якуб Колас. Вось яны і ёсьць нашы найлепшыя прэзыдэнты, якія цяпер знаходзяцца ў «эміграцыі». Але яны вяртаюцца і будуць вяртацца. І калісь вернуцца назусім.

Лукашэнкаўская палітыка — яўнае парушэньне прынцыпаў нармальнага жыцьця. Усімі гэта адчуваецца, але не хапае ні моцы, ні адвагі, каб гэтую нязгоду кансалідаваць у патэнцыял, сілу, якая адвярнула б існуючы стан рэчаў.

**— Але тыя, што хочуць тое зрабіць, відавочна, ня ведаюць як.**

— Так. Яны звычайна па інэрцыі ідуць у нейкія арганізацыі, якія, аднак, замест таго каб зьдзяйсьняць самае галоўнае, пачалі проста прыстасоўвацца да акалічнасьцяў.

### Беларускае слова павінна гучаць усюды

**— Ці ёсьць у паўсюдна расейскамоўнай сёньняшняй беларускай краіне хаця б адзін літаратар, які па-расейску добра піша?**

— Ведаю многіх літаратараў, якія дзесяцігодзьдзямі пісалі па-расейску. Некаторыя нанава пачынаюць так пісаць. Але які з гэтага набытак, цяжка мне сказаць. А тыя, што пішуць па-беларуску, таксама занадта падзяліліся на нейкія выспачкі, кладкі, кавалачкі. Ёсьць пісьменьнікі, якія друкуюцца ў «Полымі». Іншыя нават не хацелі б там друкавацца, таму што гэта нібыта пад дахам рэжымнага холдынгу. Але дзе ім друкавацца? Я лічу, што беларускае слова павінна гучаць усюды там, дзе яно можа. Адзінае — каб без цэнзуры. Калі ёсьць такая магчымасьць, не глядзіце, што гэта левыя там ці правыя, бел-чырвона-белыя ці зялёна-чырвоныя. Друкуйцеся. Беларуская літаратура больш старажытная і важкая, чым гэтыя распадзелы, якія ў нечым умоўныя.

**— Над чым цяпер працуеце?**

— Спадзяюся, што да канца году выйдуць дзьве мае кніжкі, у якія ўвайшлі неапублікаваныя творы папярэдніх гадоў.

**— Выйдуць у холдынгу?**

— Не, у незалежным выдавецтве. За час нямецка-аўстрыйскай вандроўкі шмат назьбіралася ў мяне нататак, якія таксама хачу зьвесьці ў асобны літаратурны твор.

**— Ці бачыце Вы шматабяцальных маладых беларускіх літаратараў?**

— Я бачу многа маладых, якія пішуць. Важна, што многія пішуць па-беларуску. Нягледзячы на прэсінг расейскай мовы, якая запоўніла ўсе шчыліны і гучыць з усіх чыноўніцкіх вуснаў. Веру, што яны — тая сіла, якая здольная супрацьстаяць гэтай плыні.

**— У сёньняшняй Беларусі існуе парадокс. Народ гаворыць на адной мове, літаратура стварaецца на другой. Такога больш у сьвеце няма.**

— Аказваецца, Беларусь багатая на незвычайнасьці *(сьмяецца)*.

**Гутарыў Юрка Хмялеўскі**

# Дух сьвежай падземкі

Рэпартаж **Зьмітра Дрыгайлы** з адкрыцьця трох новых станцыяў Менскага мэтро.

30 чэрвеня 1984 г. мы з татай і мамай паехалі глядзець на дзіва: у Менску адкрывалі мэтро — восем станцый ад «Інстытуту культуры» да «Маскоўскай». Прайшоў 21 год. 7 Лістапада. Краіна сьвяткуе 88-я ўгодкі Вялікага Кастрычніка. Халодна. Гэтым разам бацькі не паехалі — шмат хатніх справаў, маўляў, пасьпеем паглядзець. Гэтым разам падзея — лякальнае сьвята для жыхароў сталічнага Захаду. У Менску адкрылі 21-ю, 22-ю і 23-ю станцыі мэтро.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### 11.00. Станцыя «Каменная горка»

Наземны рух перакрыты. Цягнікі ідуць толькі да «Пушкінскай». Зачыненыя ўваходныя дзьверы з вуліцы на новыя станцыі, людзі ня могуць карыстацца нават падземнымі пераходамі. На плятформе станцыі «Каменная горка» зьяўляецца А.Лукашэнка. Ён расказвае журналістам пра амбіцыйныя пляны далейшага будаўніцтва ды звыклыя рэчы: захаваньне добрай традыцыі савецкіх часоў — дарыць працоўныя падарункі народу да дзяржаўных сьвятаў, паскарэньне тэмпаў будаўніцтва мэтро ў два разы. Гаворыць пра тое, што ўсё зробленае трэба зьберагчы.

### 11.30. Пасёлак Кунцаўшчына, паварот на агракамбінат «Ждановічы» ды МКАД

На прыпынку стаіць аўтобус № 36. На слупе напісана, што гэты новы маршрут да д/с «Кунцаўшчына» пачне хадзіць толькі пасьля адкрыцьця другой лініі мэтро. Людзі на прыпынку запытваюць кіроўцу: «Ці пайшло ўжо мэтро?» Ён у адказ: «Пакуль не». Яму ізноў: «Ці ж вам па тэлефоне скажуць, калі мэтро пойдзе?» А ён: «Не, проста сказалі ўжо выяжджаць на лінію, сядайце».

### 11.45. Вул. Кунцаўшчына (каля ст. «Каменная горка»)

Дзьверы ў пераход зачыненыя. Ля кожнага ўваходу стаяць па два міліцыянты. Ля іх — каля 80 чалавек. Нехта скардзіцца, што не пропускаюць. Міліцыянты кажуць: «Грамадзяне, ня злуйцеся, мы такія ж, як вы».

Новыя лаўкі абсаджаны прагнымі першымі аценщиками новыя станцыі. Плітка на ходніках вытрымана ў шэра-ружова-шэрых колерах. Арнамэнт пакладзены зыгзагамі. Старыя месьцічы наракаюць: «Гэта ж колькі трэба было рэзаць, падганяць, каб вытрымаць такі малюнак!»

Над вуліцай Прытыцкага — расьцяжка «Менскі мэтрапалітэн вітае менчукоў і гасьцей сталіцы на новых станцыях». На зямлі выкладзены дзяржаўны сьцяг зь зялёнай травы, чырвонай цэглы й белага каменю. У руках групы маладзёнаў гадоў па 17—18 — сьцяжкі. Пытаю, хто даў. Адзін шэптам: «Ды мы з БРСМ, нас сюды прывезьлі». Шмат хто прыйшоў зь дзецьмі, народ кіруецца па ходніках у бок цэнтру — да наступнай станцыі «Кунцаўшчына». Перад домам па вул.Прытыцкага, 78 заўважаю першую недаробку — да аптэкі мэтраў 20 вядуць каменьне зь зямлёй. Плітку пакласьці не пасьпелі. Тое самае — крыху далей, ля ўваходу ў начную кавярню «Бездань». Зямлю побач з ходнікамі, відавочна, трамбавалі ўначы перад 7 лістапада, а зранку прайшліся мётламі.

### 12.15. Вул.Ляшчынскага (станцыя «Кунцаўшчына»)

Ля ўнівэрсаму «Заходні» стая галубоў есьць сьвежанасыпанае зерне. На вуліцы пакладзены новы асфальт. Над вуліцай Прытыцкага чарговая расьцяжка: «Менчукі ўдзячныя будаўнікам мэтро». Ля ўваходу ў падземны пераход прымацавана шыльда «Прыемнай паездкі». Людзей запускаюць у падземны пераход, але праз некалькі імгненьняў радасьць зьмяняецца расчараваньнем: уваходы ў мэтро яшчэ замкнёныя. Міліцыянт кажа, што адчыняць да паловы на другую, мо крышку раней.

Пешкі працягваю ісьці ў бок «Спартыўнай» — літаральна праз трыццаць мэтраў ля каналізацыйнага люка заўважаю, што бардзюр дакласьці не пасьпелі і, каб не было відаць з дарогі, утыкнулі туды тры маленькія блакітныя елачкі. Гатовы заключыць пары, стаяць ім там нядоўга.

### 12.30. Вул. Пятра Глебкі (паблізу станцыі «Спартыўная»)

Насустрач адзін за адным праяжджаюць «рарытэты» — аўтобусы №101, 114, тралейбус №33. Гэта іх «разьвітальная гастроль» — з 8 лістапада ім тут не хадзіць. Прыпынак «Вул.П.Глебкі» закаталі ў плітку памерам з палову футбольнага поля. Падземны пераход тут недароблены, ён будзе функцыянаваць толькі месяцы праз два. Таму побач зь ім няма пліткі, пакуль часова пакіданы біты асфальт.

Станцыя «Спартыўная» адчыненая. У пераходзе працуе навюткі кіёск «Белсаюздруку», вісяць чатыры таксафоны. Народ будзённа ўваходзіць у мэтро. Падыходжу да акенца касы: «Мне два жэтоны». А ў адказ: «Праезд бясплатны», але кіяскёрка ўсё ж дае мне жэтоны й рэшту: «Гэта на вечар, калі з цэнтру дадому паедзеце: бясплатна, толькі калі садзісься ў мэтро на новых станцыях».

Аўтаматы-турнікеты не працуюць. На пэроне — штатыў тэлекамэры. Пэрон вузкі, калёны абапал плятформы (як, дарэчы, і на «Каменнай горцы»). Станцыя вытрымана ў шэрых колерах. Дзеці й дарослыя азіраюцца, шумна ўдыхаюць дух сьвежага мэтро. Усе пэроны новых станцый больш доўгія, разьлічаныя пад большую колькасьць вагонаў — з запасам. Але пакуль вагонаў столькі, колькі і было.

На пэроне «Кунцаўшчыны», вытрыманай у жоўта-белых колерах, ля адной з калёнаў, што месьцяцца тут адным радам па цэнтры плятформы, размаўляюць тры сталыя кабеты, хваляць улады. Потым размова збочвае да параўнаньня Беларусі з Расеяй і Украінай: «З Расеі як уяжджаеш у Віцебскую вобласьць, дык нібы ў іншае царства трапляеш». Народ актыўна фатаграфуе. З рэпрадуктара чуваць голас дзяжурнай па станцыі: «Паважаныя пасажыры, фатаграфаваць на станцыі забаронена». Ніхто ня слухае.

На «Пушкінскай» дзьве цёткі заходзяць у вагон. Адна другой: «Ну ўсё, цяпер тут хрэн сядзеш...».

**Пляны**

У Менску працягваюць будаваць падземнае мэтро, тады як у сьвеце будуюць т.зв. «лёгкае мэтро», альбо хуткасныя трамвайныя лініі.

Увосень 2007 г. плянуецца здаць дзьве новыя станцыі на першай лініі — «Барысаўскі тракт» (каля філіялу БНТУ) і «Уручча» (за скрыжаваньнем з вуліцай Русіянава). Ад будаўніцтва станцыі «Смаленская» (ля Палацу лёгкай атлетыкі) пакуль адмовіліся.

У 2011-м да першай лініі дабавяцца яшчэ тры станцыі ў паўднёва-заходнім кірунку — «Грушаўка», «Міхалова» й «Пятроўшчына».

У пэрспэктыве трэцяя лінія зьвяжа Зялёны Луг і Курасоўшчыну. Зь першай лініяй яна будзе перакрыжоўвацца на станцыі «Плошча Незалежнасьці», а з другой — на станцыі «Фрунзэнская». Рух цягнікоў мэтро на першым участку трэцяй лініі (ад станцыі з працоўнай назвай «Жукоўскага» да «Плошчы Бангалор») заплянавана адкрыць у 2015—2020 г. А праз 20 гадоў плянуецца пачаць будаўніцтва чацьвёртай лініі — ад Чыжоўкі да Вясьнянкі. Прычым хутчэй за ўсё над Чыжоўскім вадасховішчам будзе ўзьведзены спэцыяльны мэтрамост. Агульная працягласьць менскага мэтро павялічыцца да 59 км, а колькасьць станцый — да 45-ці. Шмат хто з нас у тым мэтро ўжо не паезьдзіць.

**Менскае мэтро**

цяпер налічвае 2 лініі і 23 станцыі. У Варшаве — 1 лінія й 16 станцый, у Маскве — 11 ліній 164 станцыі, у Лёндане — 273 станцыі.

**За адны суткі**

менскае мэтро цяпер перавозіць каля 1 млн пасажыраў, што складае больш за трацiну ад усіх гарадзкіх пасажырскіх перавозак. Будаўніцтва трох новых станцый мэтро каштавала 338 млрд руб.

**Праезд у менскім мэтро**

каштуе 400 рублёў. Для параўнаньня, адзін праезд у кіеўскім мэтро каштуе 215 рублёў (у эквіваленце), у варшаўскім — 1 560 руб., у маскоўскім — 1 000 руб.

# Дзень уласнай годнасьці

«Няхай пад прымусам, але ўласную рэліквію не аддам!» Так мяне вучылі яшчэ ў савецкія часы. Піша **Ірына Лаўроўская** зь Берасьця.

Сьвіслач…Старадаўняе беларускае мястэчка адразу ўразіла сваімі краявідамі і ўтульнасьцю. Сюды мяне запрасілі на Дзяды 30 кастрычніка.

Наведаўшы сьвяточную імшу ў новазбудаваным касьцёле, я, па даўняй звычцы, пайшла на мясцовыя могілкі. Сярод старажытных пахаваньняў тут ёсьць тое, што выклікае глыбокія пачуцьці патрыятызму і павагі да продкаў — магіла Віктара Каліноўскага, славутага дзеяча й ідэоляга вызвольнага паўстаньня 1863 г. Хацелася прытуліцца да крыжа, падзякаваць Богу за кожнага продка і асабліва за тых, хто прычыніўся да будовы Незалежнасьці Беларусі: братоў Каліноўскіх.

З сабою я прывезла куплены яшчэ дзесяць гадоў таму бел-чырвона-белы сьцяг. Для мяне ён — сымбаль Незалежнасьці і Годнасьці маёй краіны. Гэтым сьцягам я пакрывала труну раптоўна памерлага ў 1996 г. старшыні берасьцейскага БНФ Уладзі Базана, зь ім стаяла пры труне Васіля Быкава. Яго я дастала і пры магіле Віктара Каліноўскага падчас малітвы за ягоную душу. Нібыта магутным уздыхам парыў ветру паднёс сьцяг да самага крыжа.

Увесь час нас фільмавалі двое ў цывільным. Нават падумалася: «Можа, мясцовае тэлебачаньне хоча паказаць сюжэт на Дзяды?» Але ў гэтых абодвух занадта сьціснутыя вусны ды й позірк з-пад ілба...

На выезьдзе са Сьвіслачы нашу машыну спынілі супрацоўнікі ДАІ. Паведамілі, быццам аўтамабіль знаходзіцца ў вышуку і загадалі ехаць за імі.

Высьветлілася, што ініцыятарам за-



трыманьня быў мясцовы РУУС, а найбольш іх цікавіла мая асоба. Галянтны падпалкоўнік Валеры Данчанка дапамог выйсьці з машыны і са смуткам у голасе патлумачыў, што затрыманая я з-за «незарэгістраванай сымболікі».

Да мяне прыставілі сьледчага — капітана Андрэя Манікіна. Яго найбольш цікавілі ўжо людзі, што былі побач са мною на могілках. Прозьвішча, імя, пасада… Колькі чалавек, што рабілі, хто яшчэ меў сьцягі. Кажу: «Памятаю двух цывільных з камэрай, іх прозьвішчы вельмі хацелася б ведаць». Мне ў адказ: «Сакрэтная інфармацыя».

**Супрацоўнікі сьвіслацкага РУУС пры допыце дадавалі: «Гэта ж ня мы да вас маем прэтэнзіі, а заканадаўцы, якія пішуць для нас законы».**

Пытаюцца: «Ці ведаеце, што карысталіся незарэгістраванай сымболікай?» «Ня ведаю. Я трымала ў руках гістарычны сьцяг Беларусі, менавіта гэтыя колеры ўжывалі паўстанцы 1863 г…»

Цягнулася ўсё доўга. Аказалася, што мой сьцяг — «уліка», і яго мусяць у мяне адабраць і, як выглядае, зьнішчыць. Таму пачынаю ідыётнічаць, кажу, што рэліквію паклала ў магілу Каліноўскага (насамрэч шкада, што гэтага не зрабіла). Сьледчы пагражае асабістым надглядам. «Няхай пад прымусам, але ўласную рэліквію не аддам!» Так мяне вучылі яшчэ ў савецкія часы: сьцяг — гэта сьвятое. Адчуваю сябе Зояй Касмадзям'янскай на допыце. Нарэшце высьвятляецца, што супрацоўніца міліцыі, якая праводзіць асабісты надгляд, у нядзелю не працуе.

Калі праз дзве гадзіны допыту мяне вызвалілі, перапісаўшы пашпартныя зьвесткі ды ўзяўшы абяцанак прыехаць на суд, я зь сябрамі наведала сьвіслацкую «Алею Герояў». Алея выклікала яшчэ больш пачуцьцяў, чым пастарунак. У Сьвіслачы ўшанаваны Кастусь Каліноўскі, але побач яго пастаўленыя пачварныя ва ўсіх сэнсах помнікі Леніну і Сталіну, на сумленьні якіх лёсы мільёнаў людзей, у тым ліку, напэўна, і мясцовых жыхароў — зьнішчаных, зьняважаных і выгнаных са сваёй зямлі. Можа, таму супрацоўнікі сьвіслацкага РУУС вельмі часта пры допыце дадавалі: «Ну, вы разумееце, гэта ня мы да вас маем прэтэнзіі, а заканадаўцы, якія пішуць для нас законы». Разумею, але не па-людзку зьневажаць нацыянальныя сымбалі.

На разьвітаньне зь міліцыянтамі працытавала фрагмэнт нядаўна прачытанага эсэ Ісаі Бэрліна «Дзьве канцэпцыі свабоды» : «Улада… мусіць быць абмежавана ў імя незалежнасьці кожнага індывідуўму, паводле атрыманай ім ад нараджэньня годнасьці і свабоды. За найвышэйшыя могуць быць прызнаныя толькі правы чалавека і НІКОЛІ ўлада. Таму ўсе людзі, усё роўна, хто імі кіруе, маюць абсалютнае права адмовіцца паводзіць сябе не па-людзку». Ня кожны мае мужнасьць да гэтага.

# Азадачыў…

— А ягоны старэйшы сын? — выпаліў з імпэтам дзед. — Вось ён і заменіць бацьку ў патрэбны момант! Нездарма ж ён цяпер у Адміністрацыі прэзыдэнта акалачваецца.

Вяртаўся я ад сябра, якому дапамагаў выкопваць бульбу, пасьля давялося яшчэ некалькі дзён і з дровамі павалэндацца. У свой Менск я не сьпяшаўся — пяты месяц быў бяз працы. Бяз дай прычыны кіраўнік нашага ўпраўленьня вырашыў закрыць кар'ер, дзе я працаваў мэханікам.

У зваротную дарогу — а да Менску 180 кілямэтраў — напакавала мне сябрава жонка вялізную сумку харчу. Чаго там толькі ні было: усмажаная курыца, свойская каўбаса, ладны шмат сала і вэнджанай паляндвіцы. Выехаў на ровары а сёмай раніцы, з асалодай круцячы пэдалі «Турыста».

Дзянёк распачаўся цудоўна. Бабіна лета было ў разгары.

Праехаўшы з добрую сотню кілямэтраў, вырашыў перакусіць. Якраз непадалёк было невялікае азярцо. Выбраў зацішны куточак, прысланіў свайго «Турыста» да маладой бярозкі, спаласнуў рукі, твар і пачаў раскладваць прысмакі. Падмацаваўшыся як мае быць, вырашыў адпачыць. І толькі крыху задрамаў, як пачуліся крокі. Убачыў дзеда з пасівелай бародкай, бяз шапкі, у гумовіках і з вудай за плячамі. Блакітнага колеру сарочка была навыпуск і вельмі пасавала да ягоных спартыўных штаноў.

— Ці ня вашае месца я заняў?

— Ды не, адпачывай. Я за каровамі тут прыглядаю, а вуду так узяў, каб час хутчэй бавіць, — адказаў дзед, усеўшыся побач са мною.

Пакуль дзед рыхтаваў вудачку, я дастаў з сумкі сьвежы нумар «Нашай Нівы», што купіў праездам у гарадку, пачаў чытаць.

Дзед закінуў вудачку, зірнуў на мяне і сказаў:

— Забароненую газэтку чытаеш!

— Чаму забароненую? — я адклаў газэту. — Яна прадаецца, як і ўсе, у любым кіёску. Нават сам прэзыдэнт яе праглядае.

— Яно так, але ж там пішуць амаль усё супраць улады! — усьмешка так і ня думала зьнікаць зь ягонага твару.

— Пра ўсё пішуць, — адказаў я. — Вось і пра выбары ёсьць. Хутка будзем новага прэзыдэнта выбіраць.

— Чаму новага?! — усьмешка імгненна зьнікла. — Рыгоравіч застанецца.

— А калі наш «бацька» адмовіцца ўдзельнічаць у выбарах? — падкінуў я правакацыйнае пытаньне. — За каго будзеш галасаваць?

— Такога ня будзе! — рашуча адказаў дзед. — Для чаго ж тады рэфэрэндум быў? Думаеш, што мы ў гэтай глухамані жывём, то нічога і ня ведаем?

— Ну а калі ўсё-такі адмовіцца: здароўе там ці яшчэ што, ня дай бог? — не адступаўся я.

— Тады… — дзед на хвіліну змоўк, як бы зьбіраючыся з думкамі, а пасьля сказаў: — Ня толькі я, але амаль уся наша вёска зробіць так: усіх вашых кандыдатаў выкрасьлім, а Рыгоравіча ўпішам самі сваімі самапіскамі!

— Вось як?! — зьдзівіўся я.

— А што ж ты, мілы чалавеча, думаў! Лепшага кіраўніка не знайсьці! І ў хакей рэжа дай бог кожнаму, і міністраў трасе, і на палях бывае, а якое будаўніцтва разьвёў, га? Дый калі на тое пайшло, — тут ён азірнуўся і ўсьцішаным голасам дадаў, — наш Рыгоравіч можа яшчэ, апроч усяго, і якую дзеўку прыцісьнуць, што ого-го!

І ён задаволена засьмяяўся.

— Я гэта к таму кажу, што сам у маладосьці шыбка да дзевак быў гарачы! Плыты за палякамі па Вяльлі ганяў. Дзевак у мяне тады было не зьлічыць! Аднаго разу ўгледзеў у затоцы ажно чатырох, галяком купаліся. Пахапалі адзеньне і ўрассыпную. А адна засталася. Думаў, брыкацца будзе, а яна на ўсё згодная…

А вазьмі пэнсію. Я ўсё жыцьцё на чыгунцы працаваў, цяпер вось дабавяць, то буду без малога амаль трыста тысяч палучаць. Жыць цяпер можна. Жаль толькі, што гадочкаў мне багата.

Тут нечакана загойдаўся паплавок. Мы насьцярожыліся, але той пад ваду так і не нырнуў. Мне трэба было ехаць, але захацелася выпытаць у дзеда ўсё да канца.

— Дапусьцім, Рыгоравіч выйграе выбары, прабудзе яшчэ пяць год, а хто ж пасьля будзе?

— Ну, да тае пары дажыць трэба! — уздыхнуў дзед. — Хаця, калі ўжо на тое пайшло, то адкажу і на гэтае падкавырыстае пытаньне.

— І хто ж гэта? — я зь цікавасьцю пазіраў на дзеда.

— Будзе той чалавек, які працягне ўзяты Рыгоравічам курс, а з твару будзе падобны на яго.

— Вось як?! Тады, магчыма, вось гэты?..

І тут я працягнуў дзеду газэту са здымкам Паўла Севярынца.

Дзед узяў у рукі газэту і пачаў уважліва разглядваць.

— Фартовы хлопец! Па ўсім відаць — разумны, далёка пойдзе, прама табе скажу. А што да падабенства, то так: і вочы, і вусы, і нос, дый твар як у Рыгоравіча — прадаўгаваты. Але ж чуткі былі пра яго кепскія. І напісана вось тут «Ліст зь лесу». Дзе ён цяпер?

— Пасадзілі. На лесапавале, у глухамані. Вёска Малое Сітна.

— А-а! Успомніў! — дзед ажывіўся. — Падбухторшчык моладзі, так? А вось пасадзілі яго дарэмна.

Такога крутога павароту я ад дзеда не чакаў:

— Чаму?

— Бо ён там зарабляе, як гэта кажуць… Палітычны…

— Капітал! — дадаў я.

— Во-во! — узрадаваўся дзед. — Расьце яго папулярнасьць. А так, — ён зноў уважліва зірнуў на здымак, — гэты хлопец нават міністрам можа стаць. З твару на амэрыканца падобны.

Тут дзед адклаў газэтку, з хітраватай усьмешкай зірнуў на мяне і дадаў:

— Але па-твойму ня выйдзе!

— Чаму?!

— Бо ёсьць чалавек, яшчэ больш падобны на Рыгоравіча, чым твой Севярынец.

— Хто ж гэта?

— А ягоны старэйшы сын! — выпаліў з імпэтам дзед. — Вось ён і заменіць бацьку ў патрэбны момант! Усёк? Нездарма ж ён цяпер у Адміністрацыі прэзыдэнта акалачваецца. Пераймае вопыт… Каб пра гэта даведалася твая хвалёная апазыцыя, то многіх хапіў бы ўдар, а ў другіх мову б адняло. Але яно так і будзе: сын працягне справу бацькі, а той яму парады будзе даваць, калі што ня так заладзіцца.

— І да чаго ж тады дойдзем?

— Да нармальнага жыцьця! — са злой упэўненасьцю ўскрыкнуў дзед. — Яно і цяпер някепска жывецца! Успомніш мяне, я дык не дажыву, але надыдзе час — бронзавы помнік Рыгоравічу паставяць як першаму прэзыдэнту нашай Беларусі.

Я сядзеў аслупянеўшы і маўчаў. Дзедавы словы сьцебанулі так, быццам атрымаў аплявуху ў людным месцы…

Потым падняўся, сьпехам зірнуў на гадзіньнік і сказаў:

— Трэба ехаць, верасень усё-такі, цямнее рана.

— Шчасьлівай табе долі і дарогі! — прамовіў дзед. — Не сумуй! Вось убачыш — усё добра будзе!

Я ўзяў ровар, выбраўся на шашу і паехаў. І адразу ж чамусьці стала сумна на душы. Ня радаваў нават па-летняму цёплы дзянёк.

Я супакойваў сябе тым, што ў кожнага з нас можа быць сваё меркаваньне наконт будучых падзей, як у гэтага незнаёмага мне дзеда. Але ж такое і сапраўды можа здарыцца…

Ужо браліся добрыя прыцемкі, калі я нарэшце быў у сваёй кватэры. Сон ня браў. Магчыма, што і ператаміўся, але хутчэй па іншай прычыне.

А пад самую раніцу прысьнілася мне, быццам сяджу я ў турме. Але ў душы радасьць — дзесяць год адбыў, праз шэсьць дзён на волю. І тут вызывае мяне начальнік лягеру ды са зьедлівай усьмешкай на твары прамаўляе: «Прыйшла на цябе паперына з пракуратуры. Тэрмін твайго зьняволеньня падаўжаецца яшчэ на пяць год!»

«За што?!» — ускрыкнуў я і, страціўшы прытомнасьць, упаў на падлогу.

**Павал Савоська, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас:
а/с 537, 220050, Менск.
e-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.

## Прыстасаванцы з БРСМ

**На першы погляд, яны такія ж, як і мы: маладыя, са сваімі праблемамі, марамі. Іх нават можна зразумець — яны хочуць пасьпяхова закончыць вучобу і дастаць нармальную працу. Але я ніколі не зразумею іх! Я імі пагарджаю!**

Яны — актывісты БРСМ. Робаты з запраграмаваным жыцьцём. Задаволеныя сваім існаваньнем, яны лічаць, што выбралі адзіна правільны шлях. Яны нават пачынаюць у нешта верыць. Але я перакананы: зьменіцца палітычны лад, і пры цяперашніх палітычных поглядах сярод іх застануцца адзінкі. Больш за тое, яны першымі пачнуць даказваць, што заўсёды былі за *нас*. А трэба будзе — пачнуць размаўляць па-беларуску, трэба будзе — стануць нацыяналістамі, камуністамі, сацыялістамі — словам, кім хочаш. Дзеля задавальненьня сваіх прымітыўных мараў яны без ваганьняў пойдуць на гэта.

Для мяне яны заўсёды будуць ворагамі, нягледзячы на тое, якой мовай яны будуць карыстацца пры размове са мной і што казаць. Пакуль жа яны крадуць у нас нашу будучыню!

**Ігар Шчакарэвіч, Кіеў**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**

| | |
|---|---|
| вул.Валадарскага, 16, пак.200 | 227-88-41 |

**Пункты прыёму падпіскі:**

| | |
|---|---|
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224-32-03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200-83-04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230-29-20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243-16-30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264-22-91 |

**Шапікі:**

№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 Інстытут культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

# Сьвята непарадку ў галаве

На гэта раз беларускаму начальніку давялося адчыняць станцыю мэтро пад ангельскім сьцягам. Піша **Аляксей Хадыка**.

Міхаіл Булгакаў у «Сабачым сэрцы» вуснамі героя прафэсара Праабражэнскага заўважыў: «разруха» пачынаецца не ў пад'езьдзе ці на вуліцы, а ў галовах. Але аўтары гэтай разрухі, расейцы, дзень 7 лістапада ўжо не сьвяткуюць. Затое сьвяткуюць беларусы, адмовіўшыся ад Дзядоў, калі разумны абавязак кожнага чалавека — схадзіць на могілкі і прыбраць месца пахаваньня продкаў.

Затое на 7 лістапада — гуляй не хачу. Пі танную гарэлку, хоць заліся. Сёлета, калі «сьвяткаваньне» зацягнулася на тры дні, было брыдка выйсьці ў горад. Вы самі ведаеце, чым у гэтыя дні пахне ў грамадзкім транспарце. Зусім не парфумай.

Затое ў нас беспрацоўя няма! Затое людзям на заводах плацяць сымбалічныя грошы за тое, што яны проста «лічацца» на прадпрыемствах, якія або не працуюць, або працуюць на склад, бо іхняя прадукцыя нікому не патрэбна. Прыклад — менскі мотавэлязавод і далей па сьпісе. Усе пра гэта ведаюць, толькі па БТ не гавораць.

Расейскі палітычны блазан Уладзімер Жырыноўскі некалі заўважыў: Беларусь выратуе снайпэр. Але выратаваць сябе можам толькі мы самі і толькі адным-адзіным спосабам. Калі мы нарэшце зразумеем, што закон — гэта своеасаблівы пакт паміж людзьмі, грамадзкая дамова, правілы, якія нельга парушаць. Іначай пачынаецца «разруха». Калі мы нарэшце скажам самі сабе: ёсьць закон, і мы, беларускі народ, законапаслухмяныя. Але і той, з другога боку ўладнай мяжы, таксама павінен падпарадкоўвацца закону. І ў той дзень, калі гэтую простую ісьціну зразумее, нарэшце, большасьць народу, той, хто цяпер лічыць у нас сябе самым вялікім начальнікам, адразу ім быць перастане. Бо ён ужо столькі разоў законы парушыў, што няцяжка здагадацца, дзе яго месца.

Едучы ў «сьвята разрухі ў галовах» па лініі менскага мэтро, я якраз думаў пра тое, што разруха ў галовах у нас вельмі сымбалічна ўвасабляецца ў назвах вуліц, плошчаў, станцый мэтро. Ну што хацеў сказаць аўтар ідэі, калі настойваў, каб станцыю «Кальварыйскую» назваць «Моладзевай»? Што месца нашай моладзі — на Кальварыйскіх могілках? Я ўжо не кажу пра такія пэрліны назваў, як «Спартыўная» (замест «Ракаўская»). Любоў адной асобы да паказушных будаўнічых праектаў добра вядомая — гэта то палацы спорту, то якія-небудзь нефункцыянальныя бібліятэкі, у якіх кніжкі захоўваць нельга, бо няма ні кліматызацыі, ні іншых тэхнічных умоў. Апошні праект у народзе цалкам слушна клічуць «помнікам чупачупсу». Паглядзіце на гэты дурацкі архітэктурны шэдэўр, і вы адразу ўбачыце, што ён нагадвае любімую дзіцячую карамельку на палачцы.

Зрэшты, гэтаму агульнаму глупству можна абсалютна годна і разумна супрацьстаяць. Вы спытаеце як? Адкажу на адным нядаўнім прыкладзе. Старэйшы сын вядомага палітыка і гісторыка Валянціна Голубева Зьміцер, які жыве ў доме вокнамі на адну з новых станцый менскага мэтро, у час яе ўрачыстага адкрыцьця на сваім уласным бальконе вывесіў сьцяг Ангельшчыны — чырвоны крыж на белым фоне. Весялосьць у тым, што пільныя міліцыянты прынялі сьцяг за «забаронены» беларускі — бел-чырвона-белы і пачалі малаціць у дзьверы.

Як вядома, цяперашні беларускі начальнік вельмі ня любіць усё сапраўды беларускае. Таму замест станцыі «Кальварыйская» у нас ёсьць «Моладзевая», таму таксама маем замест добрага імя Скарыны праспэкт Незалежнасьці. Можна сказаць, незалежнасьці ад розуму, бо пры гэтым само імя Скарыны пераносіцца і накладаецца на іншую менскую вуліцу з рэдкай для беларускай сталіцы захаванай пракаветнай назвай — Старабарысаўскі тракт. Затое якая цудоўная прагаворка — праспэкт Пераможцаў! Лепш было б адразу назваць: «праспэкт Пераможцы». Праўда ў тым, што ён сапраўды пераможца, акрамя яго хіба што ўжо ніхто. Але на гэты раз беларускаму начальніку давялося адчыняць станцыю мэтро ледзь не пад бел-чырвона-белым сьцягам. Яго проста прымусіў больш разумны за яго чалавек падпарадкавацца закону. Не было іншага выйсьця.

Таму і трэба зразумець, што разруха скончыцца роўненька ў той дзень, калі мы пераможам яе ва ўласных галовах. Дык з Богам!

Калісьці быў папулярны тэзіс, што дэмакратыя да нас прыйдзе з усходу, адаптаваная расейцамі. На жаль, пакуль з усходу да нас прыходзіць амаль што адно глупства. Гэта якую трэба мець уласную галаву ды якіх палітычных дарадцаў, каб абвясьціць нацыянальным сьвятам дзень перамогі над як бы «палякамі» ў пачатку XVII ст.! Нічога ня выйграўшы палітычна, новым сьвятам Пуцін ухітрыўся пасварыцца і з палякамі, і зь беларусамі, і зь літоўцамі, і з украінцамі. Бліскучае глупства. Каб ацаніць яго глыбіню, уявіце сабе наступны палітычны праект. Дапусьцім, у Беларусі абвяшчаюць сьвятам 8 верасьня, дзень Аршанскай бітвы, і рэтрансьлююць пераможныя рэляцыі на ўсю Расею, падключыўшы трансьляцыю БТ на ўсю яе тэрыторыю. Глупства? Прыкладна такое, якое цяпер зрабілі ў Расеі. Гэтай нешчасьлівай краіне, як і Беларусі, таксама не шанцуе з начальнікамі, прычым гісторыя там чарговы раз паўтараецца.

Памятаеце імпэратара Паўла, які вызваліў зь някволі Касьцюшку, паслабіў ганеньні на ўніятаў і каталікоў (сам быў генэралам Мальтыйскага ордэну), фактычна крочыў шляхам эўрапеізацыі, зьмякчэньня рэжыму імпэрыі. За што і быў забіты, а таленавітыя расейскія гісторыкі-байкапісцы стварылі яму вобраз блазна. Затое салдафон Мікалай I, душыцель вызваленчага паўстаньня 1830—1831 г. у Польшчы і Беларусі, у расейскай гісторыі — герой. Праўда, Пуцін не дацягвае нават да яго маштабу. Так што ня будзем моцна перажываць — у многіх сэнсах наша сытуацыя лепшая за расейскую.



**Аляксей Хадыка** — мастацтвазнавец, рэдактар часопісу «Спадчына».

## «Можна доўга спрачацца аб гісторыі...»

**Працяг са старонкі 2.**

Сьвяткаваньне прайшло як звычайна. На вуліцах павесілі выцьвілыя сьцягі, па радыё выступілі спэцыялісты па гісторыі, якія расказалі аб унікальнасьці падзеі. Навінкаю стаў сьвяточны канцэрт, паказаны па АНТ.

На арганізацыю яго былі кінуты ўсе сілы маладой беларускай папсы, што на новы лад павінны былі перасьпяваць песьні рэвалюцыйнай эпохі. На сцэне перад гледачамі прайшоў паноптыкум піянэраў, камсамольцаў, калгасьнікаў, камісараў і камісарак, якія вылузваліся са скуры, каб як мага больш рэалістычна адлюстраваць «гераізм грамадзянскай вайны і першых гадоў савецкага будаўніцтва».

Але каму патрэбна такое сьвяткаваньне, што сымбалізуе, напрыклад, выкананьне групай «Топлес» песьні «Вот кто-то с горочки спустился» ў рэпаўскіх матывах або паўголыя дзеўкі, якія ў будзёнаўках скачуць па сцэне пад гукі ледзь не «Інтэрнацыяналу»? Дзе галасы вэтэранаў, якія, здавалася б, павінны былі абурыцца і сказаць: «Мы не дазволім!»?

Адказ просты: улады праводзяць у жыцьцё эрзац-ідэалёгію, якая, па сутнасьці, зьяўляецца формай старой камуністычнай ідэалёгіі. Менавіта формай, паколькі былыя агітатары з таварыства «Веды», якія цяпер кіруюць краінай, ужо ў пару сваёй маладосьці не ўяўлялі змаганьня за справядлівае камуністычнае грамадзтва, у якое верылі многія, хто загінуў у 1930-х пад сталінскай сякерай. Цяпер яны ахвяруюць ня толькі зьместам, але і формай. Выродлівае спалучэньне папсы, шансону і сацрэалізму пасаджана на тачанку толькі дзеля таго, каб прыцягнуць увагу маладзейшага пакаленьня беларусаў.

Такая ідэалёгія непазьбежна памрэ, гэта толькі справа часу. Яе ўжо, уласна, няма. Найгоршае, аднак, тое, што яна ўяўляе небясьпеку для разьвіцьця беларусаў як эўрапейскай нацыі. Мала таго што на другі плян ізноў адсоўваецца беларушчына, але й усялякая рэальнасьць падмяняецца нейкай квазірэальнасьцю, дзе рэпэры ходзяць у будзёнаўках, салдаты часоў Другой сусьветнай танчаць хіп-хоп, а калгасьніца ператвараецца ў стрыптызэрку.

У больш прыстойным, прынамсі маральна, яшчэ савецкім стылі на гэтым канцэрце прагучала толькі выступленьне Мікалая Скорыкава. «Ты только будь, пожалуйста, со мной, товарищ правда», — сьпяваў ён.

Нядаўна мне трапіла ў рукі кніга ўспамінаў пра Мікалая Астроўскага: «Астроўскі вернецца да нас як прыклад чалавечай мужнасьці і адданасьці сваім ідэалам». Гледзячы канцэрт 7 лістапада, я ўспомніў гэтыя словы і падумаў: «Што б зрабіў з гэтай кампаніяй Паўка Карчагін, калі б хворы і паранены, бяз вока, проста з поля бою трапіў на гэтае мерапрыемства?..»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У менскай рэстарацыі «Эрыдан» 3 лістапада, на наступны дзень пасьля Дзядоў, адбыўся першы этап конкурсу стрыптызу «Жар-птушка». Наступны пройдзе 10 лістапада. Першы быў жаночы, другі будзе мужчынскі.**

# Ня сілай, а розумам

Гісторыкі дзівяцца: у 1920 годзе упяцёра меншае польскае войска здолела спыніць бальшавіцкую ваенную машыну. Бо Пілсудзкі меў такую дакладную інфармацыю пра ворага, якой да яго ня меў ніводзін палкаводзец ні ў адной вайне. Гутарка з польскім гісторыкам **Грэгажам Новікам** пра невядомыя старонкі польска-савецкага канфлікту. Вайны, якая абумовіла лёс Беларусі на XX стагодзьдзе. Яна двойчы пракацілася цераз краіну і пакінула па сабе пасечаны папалам край. Той падзел адгукаецца ў нас дагэтуль.



«GAZETA WYBORCZA»

Юзаф Пілсудзкі ўмеў перамагаць малымі сіламі.

## Унікнуць у сытуацыю праціўніка

**— У 1920-м над Віслай здарыўся цуд?**

— Я не люблю выразу «цуд над Віслай». Гэта прапагандысцкі штамп, выдуманы праціўнікамі Пілсудзкага. Яны ўнушалі, што Варшаву ад Тухачэўскага выратавалі ня талент палкаводцаў, сіла і патрыятызм арміі, а толькі ўмяшаньне вышэйшай сілы. Але прызнаюся, што і мне польска-бальшавіцкая вайна часам здавалася ланцугом звышнатуральных падзей. Так, 5 сакавіка 1920 г. польская армія ажыцьцяўляе складаную Мазырскую апэрацыю. Уладзіслаў Сікорскі (у той час камандуючы Палескай брыгадай, затым — 3-й і 5-й арміямі. — **«НН»**) атрымаў загад разьдзяліць два расейскія франты — у Беларусі і ва Ўкраіне. Адносна невялікімі сіламі ён атакаваў бальшавіцкія атрады на Палесьсі.

**— Ваенны геній.**

— І гэта таксама. Іншы прыклад. Верасень 1920-га. Пачатак вялікай бітвы над Нёманам. Выдзеленая польская групоўка абышла бальшавіцкія пазыцыі праз тэрыторыю Літвы і спынілася ў Рудніцкай пушчы. Цярпліва чакае, пакуль саветы пачнуць адступаць. Як толькі прыходзіць загад аб вяртаньні для расейскага боку, нашы рушаць на іх тылы.

**— Вы ня верыце ў геній палкаводцаў?**

— На вайне ўсё вырашае выпадак. У 1920 г. магчымасьці авіяцыйнай разьведкі былі абмежаваныя. Дакладна было невядома, дзе непрыяцель і што ён зьбіраецца рабіць. Таму штабы стараліся ўнікнуць у сытуацыю праціўніка і прадказаць яго дзеяньні. Манэўраная вайна тады нагадвала паядынак, у якім у праціўнікаў завязаны вочы. Але нашы войскі ўвесь час пасьпяхова атакавалі ці ўхіляліся ад удару. Нашы штабоўцы ведалі значна больш, чым нам здавалася.

## Перамога чалавечага розуму

**— Адкуль такія высновы?**

— Я працую ў групе на чале з палкоўнікам Маркам Тарчыньскім, якая вывучае і выдае дакумэнты польска-савецкай вайны. Калі мы чыталі штодзённыя «Зводкі аб непрыяцельскай сытуацыі», што перадавала польскае камандаваньне, то задумаліся: адкуль такая вялікая колькасьць зьвестак пра Чырвоную армію? Потым я натрапіў на дакумэнт канца ліпеня 1920 г. Найдраматычнейшы момант вайны — а тут шэсьць польскіх радыёстанцый зарыентаваны выключна на перахват.

**— Што тут дзіўнага?**

— Ва ўсёй польскай арміі было ўсяго 26 палявых радыёстанцый, і раптам шэсьць зь іх сталі выкарыстоўвацца выключна для прыёму! Гэта нерацыянальна! Бо радыёстанцыі служаць перш за ўсё для падтрыманьня сувязі паміж вайсковымі адзінкамі! Усё выглядае па-іншаму, калі прыняць гіпотэзу, што гэтыя шэсьць радыёстанцый ажыцьцяўлялі перахват апэрацыйнай карэспандэнцыі Першай коннай арміі С.Будзённага, што мелася з паўднёвага ўсходу (у савецкай і беларускай гістарыяграфіі — Паўднёва-Заходні фронт. — **«НН»**) атакаваць польскія войскі, якія групаваліся пад Вепшай. Калі гэтыя шэсьць радыёстанцый былі ўключаны на перахват, значыць, мы мелі магчымасьць прынятыя радыёдэпэшы расшыфраваць. Тады я меў ужо амаль 100-працэнтную ўпэўненасьць. Не хапала доказаў.

> Пілсудзкі казаў, што пытаньне незалежнай Украіны — для Польшчы справа стратэгічная.

**— І Вы іх знайшлі.**

— Здарыўся чарговы цуд. Палкоўнік Зыгмунт Козак з Цэнтральнага ваеннага архіву расказаў мне пра яшчэ не апрацаваныя дакумэнты польскай ваеннай разьведкі 1920 г. Там былі расшыфраваныя пры дапамозе Бюро шыфраў польскага Другога аддзелу Генштабу савецкія радыёдэпэшы. Цяжка ўявіць сабе больш пераканаўчы довад таго, што польскія крыптааналітыкі ўзламалі савецкія шыфравальныя ключы.

## Пішацца «кепска» — чытаецца «добра»

**— Колькі такіх дакумэнтаў захавалася?**

— Некалькі тысяч расшыфраваных дэпэш. Мяркую, што іх было значна больш, але ня ўсе захаваліся. Так, гісторыкі, што займаюцца вайной 1920 г., згадвалі, што наша разьведка перахоплівала інфармацыю і дакумэнты бальшавікоў, але лічылася, што гэта былі адзінкавыя выпадкі. Да таго ж звычайна ўказвалася, што яны былі адкрытыя і толькі месцамі шыфраваныя.

Тым часам знойдзеныя дакумэнты сьведчаць, па-першае, аб тым, што нашы крыптааналітыкі здолелі ўзламаць расейскія шыфры. Па-другое — што разьведка праціўніка вялася мэтадычна: ажыцьцяўляўся ўлік непрыяцельскіх вайсковых адзінак, асабовага складу, узбраеньня, настрояў. Зьвесткі разьмяркоўваліся па папках у адпаведнасьці з падзелам на франты, арміі і дывізіі. Дэпэшы паходзяць з розных узроўняў камандаваньня — ад штабоў дывізій, карпусоў і армій да камандзіраў франтоў, але трапляюцца таксама карэспандэнцыі найвышэйшага ўзроўню — камандаваньня Чырвонай арміі. Гэта выклікае забаўныя параўнаньні.

**— Што пішуць тыя, хто на самым версе, а што тыя, хто ніжэй?**

— Так. У калекцыі поўна расшыфраваных дэпэш Дняпроўскай флятыліі 1919—1920 г. Камандзіры ніжэйшага зьвяна дакладваюць, што пануе тыф, голад, салдаты ня маюць абмундзіраваньня, бунтуюць. Яны ня хочуць ісьці ў бой, бо няма ботаў, а на дварэ лістапад. Партызанскія атрады, утвораныя сялянамі, атакуюць патрулі, якія рэквізуюць жывёлу. Афіцэры лютуюць, што няма чаго есьці, а ім тым часам загадваюць правесьці «партыйны тыдзень» з нагоды гадавіны рэвалюцыі. А які рапарт ідзе да вышэйшага камандаваньня? Што настроі выдатныя, баявая гатоўнасьць высокая, а мясцовае насельніцтва падтрымлівае бальшавікоў, бо знаходзіцца пад прыгнётам польскіх паноў.

## Добрыя ўзломшчыкі паходзяць з поліэтнічных краін

**— Мы ведаем, хто расшыфраваў код «Энігма» — супэрскладаныя нацысцкія коды. Але хто ўзламаў шыфры бальшавікоў?**

— Першым тут варта згадаць Юзафа Рыбака — да Першай сусьветнай вайны капітана разьведкі аўстра-вугорскай арміі. Пілсудзкі разгледзеў у ім паляка-патрыёта і, калі паўстала незалежная Польшча, забраў Рыбака зь Вены і паставіў на чале Цэнтральнага камандаваньня польскай ваеннай разьведкі. У дапамогу назначыў аднаго са сваіх найбліжэйшых паплечнікаў — публіцыста, перакладчыка, у будучыні міністра фінансаў Ігнацыя Матушэўскага. Гэтыя двое разам утварылі грымучую сумесь. Падпалкоўнік Рыбак завэрбаваў у польскую разьведку маёра Караля Балдэскула. Падчас Першай сусьветнай вайны ён быў шэфам радыёразьведкі дзяржаў Траістага саюзу на Ўсходнім фронце.

**— Балдэскул — нейкае дзіўнае прозьвішча.**

— Румынскае, але ён нарадзіўся ля Каламыі (украінскае Прыкарпацьце. — **«НН»**). Можа, па паходжаньні румын, можа, гуцул, а можа, усяго патроху? У 1918 г. па распадзе Аўстра-Вугоршчыны ён абвясціў сябе палякам. Валодаў польскай, украінскай, нямецкай, францускай мовамі, не валодаў толькі расейскай.

**— У камандаваньні арміі радыёразьведка і крыптаграфія апынуліся на належным узроўні.**

— Гэта праўда. Напрыклад, геніяльны матэматык, капітан Віктар фон Маршэсэці ўзламаў падчас Першай сусьветнай вайны большасьць шыфраў царскай арміі. Балдэскул быў тады правай рукой палкоўніка Макса Ронге, кіраўніка аўстра-вугорскай разьведкі. Падчас Другой сусьветнай вайны большасьць афіцэраў аўстрыйскай разьведкі сустрэліся ў Абвэры (нямецкая разьведка. — **«НН»**), а Макс Ронге апынуўся ў канцлягеры Дахаў, бо Гітлеру служыць не хацеў.

Шматнацыянальная імпэрыя была цудоўным асяродзьдзем для крыптолягаў і крыптааналітыкаў.

**— Хіба можа быць нейкае спэцыяльнае асяродзьдзе для крыптолягаў?**

— Спэцыяліст па гісторыі крыптаграфіі, прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту Дэвід Каган, аўтар кнігі «Ўзломшчыкі кодаў», сьцьвярджаў, што добрыя спэцыялісты паходзяць з поліэтнічных і мультыкультурных краін. Бо там мусяць быць унівэрсытэты з высокім узроўнем выкладаньня матэматыкі і сяго-таго яшчэ: там павінна пісацца музыка. Паводле Кагана, найлепшыя ў крыптаграфіі — італьянцы, аўстрыйцы і палякі. Бо матэматыка — гэта лягічнае мысьленьне, а музыка — гэта сфэра ўяўленьня.

**— А што здарылася з Балдэскулам?**

— У 1922 г. ён пайшоў у адстаўку — і зьнік. Апошняя згадка аб ім тычыцца 1934 г., калі Балдэскул быў афіцэрам запасу. Немцы ў 1942 г. намагаліся яго адшукаць, але так і не знайшлі. Можа, памёр, а можа, уцёк.

## Геній расшыфроўкі

**— Вернемся да зараджэньня**

**Доктар Грэгаж Новік** — намесьнік дырэктара Вайсковага бюро гістарычных дасьледаваньняў, галоўны рэдактар штоквартальнага часопісу «Przeglad historyczno-wojskowy» («Гістарычна-вайсковы агляд»), член групы па вывучэньні дакумэнтаў польска-савецкай вайны 1919—1920 г., аўтар кнігі «Перш чым узламалі «Энігму»... Польская радыёразьведка падчас вайны з бальшавіцкай Расеяй 1918—1920 г.», прэзэнтацыя якой адбылася сёлета.

**радыёразьведкі.**

— Увесну і ўлетку 1919 г. Балдэскул стварыў сетку радыёпраслухоўваньня. Завэрбаваў сваіх калег з аўстрыйскай разьведкі. Але была праблема: бракавала крыптааналітыка — спэцыяліста па шыфрах, які ведаў бы расейскую мову. Неўзабаве падвярнуўся кандыдат. Зваўся Ян Кавалеўскі, паходзіў ён з Лодзі, дзе скончыў гандлёвы тэхнікум. Перад I сусьветнай вайной вывучаў хімію ў Льежы (Бэльгія). Падчас вайны служыў у расейскіх інжынэрных войсках, затым быў кіраўніком аднаго з атрадаў Польскай вайсковай арганізацыі ва Ўкраіне. Ваяваў пад Каневым, у дывізіі генэрала Жалігоўскага зрабіўся начальнікам разьведкі. Ужо тады цікавіўся ўкраінскімі шыфрамі на Падольлі. У жніўні 1919 г. трапіў у разьведвальнае бюро.

**— Адкуль у хіміка зацікаўленасьць крыптаграфіяй?**

— Гэта быў незвычайны лінгвістычны і матэматычны талент. Кавалеўскі ведаў французскую, нямецкую, расейскую і ўкраінскую мовы. Меў неймаверную фатаграфічную памяць. Калі ў канцы 1920-х ён стаў аташэ ў СССР, па памяці маляваў ваенную тэхніку на парадах на Краснай плошчы. З усімі падрабязнасьцямі.

Ужо ў эміграцыі ў Вялікабрытаніі — калі адзначалася стагодзьдзе паўстаньня 1863 г. — Кавалеўскі расшыфраваў карэспандэнцыю паўстанцкага ўраду Р.Траўгута. Гэтыя шыфраграмы ляжалі ў архіве з XIX ст., і ніхто ня мог іх прачытаць — яны былі зашыфраваныя надзвычай складаным «нязломным» кодам, ключ да якога загінуў.

Талент Кавалеўскага, магчыма, не праявіўся б, калі б ня шлюб аднол дзяўчыны. У жніўні 1919 г. начное дзяжурства ў шыфравальнай сэкцыі нёс сябар Кавалеўскага паручнік Станіслаў Срока, але ў яго сястры было вясельле. Кавалеўскі згадзіўся падмяніць. Ноччу пайшлі матэрыялы з радыёпраслухоўваньня, сярод іх — адкрытыя і зашыфраваныя расейскія дэпэшы. Гэта былі дэпэшы, зашыфраваныя ў форме лічбавых груп. Як быццам нехта перасылаў перамяшаныя нумары з тэлефоннай кнігі, але бяз прозьвішчаў. Кавалеўскаму было нудна на тым начным дзяжурстве, і ён вырашыў заняцца нечым накшталт крыжаванкі. Ён узяў за аснову расейскае слова «дивизия» і пачаў прымяраць яго да асобных фрагмэнтаў шыфраграм.

**— Чаму менавіта «дивизия»?**

— Тройчы паўтараецца літара «і». Такім чынам яму ўдалося знайсьці галосную і тры зычныя. Гэтыя літары цяпер трэба было накласьці на шыфравальную рашотку, што нагадвала табліцу множаньня. Расейскі шыфр быў даволі просты, яго асноўныя прынцыпы зьявіліся ў XVII—XVIII ст. Пазьней належала адпаведным чынам расьпісаць вялікую партыю шыфраграм на групы і дасьледаваць іх так званым мэтадам частотнасьці, г.зн. параўнаць частату асобных сымбаляў у шыфраграме з характэрнай для дадзенай мовы частатой ужываньня тых ці іншых літар.

Пад раніцу Кавалеўскаму ўдалося ўзламаць першы шыфравальны ключ. Ён пахваліўся знаёмым — і ў штабе пашырылася вестка, што ёсьць такі зух, які дзеля забавы ламае расейскія шыфры. Так у першую шлюбную ноч пані Срокі нарадзілася новая польская школа крыптааналізу.

Кавалеўскі неўзабаве ўзламаў ключы ня толькі бальшавікоў, але і белагвардзейцаў, украінскія ключы, а пазьней зацікавіўся чэхаславацкімі, літоўскімі і перш за ўсё нямецкімі шыфрамі. З часам ён прыцягнуў да працы прафэсараў Львоўскага і Варшаўскага ўнівэрсытэтаў. Пад канец вайны польскія шыфравальшчыкі разгадвалі расейскія дэпэшы хутчэй, чым самі расейцы.

### Біць там, дзе наймацней забаліць

**— Якое значэньне меў узлом шыфраў?**

— Гэта можна параўнаць з гульнёй у покер, калі гульня ідзе на жыцьцё, а за сьпінай аднаго з гульцоў паставілі люстра. Люстра — гэта радыёразьведка. Зразумеўшы гэта, я па-іншаму паглядзеў на ход вайны 1920 г. Цяпер я ведаю ня толькі вынікі, але й матывы польскіх рашэньняў. Напрыклад, знакамітая нарада ў Бэльвэдэры 15 верасьня 1919 г., у якой — як сьцьвярджае біяграфія Пілсудзкага — упершыню зьявілася ідэя вырашальнага бою з Расеяй, падтрымкі ва Ўкраіне Пятлюры ды пазьнейшага паходу на Кіеў. Удзельнічалі ў ёй начальнік штабу, палкоўнік Станіслаў Галер (увесну 1940 г. генэрал Станіслаў Галер будзе расстраляны НКВД у Харкаве. — **«НН»**), маёр Ігнацы Матушэўскі, блізкі паплечнік Пілсудзкага Багуслаў Медзіньскі (пазьней — міністар ва ўрадах Пілсудзкага і Бартля, апошні маршалак перадваеннага Сэнату. — **«НН»**), які пакінуў запіс з той сустрэчы.

**— Гэта тады Матушэўскі ў зўфарыі сказаў, што мы можам**

Для Сталіна польска-савецкая вайна была як каляніяльная.

**нават ісьці на Маскву? Шмат хто з гісторыкаў пісаў, што польскія палітыкі страцілі галаву.**

— Матушэўскі ня быў схільным да экзальтацыі. Размова адбылася 15 верасьня. З дакумэнтаў вынікае, што першая вялікая партыя савецкіх дэпэш Паўднёвай групоўкі XII арміі была расшыфраваная 12 верасьня — і якраз тады Кавалеўскі падрыхтаваў рапарт для начальніка Генштабу. Пра ўскрыцьцё шыфраў праціўніка мусіла быць праінфармаванае вышэйшае начальства — менавіта тыя людзі, якія ўдзельнічалі ў нарадзе 15 верасьня. Якраз тады да іх дайшла інфармацыя — маем люстэрка, ведаем, што робіць праціўнік. Пілсудзкі і ягоныя суразмоўнікі ведаюць, што вайна з бальшавіцкай Расеяй непазьбежная, і вырашаюць, як гэтае люстра выкарыстаць.

**— Матушэўскі гаворыць: мы такія моцныя, што можам ісьці на Маскву.**

— Пісудзкі адказаў: «На Маскву ня пойдзем, бо што нам у Маскве рабіць? Маскалі застануцца маскалямі. Мы мусім ударыць там, дзе ім наймацней забаліць». Тым чулым месцам Расеі была ў той час — і застаецца па сёньня — Украіна.

**— Для Польшчы ўзьнікненьне незалежнай Украіны — справа жыцьця і сьмерці. Зь Пераяслаўскай рады распачаўся працэс заняпаду Рэчы Паспалітай і ўмацаваньня імпэрскай магутнасьці Расеі.**

— У 1923 г. на лекцыі ў Вышэйшай ваеннай школе Пілсудзкі сказаў, што пытаньне незалежнай Украіны — для Польшчы справа і палітычная, і стратэгічная. Па-першае, без Украіны Расея ня будзе вялікай дзяржавай, па-другое, Польшча ня ў стане ўтрымаць разьлеглага амаль на дзьве тысячы кілямэтраў фронту з Расеяй. Калі ўзьнікне незалежная Украіна, частку гэтага фронту яна возьме на сябе. Памятаеце, што сказаў В.Юшчанка: няма вольнай Украіны бяз вольнай Польшчы, як няма вольнай Польшчы бяз вольнай Украіны? Тады было тое самае. Толькі цяпер ёсьць шанец, што ўдасца рэалізаваць запавет маршала Пілсудзкага.

**— Але з Украінай годам раней палякі вялі крывавую вайну за Львоў.**

— Украінцаў нацыянальныя дэмакраты (эндэкі) і большая частка грамадзтва называлі тады «гайдамакамі». Мала хто сур'ёзна ставіўся да іх прэтэнзій на дзяржаўнасьць. Але Пілсудзкі развапжае так: нават нашы самыя крывавыя сутычкі тычыліся мяжы — далей на ўсход ці далей на захад яе пасунуць. Гаворка ішла пра тое, каму будзе належаць Львоў ці Камянец-Падольскі (на іх прэтэндавалі палякі) або Хелм, Пшэмысьль (на якія прэтэндавалі ўкраінцы). У канфлікце з Расеяй пытаньне заўсёды стаяла значна глыбей — пра існаваньне цэлага народу, пра зьвядзеньне Польшчы да ролі блізкага замежжа — сфэры ўплываў, «прывісьленскага краю».

### Стратэгія Пілсудзкага

**— Сапраўды Пілсудзкі ведаў усё? Адкуль такая ўпэўненасьць?**

— Калі польская радыёразьведка ажыцьцяўляла перахват ва Ўкраіне і ўскрыла першыя шыфры, чаму б ёй не зрабіць гэтага ў Беларусі? І тут і там расейцы прымянялі аднолькавыя шыфры. Начальнікам разьведкі літоўска-беларускага фронту быў палкоўнік Юзаф Бэк — пазьней кіраўнік МЗС (1932—1939). Ён у студзені 1920-га тэлеграфаваў у Вярхоўнае камандаваньне аб «узрослай актыўнасьці савецкіх станцый», аб «прыёме цэлай масы радыёдэпэш несумненна апэратыўнага зьместу» і нагадваў пра неабходнасьць накіраваць у камандаваньне фронту спэцыялістаў па радыёразьведцы.

Плюс інфармацыйныя паведамленьні II аддзелу Вярхоўнага камандаваньня аб сытуацыі на ўсіх франтах, уключана зь літоўска-беларускім, з пачатку 1920 г. робяцца надзвычай дэталёвыя. Падрабязна падаецца асабовы

Працяг на старонцы 18.




**Паручнік Ян Кавалеўскі, афіцэр польскай разьведкі ва Ўкраіне, кіраўнік выведкі ў генэрала Жалігоўскага. Арганізатар і кіраўнік Другога аддзелу разьведкі Бюро шыфраў. Геній крыптааналітыкі, аўтар посьпехаў ва ўзломе расейскіх шыфраў.**



**Фатаздымкі з кнігі Гжэгажа Новіка «Перш чым узламалі «Энігму»… Польская разьведка падчас вайны з бальшавіцкай Расеяй 1918—1920 г.».**




**Апаратура Цэнтральнай радыётэлеграфнай станцыі ў Варшаве пасьля мадэрнізацыі ў 1919 годзе.**




**Радыёстанцыі E-10 з Францыі. Яны складалі — поруч з трафэйнай расейскай, аўстрыйскай і нямецкай апаратурай — 40% абсталяваньня палявых радыётэлеграфных станцый Войска польскага ў 1919—1920 гадах.**

# Ня сілай, а розумам

Працяг са старонкі 17.

склад да ўзроўню палка, роды ўзбраеньня, калібры артылерыі, ход бягучых перагруповак, узаемазамен, папаўненьняў.

**— Гэтую інфармацыю маглі сабраць польскія разьведчыкі або яна магла паступіць ад дэзэртэраў.**

— Шмат інфармацыі польская разьведка атрымлівала ад салдат — палякаў і расейцаў, якія перайшлі на процілеглы бок. Але так званая асабовая разьведка не магла раўнамерна ахапіць усяго фронту. Колькі мусіла быць шпіёнаў, каб польскі бок ведаў, хто камандуе, хто зьяўляецца палітычным камісарам, у якім стане знаходзяцца вайсковыя адзінкі, якія пляны? Групаваньне расейскіх войскаў на фронце з таго часу ідэнтычна адлюстроўвалася на расейскіх і польскіх штабных картах…

Калі я дасьледаваў дакумэнты, падумаў: «Калі б Ленін і Троцкі, Сталін і Будзённы, а таксама камандуючыя франтамі ў Беларусі й ва Ўкраіне былі агентамі польскай ваеннай разьведкі, яны і то не былі б такія эфэктыўныя, бо ня мелі такіх дэталёвых зьвестак». Пілсудзкі меў такую дакладную інфармацыю, якой да яго не валодаў ніводзін палкаводзец ні ў адной вайне. І ён выдатна выкарыстоўваў яе ня толькі ў ваенных дзеяньнях, але і ў прыняцьці палітычных рашэньняў.

**— Як?**

— Мы падыходзім да падзеі, якая гісторыкамі — у залежнасьці ад іх сымпатый — трактавалася ці як геніяльны ход, ці як зьбег акалічнасьцяў. Пад велізарным палітычным націскам Пілсудзкі ў сакавіку 1920 г. паведаміў расейскаму боку, што мірныя перагаворы з бальшавікамі распачне, але ў якасьці месца іх правядзеньня прапанаваў Барысаў за Менскам. Тыя адказалі: можа, сустрэнемся ў любым іншым месцы, але толькі не ў Барысаве. Пілсудзкі адказвае: Барысаў — менавіта такое «любое месца».

**— Пра што гаворка?**

— У студзені 1920 г. Пілсудзкі пачаў атрымліваць інфармацыю, што камандаваньне Чырвонай арміі перамяшчае на польскі фронт атрады з Каўказу, з-над Дону, Уралу. Дзеля чаго гэтая канцэнтрацыя? Каб пачаць мірныя перагаворы? Пілсудзкі вырашыў гэта скарыстаць. Польская разьведка ўстанавіла, што ў Барысаве сканцэнтравана цяжкая артылерыя. Такая сіла выкарыстоўвалася для прарыву фронту, а ўтаіць яе было досыць цяжка. Барысаў злучаны чыгуначнай магістральлю са Смаленскам, і на гэтай магістралі ў сакавіку 1920 г. зьявіліся два новыя ангельскія бронецягнікі, адбітыя ў Дзянікіна.

Пілсудзкі, кажучы бальшавікам: «Панове, паразмаўляем пра мір у Барысаве», — гаворыць як у покеры: «Увага, правяраю». Праціўнік адказаў: «Пас». Тады Пілсудзкі пераканаўся, што Троцкі і Ленін толькі пускаюць пыл у вочы з сваім мірам, а самі рыхтуюцца да вайны.




IBANKKADR.COM.PL

Польскія плякаты.

## Пілсудзкаму і беларусам не хапіла трох дзён

**— Аднак расейцы да сёньня настойваюць, што хацелі міру.**

— У 1990-я Анджэй Новак зь Ягелёнскага ўнівэрсытэту знайшоў у расейскіх архівах датаваны сярэдзінай студзеня 1920 г. расейскі плян вайны з Польшчай. Пілсудзкі меў рацыю. Ведаючы пра канцэнтрацыю бальшавіцкіх войскаў, ён мусіў сам нанесьці папераджальны ўдар. 25 красавіка пачаўся Кіеўскі паход.

**— Пілсудзкі атакаваў на поўдні. Рушыў у напрамку Кіева, тады як савецкія сілы пад камандаваньнем Тухачэўскага канцэнтраваліся ў Беларусі.**

— Ён не памыліўся. Польска-ўкраінскі наступ на Кіеў пачынаецца 25 красавіка. Двума днямі раней Пілсудзкі атрымлівае даня-

> Войны, як і партыя ў покер, не выйграюцца з дапамогай аднаго люстэрка, для перамогі патрэбны яшчэ моцныя карты.

сеньне радыёразьведкі, што ў раёне Віцебск—Ворша—Полацак праслухоўваньне зарэгістравала пяць новых бальшавіцкіх радыёстанцый, разьмешчаных у глыбокім тыле. Тады яны яшчэ не працавалі, толькі ўтваралі сетку. На наступны дзень Вярхоўны галоўнакамандуючы даведаўся, што там дзейнічае ўжо ня пяць, а дзесяць станцый — што, з усяго відаць, сьведчыла пра два камандаваньні армій і каля васьмі дывізій. Гэта былі новыя сілы Тухачэўскага, якія таемна групаваліся для вайны з Польшчай. Пілсудзкі вырашыў перашкодзіць гэтаму, нягледзячы на тое, што 25 красавіка пачалася ўкраінская апэрацыя. Польскія легіёны мусілі ўдарыць па арміі Тухачэўскага — мэтад пакрокавага наступленьня з поўдня ў паўночным напрамку. Галоўны наступ у Беларусі меўся пачацца 17 траўня з поўдня на поўнач у кірунку Магілёва, Воршы, а можа, і Полацку. Атакаваць мусілі атрады, згрупаваныя на поўдні Беларусі, а таксама выслабаненыя з кіеўскай апэрацыі і перамешчаныя чыгункай. Тухачэўскаму давялося б тады адбіваць атаку з тылу, і ён апынуўся б у цяжкім становішчы. Аднак, рэагуючы на трагічную сытуацыю на поўдні, галоўнакамандуючы Чырвонай арміяй Сяргей Каменеў пачаў слаць драматычныя дэпэшы Тухачэўскаму. У іх загадвалася неадкладна атакаваць палякаў, каб палегчыць становішча ва Ўкраіне. Тухачэўскі трохі марудзіў, казаў, што негатовы, што атрады неўкамплектаваныя, бракуе амуніцыі, але рушыў.



Польскі самалёт узору 1920 году.

Савецкая атака распачалася 14 траўня. Да пачатку польскага наступу не хапіла трох дзён. Можа, гэтыя тры дні вырашылі лёс незалежнай Украіны. Норман Дэвіс напісаў: калі б польскае наступленьне пачалося раней, гісторыя магла б пайсьці па-іншаму.

## Спыніць «Непераможную армаду»

**— Пілсудзкі недаацаніў савецкую Расею?**

— Ён ведаў, што гісторыя дае яму ўнікальны шанец разыграць украінскую карту і тым самым гарантаваць польскую незалежнасьць на дзесяцігодзьдзі. Перад ім толькі стаяў выбар, рызыкнуць ці чакаць, нічога ня робячы. Ён рызыкнуў.

**— Ці мела Польшча шанцы ў жніўні 1920 г., калі армія Тухачэўскага падышла да Варшавы?**

— Усе ацэньвалі іх як невысокія. Агульны ваенны патэнцыял абедзьвюх дзяржаў улетку 1920 г. не даваў Польшчы шанцаў: Расея — 5 млн чалавек пад ружжом, Польшча — 900 тыс. Розьніца ў колькасьці непасрэдна на польскім фронце не была вялікай, але Расея мела велізарную рэзэрву. Польская армія адступае. Небывалыя маштабы набыло дэзэртэрства. Тысячы польскіх жаўнераў, набраных зь сялян, дэзэртавалі. Яны ўцякалі на жніво.

Былі легендарныя студэнты ды гімназісты, якія ў жніўні 1920 г. пад Радзімінам гераічна ўтрымлівалі бальшавіцкія атрады. Яны былі накіраваны на фронт адразу пасьля прызыву. Калі дасьведчаныя афіцэры знаходзіць мэтазгодным пасылаць у бой 16-гадовых падлеткаў, гэта сапраўды крытычная сытуацыя.

Праціўнікам камандаваў Тухачэўскі, пазьней адзін з найвыдатнейшых савецкіх тэарэтыкаў вайны. Разам зь ім у шэрагах Чырвонай арміі змагаецца каля 30 тыс. дасьведчаных царскіх афіцэраў, дывізіямі і арміямі камандуюць выпускнікі царскай Акадэміі Генштабу. Армія нядрэнна ўзброеная і аснашчаная — у Расеі паранейшаму напоўніцу працуюць збудаваныя пры дапамозе француzаў перад 1914 г. фабрыкі па вытворчасьці зброі і амуніцыі. Да таго ж у расейцаў багаты досьвед, назапашаны ў барацьбе з інтэрвэнцыямі. А ў Польшчы выраблялiся толькі штыкі і карпусы гранат, усё астатняе трэба было завозіць, а пастаўкі зброі блякаваліся заходнеэўрапейскімі камуністычнымі рухамі, прафсаюзамі. Баставалі докеры ў Гданьску, транспарт блякавалі Нямеччына і Чэхаславаччына.

**— А сувязь?**

— Уласна, гэта адзін з козыраў: кожная дывізія мае ў распараджэньні канец тэлеграфнага дроту. Тэлеграфныя перагаворы нельга падслухаць, у адрозьненьне ад радыёкарэспандэнцый, хіба што праціўнік падключыцца непасрэдна да лініі.

## Выкарыстаны шанец

**— Яшчэ да 13 жніўня 1920 г. здавалася, што мы прайгралі?**

— Таму Польшча, насуперак пазыцыі Пілсудзкага, і згаджалася на прыніжальныя ўмовы міру. Гаворка ішла пра хвіліну перадыху, пра часовае перамір'е, пра затрыманьне чырвоных. Чэскі прэзыдэнт Томаш Масарык перасьцерагаў Захад ад удзелу ў абароне Польшчы — справа гіблая і «гэта толькі зьнішчыць аўтарытэт вялікіх дзяржаў».

**— Якое значэньне мела ўтрыманьне арміі Тухачэўскага ў прадмесьцях Варшавы 14—15 жніўня?**

— З пункту гледжаньня маральнага стану польскай арміі — вельмі важнае. Таксама гэта дало Пілсудзкаму час на падрыхтоўку контранаступу, які рушыў з-над Вепшы. Лёс вайны вырашаўся пад Вепшай, а не пад Радзімінам. Параза не зрабіла вялікага ўражаньня на савецкае камандаваньне. Расейцы падрыхтавалі чарговую атаку. Варшаву з поўначы абкружалі тры расейскія арміі: III, XV і IV, а таксама конны корпус Гая Бжышкяна, што меліся паўтарыць манэўр І.Пас-

## Алег Латышонак: Беларусь на сваім баку

Цывільнае беларускае насельніцтва ў гэтай вайне ня брала нічыйго боку. Дый бязладзьдзе было, многія людзі яшчэ не павярталіся ў родныя мясьціны зь бежанства. А нацыянальна сьвядомыя беларусы, асабліва зь Беласточчыны, ваявалі за БНР у арміі Булак-Балаховіча, адагналі бальшавікоў аж за Мазыр. І былі пасьля разброеныя палякамі. Многія балахоўцы разам зь мясцовымі сялянамі потым у 20-я бралі ўдзел у БНРаўскай партызанцы ў Белавескай Пушчы.

кевіча 1831 г. і, перайшоўшы Віслу, атакаваць Варшаву з захаду. Нічога не было перадвызначана. Падрыхтаваная Пілсудзкім контратака з-над Вепшы 16 жніўня, якая ў канчатковым выніку разьбіла фронт Тухачэўскага, была манэўрам крайне небясьпечным. Ён атакаваў, праўда, слабыя савецкія групоўкі — Мазырскую групу, — але ў любы момант у тыл і крыло яго войска магла ўдарыць Першая Конная армія.

**— Чым была Конармія?**

— У той час гэта была найлепш аснашчаная адзінка Чырвонай арміі. Конная армія — гэта былі ня толькі казакі і тачанкі, але і цудоўная артылерыя, авіяразьведка, бронецягнікі. Ідучы на польскі фронт, Конная армія налічвала звыш 30 тыс. чалавек, у тым ліку 16 тыс. лінейных салдатаў, так званых шабель. Яна мела трыццаць палявых радыёстанцый — больш, чым уся польская армія. Гэта давала ёй магчымасьць падтрымліваць сувязь і ўзаемадзеяньне ў руху, а рух быў яе козырам. Конармія выкарыстоўвала найноўшыя дасягненьні шыфраваньня ў радыётэлеграфіі: спэцыяльнае абазначэньне квадратаў мапаў, крыптонімы дывізій, часта зьмяняла пазыўныя радыёстанцый. Усё гэта абцяжарвала ўзлом шыфраў і чытаньне яе карэспандэнцый. Але палякі з гэтым справіліся.



POMOERIUM.COM

**— Ці складалі нейкія шыфры асаблівую цяжкасьць для польскай разьведкі?**

— Польскае бюро шыфраў мае ў распараджэньні каля ста шыфраў, узламаных і здабытых падчас вайны 1919—1920 г. Былі шыфры лягчэйшыя і цяжэйшыя. Цяжэй за ўсё было ўскрыць сыстэмы з так званымі гамафонамі — дубляванымі шмат разоў абазначэньнямі для кожнай літары, камбінаваныя літарна-складовыя сыстэмы. Для іх нельга было прымяніць згаданы вышэй мэтад дасьледаваньня частаты літар. Цяжка было разгадваць камбінаваныя сыстэмы, заснаваныя на адначасовым выкарыстаньні кодаў і шыфраў. Нагадаем, у кодах групай лічбаў замяняюцца цэлыя словы, у шыфрах — асобныя знакі (літары і лічбы) ці склады. Урэшце, расейцы ўжывалі мэтады падвойнага шыфраваньня. Вельмі складаным быў шыфр савецкай сеткі шпіёнаў, якія высылалі праз агентаў паведамленьні з тэрыторыі Польшчы, — між іншым, адзін з ключоў абапіраўся на фрагмэнт «Варшавянкі»; але шыфры гэтай сеткі таксама былі ўскрытыя.

Пад канец вайны польскія шыфравальшчыкі разгадвалі расейскія дэпэшы хутчэй, чым самі расейцы.

## Сталін меў свае пляны

**— На руку Пілсудзкаму ў жніўні 1920 г. былі і церці між камандаваньнем Паўднёва-заходняга фронту і Тухачэўскім. Ці была справа толькі ў асабістым канфлікце паміж камісарам гэтага фронту Сталіным і Тухачэўскім?**

— Прычыны былі глыбейшыя. Войскі Тухачэўскага — гэта армія тэхнакратычная, стварэньне Троцкага, аўтара ідэі арганізацыі Чырвонай арміі пры дапамозе царскіх генэралаў і штабістаў, — словам, прафэсіяналаў. На Паўднёва-заходнім фронце дамінавала так званая царыцынская група: бальшавіцкія камандзіры, што бралі ўдзел у абароне Царыцына ад «белых» казакоў. На абароне Царыцына збудавалі свае легенды Сталін, Варашылаў, Будзённы. Шмат хто з афіцэраў паўднёвага фронту — унтэр-афіцэры царскай арміі. Яны не для таго рэзалі ў 1917 г. сваіх камандзіраў, каб служыць у Чырвонай арміі пад камандаваньнем былых царскіх афіцэраў — Каменева, Лебедзева й Тухачэўскага! У Сталіна таксама былі іншыя пляны ў дачыненьні да Польшчы.

У першую шлюбную ноч пані Срокі нарадзілася новая польская школа крыптааналізу.

**— Якія?**

— З Тухачэўскім ішоў рэвалюцыйны ўрад з Фэліксам Дзяржынскім і Юліянам Мархлеўскім на чале. Яны лічылі, што Польшча зробіцца чарговай савецкай рэспублікай. Частка ўраду, што адказвала за ідэалёгію, была дужа зьдзіўленая: насуперак тэорыі камунізму польскія рабочыя і сяляне змагаюцца на фронце і не пераходзяць на бок чырвоных.

У сваю чаргу Сталін у чэрвені піша Леніну, што Польшча «не заслугоўвае гонару далучэньня да Савецкай Расеі ў якасьці рэспублікі», і прапануе зрабіць яе савецкім сатэлітам. То бок для яго гэта нібыта каляніяльная вайна.

Гэта была жорсткая вайна. Палякі не былі анёламі, але Конная армія вяла татальную вайну. Казакі рэдка бралі палонных. Яны забілі палонных у Жытоміры, у захопленым Бярдзічаве спалілі палявы шпіталь разам з шасьцюстамі параненымі і пэрсаналам.

Сталін спаборнічае з Тухачэўскім і за тое, хто панясе паходню рэвалюцыі ў Эўропу. Калі Тухачэўскі павінен захапіць Варшаву, дык Сталін хоча здабыць іншы важны горад — Львоў. Калі Тухачэўскі павінен прынесьці рэвалюцыю ў Нямеччыну, дык Сталін з Будзённым хочуць прынесьці яе ў Вугоршчыну і Аўстрыю. Таму Будзённы пад уплывам Сталіна ігнаруе загад ісьці на Варшаву. Ён не падпарадкоўваецца Тухачэўскаму.

**— Гэта гісторыкі ведаюць…**

— Але яны ня ведаюць, што Пілсудзкі выдатна ўсьведамляў гэтую сытуацыю. Ёсьць дакумэнт, датаваны 19 жніўня, які даводзіць, што ўсе супярэчнасьці ў вярхах савецкага камандаваньня адсочваў паручнік Кавалеўскі і інфармаваў пра іх непасрэдна начальніка дзяржавы.

## «І перакладалі на мову наваха»

**— Але ж расейцы напярэдадні Варшаўскай бітвы таксама мелі сваю, і досыць пасьпяховую, разьведку. Што яны ведалі пра падрыхтоўку Пілсудзкага?**

— Многае, але ня ўсё. Пры забітым у ваколіцах Дубенкі афіцэру-сувязісту маёру Драеўскаму знайшлі загады перагрупаваць польскія войскі Трэцяй і Чацьвёртай арміі над Вепшам. Гэта было апісаньне падрыхтаванага Пілсудзкім контранаступу.

**— Тухачэўскі павёў сябе бесклапотна і інфармацыю пакінуў без увагі?**

— Так апісвалі гэтую сытуацыю гісторыкі. Тухачэўскі недаацаніў сілу польскага ўдару і занадта позна даў загад адступаць.

Затое гэта ацаніла польскае камандаваньне. У 1921 г. начальнік Генэральнага штабу генэрал Уладыслаў Сікорскі адзначыў паручніка Кавалеўскага Крыжам «Virtuti Militari». Пры гэтым сказаў яму: «Гэта за выйграную вайну» — і падміргнуў.

**— Паручнік Кавалеўскі пасьля вайны праслухоўваў што-небудзь яшчэ?**

— Яго падначаленыя кантралявалі расейскую дыпляматычную карэспандэнцыю падчас Рыскай канфэрэнцыі ў 1921 г., а ён сам зрабіўся начальнікам разьведкі камандаваньня абароны плебісцыту ў Сылезіі і ўзначаліў разьведку III Сылескага паўстаньня — там, хутчэй за ўсё, займаўся ўзломам нямецкіх шыфраў. А з 1923 г. ён ужо ствараў крыптаграфічную службу ў Японіі. Атрымаў найвышэйшы ордэн імпэрыі — ордэн Узыходзячага Сонца V клясы. Праз пэўны час Польшча сумесна зь Японіяй ажыцьцяўляла праслухоўваньне радыёграм савецкай Расеі з тэрыторыі Маньчжурыі. Гэтае супрацоўніцтва польскай і японскай разьведак прыносіла плён нават у гады Другой сусьветнай вайны. Польскія разьведчыкі працавалі пад прыкрыцьцём у дыпляматычных прадстаўніцтвах дзяржавы Маньчжоў-Го, кантраляванай Японіяй, а дыпляматычныя каналы японскага аташэ ў Бэрліне служылі для перасылкі польскіх разьведпаведамленьняў у Швэцыю і адтуль у Вялікабрытанію.

**— Відаць, Кавалеўскі кепска даў рады арганізацыі японскай крыптаграфіі, бо японцы амэрыканскіх шыфраў не ўзламалі.**

— Але японцаў хвалявалі тады шыфры савецкія. Амэрыканцы дэпэшы шыфравалі і дадаткова перакладалі на паміраючую мову індзейцаў наваха, не падобную ні на якую іншую мову. У арміі ЗША служылі індзейцы з гэтага племені. Яны так цаніліся, што да кожнага зь іх прыстаўляўся індывідуальны разьведчык. Ня толькі для таго, каб іх ахоўваць, але і каб забіць, калі была рызыка, што перакладчык можа трапіць у рукі ворага.

## Яны дапамаглі расшыфраваць «Энігму»

**— Наколькі тое, што польская разьведка рабіла ў 1920-я, паўплывала на дзейнасьць тых польскіх крыптолягаў, якія расшыфравалі «Энігму»?**

— У канцы 1920-х у Пазнанскім унівэрсытэце распачаўся набор людзей, якія валодалі нямецкай мовай, маглі думаць па-нямецку і адначасова былі выдатнымі матэматыкамі. Сярод іх апынуліся Мар'ян Раеўскі, Генрык Зыгальскі і Ежы Ружыцкі. Вядома, што ўжо з пачатку 1920-х польскае Бюро шыфраў намагалася ламаць нямецкія так званыя транспазыцыйныя шыфры і шыфры двайных дзельнікаў. Гэта былі шыфравальныя сыстэмы, якія адрозьніваліся ад расейскіх. Пра ўзлом нямецкіх шыфраў сьведчыць хоць бы просьба аб дапамозе ў гэтай сфэры, скіраваная ў Францыю на пачатку 1920 г.

**— Ці сутыкаліся будучыя ўзломшчыкі кодаў «Энігмы» з супрацоўнікамі Бюро шыфраў часоў польска-бальшавіцкай вайны?**

— Несумненна.

**— Посьпехі польскіх крыптолягаў не засьцераглі ад паразы ў 1939 г.**

— Войны, як і партыя ў покер, не выйграюцца з дапамогай аднаго люстэрка, для перамогі патрэбны яшчэ моцныя карты. Як бы там ні было, расшыфроўка «Энігмы» дапамагла хаўрусьнікам выйграць вайну.

**Паводле «Gazety Wyborczej»**

ІМГНЕННАЕ ФОТА

# Апошняя сустрэча са Скрыганом

Напярэдадні 100-годзьдзя з дня нараджэньня Яна Скрыгана прыгадалася апошняе спатканьне зь ім. Піша **Ўладзімер Содаль**.

Зь дзядзькам Янкам я меў не адну сустрэчу. Апошні раз спаткаўся 19 кастрычніка 1988 году позна ўвечары ля паштамту, на тралейбусным прыпынку. Мы вярталіся зь першага ўстаноўчага сходу «Беларускага мартыралёгу». Усе былі ўзрушаныя. Такой падзеі, такога ўзрушэньня ні я, ні ён за сваё жыцьцё ня памятаем. «Такая рашучасьць, такая рашучасьць! — адно казаў ён. — Анё! Такога мы і ў 20-я гады ня ведалі, — працягваў у тралейбусе. — Гэта ж так сьмела адхілілі ад мікрафона цэкоўца».

З намі ў тралейбусе ехала і Ганна Сурмач. Праз усю дарогу мы адно толькі дзяліліся ўражаньнямі ад гэтага сходу. «Я шчасьлівы, — казаў Янка, — што дажыў да гэтай пары…»

Больш пра сход ён не гаварыў, але па вачах было відаць: узрушаны ён быў моцна. Мусіць, ехаў і згадваў, якія мужныя былі Васіль Быкаў, Зянон Пазьняк. Больш за ўсё яго, пэўна, уразіла, як яны не дазволілі камусьці з ЦК сарваць сход, адціснулі яго ад мікрафона. Такога яшчэ ніколі не было, каб нехта ды запярэчыў цэкоўцам.



УЛАДЗІМІР КРУК

# Сквэр Сястры

**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Непадалёку ад чыгуначнага вакзалу ў Менску, на рагу вуліц Ленінградзкай і Сьвярдлова (некалі Каломенскай), стаіць бронзавы хлапчына. Франтаваты, фацэтны: з кудзеркамі пад брылём кепкі, з расшпіленым верхнім гузікам кашулі пад караценькай куртачкай, пры фарсістым гальштуку… Стоячы ўзбоч ходніка і хітравата прыкошваючыся, ён працягвае руку, нібы нешта ці то прапануе, ці то просіць — і ў пальцах ягоных часьцяком дыміць цыгарка: прахожыя, дурэючы, частуюць. Мінаючы яго па дарозе з вакзалу дахаты, я і да просьбаў, і да прапановаў ягоных быў абыякавы, пакуль Леанід Дранько-Майсюк не прыдумаў, што хлапчына гэты — Ваця Браніславец. А ў сквэрыку за ім, гнуткая і плаўная, бронзавая на бронзавай лаўцы, — Маня Ірмалевіч. У капялюшыку, трохі фрывольная, але што ж: часы зьмяніліся…

Наўрад ці скульптар ці архітэктар, займаючыся гэтым куточкам гарадзкой прасторы, думалі пра тое, каб выявіць у бронзе герояў раману Кузьмы Чорнага «Сястра». Хоць гэта якраз тут, каля вакзалу, дзе была цырульня былога камісара Абрама Ватасона, які «паразумнеў, голячы разумныя твары», і пачынаецца дзея раману. Побач з гэтым сквэрыкам, тады Каломенскім, у доме, дзе гаспадарыў Радзівон Цівунчык, які жыў «выключна па сваіх прыватных справах», казаў усім «ганарова дзякую» і даводзіў: «Мы ўсе павінны быць народныя людзі». Тут завязваўся вузел сюжэту, тут скрыжаваньне, на якім сыходзіліся і разыходзіліся героі раману — аднаго з найлепшых твораў беларускай прозы. Ён і ў сусьветнай прозе далёка ня горшы, проста не заняў (ня лёс, ня склалася) належнае яму месца. Янка Брыль назваў яго «месцамі геніяльным». Ну, калі месцамі, тады большымі, бо ў ім нават эпізадычныя (нават безь імені) пэрсанажы выпісаны, як характары. Вунь мужык на хутары з «тварам абветраным, няголеным», з валасамі, якія «густа шчацініліся да самага каўняра салдацкае сарочкі», у шапцы са скураным брылём, якую ён ніколі не здымае, сядзіць сабе, з поля прыйшоўшы і плуга нацягаўшыся, самакрутку курыць і разважае:

«Яно вядома, што ніхто ня можа ведаць, што напярод будзе. Кажуць, што ў сто год на зямлі зьяўляецца адзін чалавек, які ведае напярод, што на зямлі будзе. Дык іншы зь іх сядзіць сабе рукі склаўшы ды глядзіць, як яно ўсё робіцца так, як ён прадбачыў, а іншы паглядзіць — дык жа яно нешта ня так, як яму здавалася. От тут ён і пачынае арудаваць. Каб, канечне, было па ягоным… Можна сказаць, моцныя ёсьць людзі на сьвеце…»

Пакурыўшы і паразважаўшы гэтак, ён «паволі падлажыў недакурак пад падэшву бота на падлогу і раздушыў яго; пасьля адышоўся да парога і плюнуў цераз парог у сенцы».

Га?..

Ваця Браніславец жыў з пытаньнем: «Я чужы ўсяму сьвету?!.»

Недзе тут, каля вакзалу, Маня Ірмалевіч разьвіталася зь ім…

У аддзеле ляндшафтнай архітэктуры (пры Менскім гарвыканкаме) мне назвалі імя скульптара (У. Жбанаў) і архітэктара (Б. Юрцін), якія працавалі ў былым Каломенскім, а цяпер Міхайлаўскім сквэрыку. На пытаньне пра назвы скульптур адказалі: «Мужчына» і «Дама на лаве».

Дык чаму б ня даць ім імёны?.. І сквэрык, які, па сутнасьці, назвы ня мае, а Міхайлаўскім называецца толькі таму, што прылягае да Міхайлаўскага (?) завулку, не назваць сквэрыкам Сястры?.. У гонар Кузьмы Чорнага і ягонага бліскучага раману.

— Дзе спаткаемся, Ваця?

— У сквэрыку Сястры.

Пасядзім, пакурым, паразважаем… Моцныя, можна сказаць, ёсьць людзі на сьвеце.

## Самуэль Бэкет, «У чаканьні Гадо»




Кніжка пабачыла сьвет у выдавецтве «Логвінаў», накладам 200 асобнікаў. Як перакладчык гэтай п’есы, а таксама вялікі аматар Бэкетавай творчасьці, заахвочваю ўсе тэатры далучыцца да сьвяткаваньня 100 год з дня народзінаў Бэкета ў 2006 годзе. Гэты выдатны юбілей ёсьць добрай нагодай, каб ушанаваць творчасьць нобэлеўскага ляўрэата выстаўленьнем найбольш вядомага дзеятвору бацькі тэатра абсурду: «У чаканьні Гадо».

Спадзяюся, што наступны год стане сапраўдным сьвятам драматургіі і творчасьці Бэкета ў Беларусі.

**Віталь Воранаў**

**Альбино** / Ред.–изд. В.Жылко. — Лунинец, 2005. №49—50; №51—52. — 100 экз.

У нядаўніх выпусках адзінага ў Беларусі пэрыядычнага выданьня для шахматных кампазытараў апублікаваны рэпартажы беларускіх творцаў аб удзеле ў замежных спаборніцтвах, зьвесткі аб камандным першынстве краіны, крытычны агляд «Спартовай клясыфікацыі РБ». Бюлетэнь адкрывае новыя імёны ў галіне кампазыцыі.

**ВР**

**АДАМ ГЛЁБУС**



## Невялікае пра вялікіх

### Тыцыян і тытанізм

Чытаючы прозьвішча Tiziano, выпадкова прачытаў Тытано! Можа, з падобнай памылкі прачытаньня і пайшоў выраз «тытаны Адраджэньня» і далей «эпоха патрабавала тытанаў, і эпоха нарадзіла тытанаў». Так, эпоха Адраджэньня нарадзіла Тыцыяна, Леанарда, Рафаэля, а наш час постмадэрнізму ня можа нават вызначыць, хто зь іх большы тытан.

### Рубэнс і надзіманьне

Рубэнс, пішучы карціны, надзімаў шчокі. А як інакш намаляваць такіх надзьмутых жанчын і анёлаў, такіх круглаадупых прыгажунь з круглашчокімі дзецьмі? Ты паспрабуй надзьмуць шчокі, нібыта пускаеш бурбалкі ў вадзе, і скажы Пітэр (бурбалка) Паўль (бурбалка) Ру-бэнс (дзве бурбалкі). Удалося? Вядома, бо ў Рубэнса нават пяты й мезенцы й тыя надзьмутыя. Калі Леанарда параўноўваў жыцьцё з плесьняю, дык Рубэнс з бурбалкамі, без сумневаў.

### Кранах і вузлаватасьць

Кранах-старэйшы сваіх людзей нібыта выточваў з вузлаватага дрэва, такія яны ў яго непразрыстыя, такія чалачалавечныя, што жах бярэ.

### Сурбаран і Хрыстос

Гляджу на «Хрыста на крыжы», напісанага Сурбаранам, і бачу ня змучанага чалавека, што бязвольна абвіс на крыжы, а размах крылаў Божага Духу. Дух лунае, а я чую блюзьнерскае пытаньне: «Ці ёсьць дзе карціна «Хрыстос зрынуты»?..»

### Т’епала і Хрыстос

Калі Хрыстос выганяў з храму гандляроў, ён чуў звон срэбра, за якое і будзе прададзены. Маё назіраньне пацьвердзіў Т’епала. На палатне «Выгнаньне з храму», дзе падобны да Юды гандляр ляжыць з разьбітым носам каля місы з грашыма.

### Каналета і Гулівэр

На палатне Каналета намаляваны горад ліліпутаў. У Каналета ўсе краявіды — з гарадамі ліліпутаў. Каля ягонай Вэнэцыі ў мініятуры чакаеш прыхода Гулівэра. Чакаеш, чакаеш і раптам разумееш, што ты сам той Гулівэр. Так у Барсэлёнскім акварыюме з акуламі ты таксама ператвараесься ў Гулівэра, толькі не ў Ліліпуцініі, а ў Валатаве.

### Вэляскес і пёры

Стравусіныя пёры, уплеценыя ў валасы глюганосай інфанты і намаляваныя пэндзлем Вэляскеса ў XVII стагодзьдзі, дагэтуль варушацца. Ты сыходзіш з музэю-манастыру Пэдральбэс, а яны застаюцца, каб пакалыхвацца ад лёгкага дахаваньня наступных гледачоў.

# Прыз амэрыканскаму ідыёту

Па традыцыі ў лістападзе праходзіць аўтарытэтная цырымонія «MTV Europe Awards». Сёлета яна прайшла ў Лісабоне. Гэтым разам у модзе спакойныя сьпевы сьціплага Крыса Марціна, «Coldplay» і панк-опэра «American Idiot» ад «Green Day». На хвалі папулярнасьці працягваюць трымацца Робі Ўільямз і маляваныя пэрсанажы з «Gorillaz».



KEVINWESTENBERG.COM

Брытанскі квартэт «Coldplay» атрымаў сёлета дзьве прэстыжныя ўзнагароды MTV.

### Пераемнік «Radiohead» і Брэда Піта

Сем год таму хлопцы з «Coldplay» гралі ў гурце «Starfish», што з размоўнай ангельскай перакладаецца не іначай, як «анальная адтуліна», па зашмальцаваных ангельскіх пабах за так. Цяпер яны зьбіраюць стадыёны, а іх альбомы — лідэры ў эўрапейскіх і амэрыканскіх чартах. Лішні раз шалёную папулярнасьць «Coldplay» засьведчыла цырымонія «MTV Europe Awards» у Партугаліі. Брытанскі квартэт атрымаў дзьве прэстыжныя ўзнагароды — «Найлепшая кампазыцыя» і «Найлепшы выканаўца ў Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірляндыі». Лідэр гурту Крыс Марцін у інтэрвію часопісу «Rolling Stone» сфармуляваў дзьве свае звышмэты — намагацца быць вартым пераемнікам «Radiohead» і ня менш вартым пераемнікам Брэда Піта (жонка Крыса — Гвінэт Пэлтроў).

Рэдкі выпадак — брытанскі рок-гурт займеў посьпех ва ўсім сьвеце: іх любяць і ў Японіі, і ў Амэрыцы (дзе за першы тыдзень продажаў іх альбом «X&Y» разышоўся накладам у 773 000 асобнікаў). Дый К.Марцін — нетыповы рок-музыка: рэдка дазваляе сабе скандальныя выказваньні, добры сем'янін і сьціплы творца (ня тое што ў маладыя гады). «Мы — купка таленавітых плягіятараў. Усе нашы песьні напісалі раней іншыя, проста мы іх крыху перарабілі», — кажа лідэр «Coldplay».

### Самы папулярны выпівоха

Робі Ўільямз заўсёды сябе адчувае ўпэўнена — ён стаў зоркай яшчэ ў школьным узросьце, калі зьвяўся ў тэлесэрыяле, у 16 год сьпяваў у папулярным бойгурце «Take That». У 22 гады Робі пачаў сольную кар'еру. На сёлетнім «MTV Europe Awards» ён у трэці раз быў прызнаны найлепшым эўрапейскім выканаўцам, а яго апошні альбом «Intensive Care» на мінулым тыдні лідзіраваў у 16 чартах ва ўсім сьвеце.

Уільямз стала прысутнічае і на старонках жоўтай прэсы: ужо амаль 10 год журналісты жвава абмяркоўваюць яго праблемы з алькаголем і наркотыкамі.

У намінацыі «Найлепшы гурт» перамаглі «Gorillaz» — хлопцы, якія ў свой час скарысталі карысныя здабыткі навукова-тэхнічнага прагрэсу і стварылі цалкам віртуальны праект з маляванымі пэрсанажамі-музыкамі. Хоць імёны музыкаў ужо даўно раскрытыя, ад «Gorillaz» заўсёды будзе адбівацца таямнічы цень.

**Пераможцы MTV Europe Awards 2005:**

- найлепшы сьпявак — Робі Ўільямз;
- найлепшая сьпявачка — Шакіра;
- найлепшая група — «Gorillaz»;
- найлепшая рок-група — «Green Day»;
- найлепшы хіп-хоп выканаўца — «Snoop Dogg»;
- найлепшы альтэрнатыўны выканаўца — «System of a Down»;
- найлепшы рытм-энд-блюз выканаўца — Аліша Кіс;
- найлепшы поп-выканаўца — «The Black Eyed Peas»;
- найлепшы выканаўца ў Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірляндыі — «Coldplay»;
- найлепшая песьня — «Speed of Sound» («Coldplay»);
- найлепшы альбом — «American Idiot» («Green Day»);
- найлепшы навічок — Джэймз Блант;
- найлепшы відэакліп — «Believe» («The Chemical Brothers»).

Спэцпрыз «Вызвалі свой розум» — Боб Гэлдаф.

### Вострасацыяльнасьць ізноў у модзе

«Green Day» зьвярнулі на сябе ўвагу ня толькі таму, што прадстаўлялі амэрыканскую панк-музыку. Іх новая праграма пад красамоўнай назвай «American Idiot» была прызнаная «Найлепшым альбомам году». Але яны не сьпяваюць пра нянавісьць да Буша, як гэта робяць шмат якія амэрыканскія панк-групы. Сур'ёзная форма падачы — панк-рок-опэра — сьведчыць пра іх шырыню погляду. У «American Idiot» больш спачуваньня сваім суграмадзянам, чым нянавісьці да вышэйшых чыноў. Спэктар праблем, што ўздымае «Green Day» — ад атупленьня чалавека праз СМІ да пошуку прычын канфлікту ў Іраку.

Сярод пераможцаў «MTV Europe Awards 2005» аказаўся яшчэ адзін гурт, які ў сваёй творчасьці ўздымае сацыяльныя праблемы. У намінацыі «Найлепшы альтэрнатыўны выканаўца» перамогу атрымалі хлопцы армянскага паходжаньня з «System of a Down». Пасьля шалёнага посьпеху іх альбому «Toxicity» ў 2001 г. яны ўвайшлі ў вышэйшую лігу цяжкай музыкі. Удзельнікі групы неаднаразова выяўлялі сваю грамадзянскую пазыцыю — удзельнічалі ў маршах пратэсту дабрачыннага і пацыфісцкага характару.

Узнагарода групе «The Black Eyed Peas» як найлепшаму поппраекту сьведчыць пра зьмены прыярытэтаў у гэтым кірунку. Зьяўленьне першага гіта гэтай групы ў музычных крытыкаў энтузіязму ня выклікала, але музыкі пайшлі далей за гангста-рэп-абсягі. І ў выніку толькі выйгралі: у іх музыцы знайшлося месца ня толькі манатоннаму хіп-хопу, але і фанку, соўлу і нават этна-матывам.

**Сяргей Будкін**

## СПОРТ СЬЦІСЛА



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Юры Пунтус (на здымку зьлева) пацьвердзіў рэнамэ самага пасьпяховага беларускага трэнэра. Пад ягоным кіраўніцтвам барысаўскае БАТЭ ні разу не заставалася па-за п'едэсталам чэмпіянату. Год працы ў МТЗ-РІПА — і каманда з 14-га леташняга месца скочыла на трэцяе месца, заваяваўшы «бронзу». Прыйшоў, пабачыў, перамог.

### Вынікі футбольнага сэзону

5 лістапада завяршыўся 15-ты чэмпіянат Беларусі па футболе ў вышэйшай лізе. Канчатковае разьмеркаваньне камандаў у турнірнай табліцы наступнае: «Шахтар» (Салігорск) — 63 пункты, «Дынама» (Менск) — 50, МТЗ-РІПА (Менск) — 49, «Тарпэда» (Жодзіна) і БАТЭ (Барысаў) — па 47, «Дняпро-Трансмаш» (Магілёў) — 43, «Гомель» — 39, «Дынама» (Берасьце) — 36, «Нафтан» (Наваполацак) — 33, «Дарыда» (Ждановічы) — 29, «Лякаматыў» (Менск) — 26, «Нёман» (Горадня) — 24, «Зорка-БДУ» (Менск) — 14, «Славія» (Мазыр) — 11. Вышэйшую лігу пакінулі «Зорка» і «Славія», ім на зьмену прыйшлі «Лякаматыў» (Віцебск) і бабруйская «Белшына».

«Шахтар» на наступны год выступіць у кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў, менскае «Дынама» — у Кубку УЭФА, МТЗ-РІПА ў Кубку Інтэртота.

Найлепшым бамбардзірам другі раз запар стаў форвард «Нафтану» Валер Стрыпейкіс: на яго рахунку 16 мячоў.

### Самсонаў трымае марку

Уладзімер Самсонаў стаў пераможцам турніру «Russian Open» сэрыі «Pro tour» па настольным тэнісе, што прайшоў у Санкт-Пецярбургу. У фінале беларус 6 лістапада абыграў леташняга пераможцу спаборніцтваў грэка Калінікаса Крэангі зь лікам 4:0. Сёлета ў беларуса гэта другая перамога на турнірах «Pro tour». Першая была атрымана ў студзені ў Харватыі.

Да фіналу ў жаночым парным разрадзе дайшлі сёстры Вераніка і Вікторыя Паўловіч. Тут яны саступілі вугоркам Крыстыне Тот і Геаргіне Пота зь лікам 1:4.

### Мірны на паніжэньні

Няўдалы выступ на турніры сэрыі «Мастэрз» у Парыжы адбіўся на пазыцыях Макса Мірнага ў рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў. У рэйтынгу, што ўлічвае паказчыкі спартоўцаў за апошнія 52 тыдні, Мірны апусьціўся з 28-га на 35-е месца, у чэмпіёнскай гонцы-2005 — з 33-га на 34-е, у рэйтынгу парных гульцоў — з 2-га на 4-е.

Шанец паправіць становішча ў парным рэйтынгу ў беларуса ёсьць. 13 лістапада ў Шанхаі пачнецца фінальны турнір сэрыі «Мастэрз» — «Tennis Masters Cup». М.Мірнаму й шведу Юнасу Б'ёркману будуць процістаяць наймацнейшыя пары сьвету — браты Боб і Майк Браяны (ЗША), беласкурыя зымбабвійцы Ўэйн Блэйк і Кевін Ульет, Марк Ноўлз (Багамы) і Дэніэл Нэстар (Канада), Стэфан Г'юз (Аўстралія) і Ўэслі Мудай (ПАР), Мішэль Ладра і Фабрыс Сантаро (абодва — Францыя), Леандар Паес (Індыя) і Ненад Зімоныч (Сэрбія).

Паралельна ў Шанхаі пройдзе і турнір наймацнейшых індывідуальных гульцоў. Матчы абяцае паказваць у жывым этэры канал «Эўраспорт». Ёсьць на што паглядзець.

**AP, atptennis.com, belapan.com**

ІНФАРМАТАР



## Афармленьне й дэкор

**«Мальва»**
Паветраныя шары.
пр.Скарыны, 19
227–61–18, 668–68–71
**«Смайлэнд»** (дэкор–студыя)
вул.Вызваленьня, 11
658–51–67, 615–77–30
**«Prozoroff»**
Паветраныя шары.
282–14–86, 401–54–88
**«V.I.P.-Flora»**
Кветкі.
вул.Я.Купалы, 25
227–37–21
**«Аэрадызайн»**
Паветраныя шары.
552–40–75
**«Белспэцэфэкт»**
Салют і фаервэркі.
252–59–98, 652–59–98, 617–09–63, 775–29–97
**«Бюро флярыстычнага дызайну Іны Станішэўскай»**
252–76–13, 650–04–01, 330–04–01
**«Паветраныя фантазіі Мікалая Торапава»**
Паветраныя шары.
210–14–53, 614–14–53
**«Гранфлёр»**
Кветкі.
210–42–68, 660–70–79
**«Данатэя»**
Упрыгожваньне і афармленьне.
753–64–68, 656–35–47
**«Алена»**
Кветкі.
вул.Багдановіча, 135
234–62–94
**«Мадонна»**
Кветкі.
вул.Багдановіча, 114
231–91–34
**«Мільён ідэй»**
вул.Чэхава, 3
601–94–02 , 704–70–67, 209–44–81
**«Мэрыдж»**
Упрыгожваньне і афармленьне.
621–25–22, 755–89–06
**«Пэгас»**
Упрыгожваньне і афармленьне.
пр.Пушкіна, 63, офіс 74
205–63–34, 345–63–34
**«Плянэта кветак»**
вул.Камсамольская, 18
206–66–22
**«Сьвяточны дызайн памяшканьняў»**
Паветраныя шары.
264–55–50, 664–55–50
**«Сандра»**
Кветкі.
вул.Я.Коласа, 48
262–32–59
**«Спэцэфэкт-плюс»**
Салют і фаервэркі.
284–25–73, 671–41–71, 662–34–91
**Творчая майстэрня «Лазэрныя шоў-сыстэмы»**
вул.Маякоўскага, 111, офіс 018
221–23–02, 670–67–07, 706–67–07
**«ТорысКопіТэхнік»**
Салют і фаервэркі.
вул.Мініна, 21а
216–21–83
**«Флёра-дызайн»**
Кветкі.
вул.Я.Коласа, 50
262–17–32, 666–17–32
**«Флярыст»**
273–27–43, 401–39–02
**«Шартрэ»**
Паветраныя шары.
вул.Даўгабродзкая, 24–48
230–88–43, 640–21–02
**«Экспамайстар»**
Паветраныя шары.
282–14–96, 282–15–56, 400–07–14, 400–07–15
**«Кальвін»**
Салют і фаервэркі.
Койданава, вул.Фрунзэ, 2
8–01716–6–47–57, 8–01716–6–47–58

КАІСА

# Тры баўгарскія кароны

Пасьля перамогі Весяліна Тапалава на першынстве сьвету склалася ўнікальная сытуацыя: прадстаўнікі адной краіны занялі ўсе шахматныя троны. Антуанэта Стэфанава заваявала чэмпіёнскі тытул сярод жанчын, Любен Спасаў — сярод вэтэранаў. У чым сакрэт баўгарскіх посьпехаў?

У 1991 г. шахматысты з клюбу «Стратэг» у сваю чаргу трапілі на турнір у Албэну. Мяне ўразіла ня столькі арганізацыя турніру, колькі аб'яўка пра магчымасьць зарабіць добрыя грошы, згуляўшы ночцу ў бліц. І шчырая зацікаўленасьць такімі імпрэзамі «простых баўгар».

Цікава, што шахматныя гурткі паўсталі ў Баўгарыі прыкладна ў той самы час, што ў Беларусі: «Сафійскі шахматны клюб» датуецца 1922 г., менская шахматна-шашачная сэкцыя — 1923-м. Колькасьць жыхароў у нашых краінах амаль аднолькавая, але ў 1990-я выявілася яўная перавага баўгарскіх шахматыстаў — і колькасная, і якасная. На 2005 г. у Беларускай фэдэрацыі шахмат было зарэгістравана амаль столькі ж гросмайстраў і міжнародных майстроў, колькі ў баўгарскай (таксама БФШ) дваццаць гадоў таму.

У Баўгарыі шахматная эліта карыстаецца аўтарытэтам ва ўладных колах (чэмпіёна сьвету віталі прэзыдэнт і прэм'ер-міністар), зацікаўленасьць спонсараў. Некалькі гадоў Тапалаў зьяўляецца рэклямным аблічам найбуйнейшага апэратара сувязі «Мабільтэль». Актыўнасьць шахматыстаў надае імпэту клюбным работнікам: міжнародныя спаборніцтвы рознага складу ладзяцца ня толькі ў Сафіі, а і ў Русе, Плеўне, ня кажучы пра чарнаморскія курорты. Зірніце на беларускі сайт www.chess.by і баўгарскі www.chessbg.com, каб адчуць розьніцу ў беларускім ды баўгарскім піяры і мэнэджмэнце.

Не пасьпеў Тапалаў прачытаць у парлямэнце лекцыю на тэму «Праблемы й будучыня шахмат у Баўгарыі» (яму пляскалі стоячы), як новы прэм'ер Сяргей Станішаў узяўся за праграму навучаньня шахматам у школах. Прэм'ер паглядзеў савецкі фільм «Шахматная ліхаманка» (1926): «Хай у нас таксама будзе шахматная ліхаманка!» Жартаваў, напэўна. Аднак нешта фільм Пудоўкіна з Капаблянкам у галоўнай ролі даўно не круцілі на БТ…

**Вольф Рубінчык**



### Як бы вы згулялі?

Т.Касінцава — А.Стэфанава. Краснатур'інск, 2003. Ход чорных.

**Адказ:** можна адразу ўзяць каня пешкай (1...bc), а лепш 1...Фf6! 2. Фd2 dc. Улюбёны варыянт баўгарскай шахматысткі ў шатляндзкай партыі, у якім яна атрымала нямала перамог.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 11 лістапада

**АНТ, 22.25**

«Набярэжная Арфэўр, 36».

Францыя, 2005, рэж. Аліўе Маршаль.

Драма.

Два паліцэйскія — былыя сябры, а цяпер ворагі. Яны нязгодныя адзін з адным ва ўсім і змагаюцца за месца на прэстыжнай Набярэжнай Арфэўр (паліцэйскае ўпраўленьне Парыжу). Акрамя таго, паміж імі здаўна стаіць жанчына.

Ролі выконваюць Даніэль Атой, Жэрар Дэпард'ё, Валерыя Галіна.

**СТВ, 23.20**

«Арлет».

Францыя, 1997, рэж. Клёд Зыдзі.

Камэдыя.

Карцёжніка-прыгажуна (Крыстафэр Ламбэр) пад страхам сьмерці прымушаюць спакусіць 45-гадовую афіцыянтку прыдарожнай кавярні. Жанчына — спадчыньніца найбагацейшага казіно ў Лас-Вэгасе. Пасьля вясельля «кепскія хлопцы» павінны забіць маладую. Але герой закахаўся ў грубую, шчырую і наіўную таўстуню…

Касьцюмы для К.Ламбэра пашыў Джорджыё Армані.

### Субота, 12 лістапада

**БТ, 22.10**

«Джон Ф.Кенэдзі. Стрэлы ў Даласе».

ЗША—Францыя, 1991, рэж. Олівэр Стоўн.

Палітычная драма.

Олівэр Стоўн прапануе сваю вэрсію забойства Кенэдзі. Старанная рэканструкцыя падзей, выкшталцонае выкарыстаньне дакумэнтальных кадраў, выдатная акторская гульня робяць гэтую вэрсію даволі пераканаўчай.

Кевін Кёстнэр у ролі пракурора Джыма Гарысана, Гэры Олдмэн — Лі Харві Освальд.



WWW.MOVIEWEB.COM

**СТВ, 0.10**

«Кінзі».

ЗША—Нямеччына, 2004, рэж. Біл Кондан.

Біяграфічная драма.

Яго называлі «агентам камуністаў» і буржуазным вычварэнцам. Ягоныя кнігі, складзеныя са статыстычных табліц, выбухнулі як атамныя бомбы і дасюль лічацца найнебясьпечнейшымі.

Як чалавек, які быў выхаваны дэспатычным бацькам, зацікавіўся тэмай, пра якую нельга гаварыць услых? Чаму паважаны біёляг пасьмеў парушыць грамадзкія табу?

Карціна распавядае пра навукоўца Альфрэда Кінзі — заснавальніка сэксалёгіі.

У ролі Кінзі — Лаям Нісан («Сьпіс Шындлера», «К-19»).

### Нядзеля, 13 лістапада

**БТ, 15.10**

«Маем рэчы» (рэж. Алесь Матафонаў).

Гэтым разам — пра куфар.

**СТВ, 21.25**

«Вандроўка Фэліцыі».

Канада—Вялікабрытанія, 1999, рэж. Атам Эгаян.

Трылер.

Сямнаццацігадовая Фэліцыя (Элэйн Кесыдзі), якая ведае толькі назву мястэчка, дзе жыве ейны каханак, адпраўляецца на пошукі. Дапамагаць ёй падахвочваецца кавалер сярэдніх гадоў (Боб Госкінз). Але неўзабаве Фэліцыя пачынае разумець, што ёй пагражае небясьпека.

Рэжысэр Атам Эгаян намінаваўся за фільм на «Залатую пальму» Канаў. Фільм атрымаў прэміі «Джэні» за сцэнар, апэратарскую працу, касьцюмы, музыку.

**БТ, 22.10**

«Мадыльяні».

Францыя—Нямеччына—ЗША—Італія—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Мік Дэйвіс.

Біяграфічная драма.

Парыж, 1919 год. П'яніца, наркаман і сухотнік Мадыльяні (Эндзі Гарсія), мала вядомы публіцы, кідае выклік Пікасо, які знаходзіцца на вяршыні славы. Чым завершыцца паядынак двух мастакоў?

**АНТ, 22.30**

«Уваходзьце бяз стуку».

ЗША—Нямеччына, 2005, рэж. Вім Вэндэрз.

Трагікамэдыя.

У свае 60 Спэнс — наркаман, алькаголік і гуляка, які раптам разумее, што нікому не патрэбны. Ён вяртаецца да сваёй старой маці — і сустракае ў горадку Дорын адну са сваіх былых палюбоўніц. У Дорын нарадзіўся сын ад Спэнса, але ён нават не жадае размаўляць са сваім бацькам.

**Андрэй Расінскі**

## ПРЭЗЭНТАЦЫІ




У наступную пятніцу, **18 лістапада**, у бібліятэцы Дому літаратара (вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі выбраных твораў **Кастуся Акулы** «Россыпы», прысьвечанай 80-годзьдзю аўтара. Слова пра аднаго з выбітных прадстаўнікоў літаратуры беларускага замежжа скажуць вядомыя літаратуразнаўцы і пісьменьнікі: **Вольга Іпатава, Алесь Пашкевіч, Уладзімер Арлоў**... Удзел бяруць беларускія барды. **Пачатак а 18-й.**

**Вандроўкі ў прасторы і часе**
У сераду **16 лістапада** адбудзецца творчая сустрэча з Уладзімерам Арловым з нагоды выхаду ягонай кнігі «Сланы Ганібала». Пачатак а 18-й (вул.-Варвашэні,8).

**Пра Міндоўга**
**16 лістапада** а 16-й гадзіне ў бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук адбудзецца прэзэнтацыя кнігі «Міндаў, кароль Літовіі». Бярэ ўдзел аўтар-укладальнік перакладчык Алесь Жлутка.

## КАНЦЭРТЫ

**Мацней біце ў бубны**
**14 лістапада** ў Моладзевым тэатры эстрады (вул. Маскоўская, 18а) адбудзецца гала-канцэрт «Барабанны біт». Удзел бяруць «Apple Tea», «Grig Percussion», «Фэстываль», «Symphonic Drive Orchestra», А.Старажук, А.Сапега ды іншыя. Пачатак а 19-й.

**Музыка Падарэўскага**
**15 лістапада** а 19-й гадзіне ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (вул.Ін-тэрнацыянальная, 30) адбудзецца канцэрт «Ігнацы Ян Падарэўскі» з цыклю «Польская музыка XX ст.». Уваход вольны.



**Блюз яшчэ не памёр**
**16 лістапада** ў канцэртнай зале «Менск» (вул.Кастрычніцкая, 5) адбудзецца канцэрт «Блюз жыве ў Менску» з удзелам Генадзя Старыкава, Уладзімера Ўгольніка, Аркадзя Эскіна, Леаніда Вярэніча, Ігара Сацэвіча, Аляксандра Сапегі, Ігара Варашкевіча. Пачатак а 19-й. Квіткі: 8 000—22 000.

## ВЫСТАВЫ

**Беларусь за царскім часам: фота**
**З 10 лістапада** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (Маркса, 12) пройдзе выстава твораў з фонду Нацыянальнага музэю ў Варшаве «Культура беларускіх земляў на фатаздымках XIX ст.». Квіткі: 2 000.

**Слаўчачына: графіка**
У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) **да 12 лістапада** працуе выстава славацкага графічнага мастацтва. Квіткі: 2 000.

**Будзем зь ядой!**
**З 15 да 18 лістапада** ў НВЦ «Белэкспа» (вул.Я.Купалы, 27) пройдзе XI Міжнародная аптовая спэцыялізаваная выстава-кірмаш «Харчэкспа-2005».

**Wonderful World**
**Да 17 лістапада** ў галерэі Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава твораў Людмілы Шчамялёвай і Ігара Рымашэўскага. Уваход вольны.

## ТАНЦЫ

**Менская восень-2005**
**12 лістапада** ў Менскім палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41) пройдзе Адкрыты рэспубліканскі традыцыйны турнір па спартовых танцах. Пачатак а 10-й.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## ТЭАТРЫ

**Опэра** *(на сцэне Філармоніі)*
**18** (пт) — канцэрт сымфанічнага аркестру беларускай опэры.

**Купалаўскі тэатар**
**10** (чц) — «Чычыкаў».
**11** (пт) — «Згублены рай».
**12** (сб) — «Памінальная малітва».
**13** (ндз) — «С.В.».
**19** (сб), **20** (ндз) — «Сымон-музыка».

**Малая сцэна**
**14** (пн) — «Адчыніце кантралёру!».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**11** (пт) — «Трыбунал».
**12** (сб) — «Нязваны госьць».
**13** (ндз) — «Адвечная песьня».
**15** (аўт) — «Валянціна».
**17** (чц) — «Майстар галаданьня».
**18** (пт) — «Жанчыны Бэргмана».
**19** (сб) — «Паўночная цішыня».
**20** (ндз) — «Адэль».

**Тэатар Горкага**
**11** (пт) — «Дэтэктар хлусьні».
**12** (сб) — «Нінаčка».
**13** (ндз) — «На Залатым возеры».
**15** (аўт) — «Выпадковы вальс».
**16** (ср) — «Адзіны спадчыньнік».

**Тэатар лялек**
**10** (чц) — «Прыгоды ўдалага салдата Швэйка».
**16** (ср), **17** (чц) — «Боская камэдыя».
**18** (пт) — «Чайка. Спроба прачытаньня».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**«Трыкліні»** (218-25-73)
**10** (чц) 18.00 — «Pre-party» / hip-hop.
**11** (пт) 18.00 — «Pre-party» / «Night Series».
**12** (сб) 18.00 — «Pre-party» / «Night Series».
**13** (ндз) 21.00 — кінасэанс.

**«Bronx»** (288-10-61, 103 і 105 — «Velcom»)
**10** (чц), 22.00 — dj Kudesnikoff.
**11** (пт) 22.00 — «Arabic Thursdays»: dj Kudesnikoff, Уляда (вакал, этна).
**12** (сб) 22.00 — «Bronx» RNB»: dj Sezzy (TR).
**13** (ндз) 19.00 — нядзельны кінасэанс.

**«Madison»** (219-00-10)
**10** (чц) 22.00 — «Lady's Thursday».
**11** (пт) 23.00 — dj Nice.
**12** (сб) 23.00 — dj Nice.
**13** (ндз) 23.00 — «Staff party».

**«Ізюм»** (206-66-18, 605-25-25)
**10** (чц) 23.00 — «RNB Royalty Party».
**11** (пт) 21.00 — dj-bar.
**12** (сб) 24.00 — dj-bar.
**13** (ндз) 24.00 — «RED November Tribute»: dj Top, dj Bergamo, go-go disco.

**«X-Ray»** (203-93-55)
**11** (пт) 23.00 — dj Noche.
**12** (сб) 22.00 — dj Top.

**«Белая вежа»** (336-70-75)
**11** (пт) 23.00 — dj Dee.
**12** (сб) 1.00 — dj Alex.
**13** (ндз) 23.00 — «Second Hand Party II» / «Gold Party»: музыка 1980—1990-х ад dj Alex, Verde, Matiz Lemark, Tea.

**«Westworldclub»** (239-17-98)
**12** (сб) 23.00 — dj-bar.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Місія «Сэрэніці»: **11** (пт) 16.30; **12, 13** (сб, ндз) 11.50 (іл), 16.30.
«Сардэчна запрашаем у Рай!» (прэм'ера): **11** (пт) 18.50, 21.10; **12, 13** (сб, ндз) 14.10, 18.50, 21.10.
«Саракагадовы нявінньнік»***: **11** (пт) 16.40, 19.00, 21.20; **12, 13** (сб, ндз) 14.40, 16.40, 19.00, 21.20.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«9-я рота»***: **11** (пт) 13.30, 16.00, 18.30 (іл), 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дом кіно»** (266-35-26)
«Кроў за кроў»*** (прэм'ера): **11** (пт) 16.00 (іл), 21.40; **12, 13** (сб, ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Браты Грым»***: **11—13** (пт—ндз) 19.00, 21.00.
«Птушкі-2: падарожжа на край сьвету»: **11—13** (пт—ндз) 16.30 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Місія «Сэрэніці»: **11—13** (пт—ндз) 16.40, 21.20.
«Сардэчна запрашаем у Рай!» (прэм'ера): **11** (пт) 14.20, 19.00; **12, 13** (сб, ндз) 14.20 (іл), 19.00.

**«Масква»** (203-14-48)
«Місія «Сэрэніці»: **11—13** (пт—ндз) 16.30, 21.10.
«Сардэчна запрашаем у Рай!» (прэм'ера): **11** (пт) 19.00; **12, 13** (сб, ндз) 14.20 (іл), 19.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«9-я рота»***: **11** (пт) 16.00 (іл), 18.30, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 16.00, 18.30, 21.00.
«Трымайся да канца»: **11** (пт) 17.30, 21.30; **12, 13** (сб, ндз) 15.00, 17.30, 21.30.
«Правілы сэксу-2: хэпі-энд»***: **11—13** (пт—ндз) 19.20.

**«Перамога»** (203-77-66)
Тыдзень нямецкага кіно
«Басанож па маставой» **11** (пт) 16.50, 19.00.
«Адзін дзень у Эўропе» **11** (пт) 21.10; **12** (сб) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Акадэмія сьмерці» **13** (ндз) 15.00 (іл).
«Знаёмства з Цукерамі» **13** (ндз) 17.10.
«Каралі хуткасьці» **13** (ндз) 19.00.
«Навучаньне хлусьні» **13** (ндз) 21.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Саракагадовы нявінньнік»***: **11—13** (пт—ндз) 16.30, 18.45, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«9-я рота»***: **11** (пт) 13.10, 15.40, 18.20, 21.00; **12, 13** (сб, ндз) 13.10 (іл), 15.40, 18.20, 21.00.
«Усё ці нічога»: **11—13** (пт—ндз) 11.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.




**18 лістапада ў Варшаве ў кавярні пры Драматычным тэатры (Палац культуры і навукі) адбудзецца канцэрт «Беларускі андэграўнд», арганізаваны варшаўскай суполкай Беларускага аб'яднаньня студэнтаў. На канцэрце выступіць «N.R.M.». Уваход бясплатны. Пачатак а 22-й.**

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**
**Тэатар юнага гледача**
**17** (чц) — «Палачанка».
**18** (пт) — «Паліяна».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**19** (сб)— «Воўк-мараплавец».

**Купалаўскі тэатар**
**13** (ндз) — «Афрыка».

**Тэатар лялек**
**11** (пт) — «Чароўная лямпа Аладына».
**12** (сб) — «Чырвоны каптурок».
**13** (ндз), **15** (аўт) — «Чараўнік Смарагдавага гораду».
**19** (сб) — «Кот у ботах».
**20** (ндз) — «Тры парсючкі».

**Кіно**
**«Аўрора»**
«Чуча»: **11** (пт) 14.30; **12, 13** (сб, ндз) 13.00.
«Браток медзьведзяня»: **12, 13** (сб, ндз) 11.00.

**«Бярэсьце»**
«Прышэлец з космасу»: **12, 13** (сб, ндз) 11.00.

**«Дом кіно»**
«Шалёныя скачкі»: **12, 13** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Мадагаскар»: **11** (пт) 12.00, 14.00; **12, 13** (сб, ндз) 13.00.
«Шкадлівая нядзеля»: **12**(сб) 11.00.
Мультзборнік: **13** (ндз) 11.00.

**«Масква»**
«Агент Кодзі Бэнкс»: **13** (ндз) 12.00.

**«Мір»**
«У пошуках Нэма»: **12, 13** (сб, ндз) 14.00.

**«Перамога»**
«Хадзячы замак» (прэм'ера): **11** (пт) 14.30; **12, 13** (сб, ндз) 10.40, 12.50.

**«Піянэр»**
«Горад чарадзеяў»: **11—13** (пт—ндз) 12.00.
«Шалёныя скачкі»: **11—13** (пт—ндз) 14.00.
«Рэактыўная парася» і іншыя мультфільмы: **12, 13** (сб, ндз) 10.30.

## КІНО НА DVD

**«Master Records»**
**«Ліга джэнтэльмэнаў Апакаліпсісу».**
Абсурдысцкая кінакамэдыя, Вялікабрытанія—ЗША, 2005, рэж.**Стыў Бэндэлак.**
У ролях: **Марк Гатыс, Стыў Пэмбэртан, Рыіс Шырсьміт.**
Каб выратаваць свой сьвет... яны прыбываюць у наш. Пэрсанажы камэдыйнага сэрыялу трапляюць у рэальнасьць і пачынаюць «разьбірацца» са сцэнарыстамі і акторамі...
**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

**«Знаёмства з Цукерамі»** («Alles auf Zucker!»).
**Нямеччына, 2004, каляровы, 90 хв.**
**Жанр:** камэдыя.
Адзнака: 7,5 (з 10).

# Добры нямецкі сьмех

Шахрай Джэкі Цукер (Гэнрых Хюбхэн) з азартам гуляе ў більярд — і мае кучу праблем: яго хоча кінуць жонка, сын нацкоўвае судовага прыстава, паміраe маці. Аднак спадчыну па ёй былы гэдээравец атрымае пры ўмове, што памірыцца з братам Самуэлем, артадаксальным габрэем. Самуэль са сваяцкім кланам заяўляецца ў кватэру Джэкі, дзе й пачынаюцца азартныя сямейныя гульні.



Стужка Дані Леві, што атрымала ў Нямеччыне безьліч узнагарод, прадстаўлена ў сэрыі «Новае нямецкае кіно». Давядзены да комы герой, захлынаючыся, будзе расказваць аб сваім бязладным жыцьці, «смуткаваць» на хаўтурах і разыгрываць інфаркты, каб трапіць на більярдны чэмпіянат..

Актор Гэнрых Хюбхэн праславіўся ў гастранамічна-гангстэрскай ролі «Кухара-злодзея»; ягоны Джэкі Цукер таксама мае сваю більярдную жарсьць. Кантрастам глядзіцца Уда Самэл (у ролі Самуэля).

Сьмех Д.Леві — гэта сьмех інтымны й чалавечны. Сьмех хаваецца за прызнаньнем у каханьні, за наіўным жэстам падману і за маскаю недарэчнасьці.

Гледачы, прызвычаеныя да праграмы «Аншлаг», могуць разгубіцца. Але астатнія выдатна адпачнуць.

**Андрэй Расінскі**

# Піць або дружыць

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Глускі сьпіч прэзыдэнта — самы арыгінальны ход у гісторыі передвыбарных кампаній. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Зьвяртаючыся да мясцовых жыхароў у Глуску, лідэр нацыі паставіў пытаньне рубам: «Хто п'е кожны дзень — за мяне не галасуйце. Я з такімі сябраваць ня буду».

З часоў Пэрыкла гісторыя выбарных дэмакратый ня ведала настолькі суіцыдальнага з пункту гледжаньня электаральных пэрспэктыў кроку.

Адпаведна ліпеньскім зьвесткам Інстытуту сацыялёгіі, 37% беларускіх мужыкоў штодня мочаць джала. Іншымі словамі, гаворка ідзе як мінімум пра 20—25% патэнцыйных выбаршчыкаў. І раптам палітык, у якога на носе выбары, добраахвотна адмаўляецца ад іх галасоў. Гэта тое самае, калі б Буш-малодшы заклікаў янкі: «Хто есьць гамбургеры, за мяне не галасуйце. Нагоніце тлушчу, а прэзыдэнту яго потым зганяй».

Дзіўная таксама цана глускага выбару: або пляшка, або сяброўства з прэзыдэнтам. Няўжо любімы кіраўнік сябруе з такой колькасьцю людзей, ды яшчэ выпівох? Дзіўны ў такім разе ў іх фармат сяброўскіх пасядзелак: усе квасяць, а адзін у хакей гуляе.

Моцна падставіўся прэзыдэнт і ў іншай галіне. Адпаведна з афіцыйнымі вынікамі рэфэрэндуму-2004, бацькаў курс падтрымалі няшмат выбарцаў. Паколькі 100 % альканаўтаў наўрад ці адмовяцца завязаць дзеля абстрактнага сяброўства з прэзыдэнтам, то колькасьць набраных апазыцыяй галасоў у 2005 г. лягічна павінна вырасьці. Калі ж вынікі, абвешчаныя Лідзіяй Ярмошынай, гэтага не пацьвердзяць, во будзе грунт для наездаў замежных наглядальнікаў на і так зацюканы беларускі Цэнтравыбаркам.

Адно з двух: або гэты палітык ведае загадзя, што пераможа, або вядзе цікавую электаральную камбінацыю. Паколькі выбары ў нас самыя сумленныя і празрыстыя ў сьвеце, застаецца другое. Сапраўды, калі прыгледзецца, то крок бацькі не такі ўжо ідыё… прабачце, нелягічны.

Магчыма, прэзыдэнт намагаецца справакаваць апазыцыю на няслушныя дзеяньні. Павёўшыся на гарантаву мульку, народная кааліцыя зробіць стаўку на вакантную прасьпіртаваную частку выбаршчыкаў і праінструктуе «зуброў» зафігачыць усе сьцены графіці: «Хочаш штодзень бухаць — трэба адзінага выбіраць!» От будзе падстава для зьедлівых камэнтароў у праграме «Ў цэнтры ўвагі».

Што да супярэчнасьцяў афіцыйных вынікаў, таксама ёсьць выйсьце. Сярэдняя доза выпітага згаданымі 37%, згодна з тымі ж зьвесткамі НАН, складае 1,5 стандартнай бутэлькі гарэлкі. Як бачым, бязь дзьвюх ходак ніяк не абысьціся. Так што сп-ня Ярмошына, камэнтуючы высокую лічбу падтрымкі АГЛ, можа лёгка парыраваць усе паклёпы «Вясны» і «Партнэрства»: адрасатамі бацькавага заклiку ў Глуску была меншая частка айчынных алкашоў. Абсалютная большасьць, як сьведчыць статыстыка, кіраюць не адзін, а два разы на дзень.



**7 лістапада. Камуністка ў тумане. Дзень кастрычніцкай рэвалюцыі застаецца дзяржаўным сьвятам толькі ў Беларусі й Малдове.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ЖАРТ

Заходняя Беларусь. Турыст у вёсцы пытае дзеда:

— А где здесь грибочки растут?

— А ты іх саджаў, гэныя грыбочкі?!

Паводле газэты «Моладзевы супраціў»

**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**

**13 лістапада** па маршруце: Менск—Лукавец—Альковічы—Камена—Даўгінава—Будслаў—Крывічы—Княгінін—Касьцяневічы—Менск.

**26—27 лістапада:** Вільня—Трокі—Меднікі.

**20 лістапада:** Рубяжэвічы—Дзераўная—Івянец—Падневічы—Пяршаі—Ракаў—Новае Поле—Налібокі

**14—20 сьнежня:** Прага—Чэскі Крумлаў—Карлавы Вары.

**Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал)**

**СПАЧУВАНЬНІ**

**Шчырыя спачуваньні** Вользе Алесінай з прычыны сьмерці маці. Трымайся, сяброўка. В.К.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Антону Б. зь Верхнядзьвінску.** На памылкі пакажам карэктарцы. Ліст перадамо фірме, што замаўляла рэкляму.

**Паўлу Л. з co.uk.** «Нашу Ніву» больш, чым навіны палітычныя. цікавіць усё, што зьвязана зь японска-беларускімі адносінамі, а таксама незвычайнасьці й аналітыка. Бо навіны мы й самі чытаем на навінных стужках інфармагенцтваў, а во гэтае астатняе — тое, што толькі Вы ведаеце — самае каштоўнае.

**Аляксандру з Воршы.** Такой інфармацыі ня маем.

**Ганьне Ж. зь Віцебску.** Вершы яшчэ слабенькія. Трэба дасканаліцца. А магчыма, паэзія — зусім ня Вашае.

**Судзілоўскаму.** Будзьма паблажлівыя да мовы людзей. У расейскамоўным атачэньні, пры адсутнасьці беларускамоўнага дыскурсу ў многіх галінах людзям цяжка захоўваць высокую культуру мовы. Пра яе «НН» дбае, гэта прынцыпова, хоць гэта вымушае трымаць дзьве дадатковыя штатныя адзінкі, якіх няма ў расейскамоўных выданьнях, коштам меншай колькасьці журналістаў. Але ж і газэта не энцыклапэдыя. Памылкі ёсьць ва ўсіх газэтах сьвету, бязь іх няможна. Газэты робіцца імкліва, «з колаў».

А з «НН» адбываецца якая штука: раз гэтая газэта адзіная ў беларускамоўнага гарадзкога чытача, то і прачытваецца ад першага да апошняга слова, і патрабаваньні выстаўляюцца максымалісцкія. Урэшце выходзіць, што сядзяць беларусы і адзін аднога грызуць за непрынцыповыя рэчы. І чытаньне «НН» ператвараецца ў пошук блохаў: «А, і яны!..» Словы Хрыста прыгадваюцца: «Хто без граху?» Напісаў расейскамоўны чалавек артыкул для беларускамоўнае газэты — усьцешцеся.

Ёсьць добры прынцып, які апраўдаў сябе ў іншых нацый на аналягічных этапах разьвіцьця: усё, што беларускімі літарамі напісана, — па-беларуску і варта ўхваленьня. Падказваць правільны варыянты падказвайце, але ня ежце сяброў поедам.

**Галіне Ф. зь Менску.** Вашы думкі пра С.Калякіна грунтуюцца не на фактах, а на забабонах. На выбарах-2006 савецкім людзям і іхнаму лідэру будзе процістаяць кандыдат ад беларускай нацыі. Яна складаецца зь беларусаў і палякаў, габрэяў і расейцаў, камуністаў і лібэралаў, беларускамоўных і расейскамоўных, багатых і бедных і г.д. Яна такая, якая ёсьць — стракатая, разьядналая, дэзынтэграваная. Савецкі кандыдат будзе пераможаны тады, калі беларуская нацыя да канца ўсьвядоміць сябе супольнасьцю з сваімі правамі і інтарэсамі і перастане сварыцца міжсобку. Вучыцеся адрозьніваць беларускіх камуністаў ад савецкіх камуністаў. Звыкнуцца з новай рэальнасьцю напроста. Але мус ім — калі ня хочам працягу таго, што маем.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Вільня.** 12 акцябра Віленская судзебная палата асудзіла на вечнае пасяленьне старога бацьку і двух сыноў-студэнтаў Умястоўскіх за належнасьць да Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Справа цягнулася 5 гадоў.

М. **Гарадок,** Віленск. губ., Вялейск. пав. У ваколічных вёсках пануе гарачка-тыфус, а помачы ніскуль не чутно. Прыяжджаў у нашу вёску доктар, дык яму людзі і дыхнуць не давалі. Ну, і дзе наша мясцовая мэдыцына?

**Л-а.**

З **Горацкага** павету, Магілёўскай губ. Сяляне тутэйшых вёсак **Церахоў, Сьнігіроў** і **Пірагоў** перайшлі на хутары. Гэтым летам за іх прыкладам расьсяліліся на хутары і сяляне вёскі **Бель** (21 сяліба). Цяпер яны ўзяліся за будоўлю на новых месцах: ставяць хаты і прысельля. Астаўшыеся 40 гаспадароў вёскі, убачыўшы, што ім прыходзіцца зноў драбіцца на палосы ды нават трэба наймаць на свой кошт землямера, маняцца вясной разьехацца, як іх сябры, на хутары.

**Саўка Каваль**

**1910, №42.**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3426.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 09.11.2005.

Замова № 6421.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а